Сцяпан Крываль

# Аднойчы летам



Першая
кніга
празаіка

СЦЯПАН
КРЫВАЛЬ

# АДНОЙЧЫ ЛЕТАМ

Апавяданні

Мінск
«Мастацкая
літаратура»
1990

ББК 84Бел7
К 85

Серыя заснавана ў 1976 годзе

Рэцэнзент
Павел Місько

Автор не зря дал первой своей книге такое название: в ней почти в каждом рассказе есть интригующее слово — «однажды». Хорошее знание писателем народного быта, умение занимательно рассказать об увиденном или услышанном — все это должным образом оценит читатель, неравнодушный и к проблемам высокой духовности героев, и к вопросам нашей повседневной жизни.

К $\frac{4702120201-109}{М 302(03)-90}$ 36—90

ISBN 5-340-00450-3

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1990

## «Пагарэльцы»

Мікіта Капыток перш цішком выгляне з-за веснічак, абвядзе сваім праніклівым позіркам вуліцу, пераканаецца: ці не сядзіць каля свайго плота Архіп Бізун? І толькі тады, убачыўшы, што таго няма, абапрэцца адной рукой аб слупок веснічак, а другой аб уласнае калена — вынырне з двара на вуліцу. Ён так прахадзіў усё жыццё: адна яго нага была сагнутая ў калене, аб якое ён абапіраўся ў час хадзьбы рукамі, а другая цягнулася ззаду, як тая жардзіна з Бізуновых заставак. Таму з кожным сваім крокам ён яе нібыта выцягваў з нейкай глыбокай ямы, падцягваючы пад сябе, хутка перастаўляў пасля сагнутую нагу.

Праўда, ходзіць ён цяпер рэдка куды, а некалі...

— Капыток, умееш запрагаць каня? Дык ты дзве торбы сёння захапі, паедзем па Смалявіцкіх хутарах! А там — бага-ата жывуць, ды і богу моляцца! Па-ададуць! Гі-гі-га! — Гэта ўжо з-за сваіх веснічак падкалупне Капытка Архіп Бізун, чырванатвары мужык, якому, здаецца, ніколі не будзе ніякага і зносу.

Капыток азіраецца па баках, плюе перад пачаткам лаянкі і тонкім фальцэтам, як злосная жанчына, заенчыць на ўсю вуліцу:

— Каб ты на сваіх каленках сам і на могілкі даехаў!

— Го! Як я цябе, нягеглага вурдалака, па свеце вазіў, тады: «Архіпка! Ты мне за роднага брата лепшы!» А цяпер? Трымаўся мяне, як вош кажуха!

— Ты і каня таго ўкраў! — амаль не спыняючыся каля Архіпа, агрызаўся Капыток.

— Украў? Ну і ўкраў! А хто мяне за руку злавіў, га? Ты? Не злоўлены — не злодзей, Мікіта! А ты сам свой хлеб касой ці плугам зарабляў, га?

— Дык я — калека! А на табе можна было па тры капы жыта з поля вазіць, як на пары коней...

— А я цябе аднаго вазіў і жыў, як пан Азерскі ці яснавяльможны ксёндз Кандыба!

— Цьфу! — не вытрымліваў гэтага напамінку пра колішнія свае грахі Мікіта.

— Не плюй у чужы гаршчок, бо, можа, гаспадар калі цябе на вячэру запросіць, дык есці ж самому з той пасудзіны давядзецца! Га-га-га!

— А ў твой гаршчок яшчэ і цяпер лыжку брыдка запускаць!

— А некалі ж патэльню і пальцамі выліжаш, не трэба было і мыць пасля тваёй яды...

— Цьфу! — зноў плюецца Мікіта і наважваецца кульгаць далей, але зло на Бізуна так абурае яго ўсяго, што ён затрымліваецца яшчэ на які момант, каб добра налаяцца са сваім колішнім «сабратам па горы».

— Не саромеешся людзей, дык бы хоць на старасці год пасаромеўся самога сябе! — павучае Бізуна Мікіта.

— Не саромеўся людзей, калі бегаў без портак па вуліцы, дык чаго зараз саромецца зусім зняць тыя порткі дзе за хлявом, га? Калі ў маладосці табе вочы пакрывіла, не старайся іх выпрамляць на старасці, бо і зусім даломіш! Га-га-га! А ты — жы-ывеш! Пры панах у мяне на персанальнай пенсіі састаяў, а зараз Саветы не дапускаюць, каб, нібы які блудны сабака, костку пад чужымі падваротнямі шукаў! Нябось і зараз у краму кіруеш? Дык я, во, іду вяндлінку рэзаць! Хлеб будзем сеяны ці веяны есці? Га-га-га!

— Хабарнік! — кідае на развітанне і спрытна выцягвае з «ямы» сваю здаровую нагу Мікіта.

— Воўк заўсёды авечую дабрату забывае! — наўздагон яму пасылае свой заўсёдны праклён і Бізун і,

таксама расхістваючыся ад няроўнасці ног сваім магутным целам, ідзе ў двор, прыгаворвае:

— Галасісты некалі быў Капыток! А плакаць як умеў, як сапраўдная баба на пажары, толькі што валасоў на сабе не рваў, бо рукі заўсёды на хворым калене трымаў...

...Мікіта з крывой нагой не знайшоўся на свет сам па сабе: гэтую бяду ён нажыў, калі ўжо мог лазіць па чужых гародах — дзе грушку-паданку сцібрыць, а дзе і моркаўку за пазуху ўкрадзе. Дык вось аднойчы, калі паўзком падвячоркам залез у высокі гарох багацея Піліпа Арцёмчыка, на яго накінуўся гаспадарскі сабака, пашкуматаў зласліўцу порткі, але Мікіта вырваўся з яго пашчы, а калі ўцякаў, дык не трапіў у тую дзірку ў штыкетніку, праз якую залез сюды, а палез цераз плот. Вось тады гэтую сваю бяду і нажыў: падаючы з плота, скруціў сваю правую нагу так, што ўжо ніякія шаптухі ды кастапravы не змаглі падагнаць яе пад левую.

Так і застаўся Мікіта Капыток векаваць свой век на зямлі калекам. А тады, перад трыццаць дзевятым, гэтая акалічнасць была не надта ўдалай перспектывай на будучае: хто за цябе возьмецца за ручкі плуга! Хто размахнецца рукой на ўзараным загоне з зернем ці падкіне за канём барану? Ніхто! А есці будзе хацецца і сёння, і заўтра, і ўсё жыццё...

Сам сябе тады саромеўся Мікіта. Пра Піліпаў гарох ён не вельмі любіў успамінаць, бо на вёсцы зладзеі ніколі вялікай павагі не мелі: калі, скажам, табе пахрабусціць нагу ў лесе падаючай алешынай ці бярозай, тады яшчэ паўбяды — кожны і паўшчувае, і кавалкам хлеба падзеліцца... А калі ты лез у чужы свіран! О-о! Хацеў без поту хлеба з маслам пад'есці? Не, браток! Для гуляючых рук і цвілы сухар з вадой — вялікае свята!

А тут па свеце пайшла такая калатня, што і не ве-

даеш, якая ўлада заўтра будзе на вёсцы: польская, нямецкая ці савецкая?

А Бізуноў Архіп, той рабіў усё цішком: плячысты ды каржакаваты, як той стогадовы дуб, але ж па суседскіх гародах лазіць не навучыўся: ён да-алё-ёка навокал бачыў свет!

Хоць і жылі Мікіта з Архіпам, як гаворыцца, акно ў акно, але апошнім часам пасля вайны вялікіх сустрэч паміж імі не было: Архіп часам яшчэ на досвітку запрагаў свайго кульгавага каня, якога наступаючыя чырвонаармейцы пакінулі ім замест маладога гнядога жарабца, і адпраўляўся немаведама куды. Бывала, што ён знікаў і на цэлы тыдзень, але ніхто ніколі не бачыў, у якую пару дня ці ночы ён вяртаўся дамоў. Адсыпаўся колькі часу, а пасля ўжо выходзіў на вуліцу, садзіўся на лаўцы ля плота і больш маўчаў.

— Куды гэта цябе насіла? — пытае іншы раз у яго Мікіта.

— Ат! — абыякава махне рукой Архіп.— Ды ўсё думаецца, што недзе свайго гнядога жарабца адшукваю! Можа, і нашага ваякі каму пакінулі, як і, во, гэтага, бязногага, нам?

— Ну-у! — не згаджаецца Мікіта.— Кідаюць коней толькі параненых, а калі каторага заб'е — у кацёл у іх усё ідзе!

— Хіба — на мыла? — глядзіць звысоку на Мікіту Архіп.— Хто ж тое падла будзе есці?

— Падцісне жывот — аблезлага крата з'ясі...

— За аблезлым кратом не паваюеш! Ды і вайна даўно скончылася...

— Японца дабіваюць,— удакладняе Мікіта і сядае побач з Архіпам. Архіп азіраецца, знарок доўга аб нечым маўчыць, а пасля ціха пытаецца: — Як думаеш жыць?

Мікіта не чакаў такога пытання, таму зашлёгаў носам, утаропіўшыся вачыма проста ў Архіпаў рот.

— Ну, як? — паўтарае Архіп і лезе ў кішэню сваіх картовых штаноў, каб дастаць адтуль закурыць.

Апошнім часам ён хоча сам у сваіх вачах здавацца вельмі дарослым, а як гэта зрабіць, калі не будзеш папыхкваць сінім дымам з табачных карашкоў? Усе паважаныя мужыкі ў вёсцы да вайны курылі, хоць за гэта не раз і штаны ім апускалі на пастарунку: гэта тады, калі часам солтыс пан Адамовіч ці пан паліцэйскі Юзэф Скурскі знаходзілі ў каго дзе пасярод высокага бульбоўніку адну-дзве палечыны табаку! О! У паноў строга наконт гэтага было! Ідзі купляй у Янкеля курыва, а каб гадаваць сваё? Але тайком гадавалі. Бо на крамным курыве пракурыш усю гаспадарку. Не давядзі пан бог, як дорага каштавала тая гродзенская махорка! А зараз, во, Архіп і з рота не выпускае гэтую трасцу!

— Закурыш? — пытаецца ён у Мікіты.

— Кхі-кхі! — яшчэ і не панюхаўшы дыму, кашляе ў свой дробненькі кулачок Мікіта.— Хі-хі! Нешта ты сёння добранькі, ці не жарабца адшукаў? — падкалупвае Архіпа Мікіта.— Калі часам і на каленках просіш цябе, толькі дулю пакажаш, а зараз...

— А зараз — справа ў мяне да цябе ёсць...

— Якая гэта можа быць справа ў бусла да жабы, хі-хі?

Мікіта падміргнуў і дадаў:

— Дык я табе не бусел, а ты мне не жаба...

— Ты ўжо адсеяўся?

— А чым я мог адсеяцца, пяском? У цябе ж прасіў які гарнец аўса, каб хоць у Запрудах загон пасеяць, дык што ты мне сказаў?

— А што я сказаў?

— Восенню дам табе таго насення, калі ў самога нарасце...

— Правільна сказаў...

— Пра-авільна! — перадражнівае Архіпа Мікіта.—

Сам вунь як свайго каня адкарміў, як ляльку, а мне гарнец насення пашкадаваў...

— Той авёс, што я каню даю,— адны амецці...

— От так я табе і паверыў!

— Ну дык пайшлі ў клуню, там носам натаўку... Сам убачыш — лятае па таку, як абарваны пух з пеўня! Дык ёсць, Мікіта, да цябе ў мяне справа!

Пры гэтых словах Архіп падаў свой капшук Мікіту, які моўчкі згодліва згарнуў цыгарку і пацягнуўся прыкурыць ад Архіпавай самакруткі. Але той чыркануў запалкай, адламаўшы яе ад «грабленкі».

— На, ад свежага агню прыкуры!

— Ого! — замілавана паглядзеў на «грабленку» Мікіта.— У людзей няма чым у печы растапіць, а ён вунь як раскашуе!

— Зайздросна?

— А чаму ж не? Калі ты сам грызеш сухар, а нехта белы хлеб з маслам у рот топча, дык...

— Во-о! І ў цябе, відаць, галава не толькі на вошы! — нацягнуў Капытку на вочы казырок ягонай шапкі Архіп.— Ты вось швэндаешся цэлымі днямі без справы, а есці куды ідзеш? Дахаты! А хто табе там нарыхтаваў той ежы? Сухая, як аблупленая лазіна, маці?

Мікіта быў змайстраваны недзе ў якой адрыне ці ў падваротні, дык у яго была толькі маці, а ў Бізуна быў законны бацька, але ў вайну паспрабаваў пад'есці з нямецкіх рук хлеба, дык партызаны яго пасля накармілі і зямлёй...

— Вельмі ўжо там у цябе крупнік малаком забелены ці грачаная каша на свіным сале добра ў печы ўпрэла? Больш, думаю, кулак смокчаш разам з маці? Дык вось: дзве торбы маеш? Не? Ды адкуль яны ў цябе могуць быць? Ну добра, я тады пазычу свае...

— Хі-і! А навошта мне твае тыя дзве торбы? Хіба

ў адну залезу сам, а ў другую — заганю качаргой маці?

— Эх і ражка ж у цябе на плячах! Хіба каму калі я што дрэннае раіў? Прыходзь у поўнач, паедзем...

— Куды?

— Па дарозе даведаешся... Шукаць шчасця ў свет паедзем, хі-хі!

— Нешта ты вельмі, Архіп, на мігах размаўляеш...

— Паедзем майго жарабца шукаць... Калі знойдзем, пацвердзіш тамашнім уладам, а тады мой кульгавы конь дастанецца табе... Будзеце разам кульгаць, не будзе сумна, хе-хе! Сам не зможаш хадзіць за плугам, маці налаўчыцца, а то і хто іншы пасобіць, быў бы конь у тваіх руках, а фурман знойдзецца...

— А не падманеш?

— От рассупоненая галава! Яму кажы: авечка, а ён табе: індык! Паедзем ажно за Прыпяць, а там людзі і зараз курэй пшаніцай кормяць, а самі толькі адно масла ядуць ды смятанкай запіваюць. Сам бачыў...

— Ну, дык калі так...

— І галоўнае, Мікіта Капыток, каб ты мяне слухаўся ў дарозе... Не будзеш слухацца, другую нагу ў колавыя спіцы ўсаджу, колаў не пашкадую, далібог, праўду кажу!

— А не хочаш ты і маю галаву ўсадзіць пад тое кола?

— Дык адмаўляешся? Значыць, пашукаю ў кампанію каго іншага... А палічы, галубок, хто зараз на нашу вёску з канём ці валом, га? Любы на такі гішэфт, як казаў некалі Янкель, згодзіцца пайсці!

— Чаму ж не?

— Ежы на дарогу можаш не браць, усё роўна ў цябе яе няма... Да сваёй торбы цябе пакуль што даладую...

У той вечар Мікіта сказаў сваёй маці, што паедзе з Архіпам Бізуном шукаць іх жарабца.

— Можа, даўно таго жарабца ваўкі і косці пааб-

грызалі! — злосна кінула Акуліна, але не забараніла сыну ехаць разам з Архіпам.

Выехалі досвіткам, а калі пачало ўзыходзіць сонца, спыніліся каля густога ельніку, і Архіп дастаў з палукашка тры торбы: адну з ядой і дзве пустыя.

— Трэба распаліць агонь,— загадаў ён Мікіту.

— Каб пажар не пайшоў! — Паглядзеў Капыток на ніжняе галлё ельніку.— Сухое ж надвор'е...

— Каб ішоў дождж, дык, думаеш, я б цябе паваЛок у такую далеч?

Капыток паслухмяна пайшоў збіраць сухое ламачча, наламаў яловых лапак і сабраўся распальваць касцёр.

— Кладзі сушняк пад аглоблі! — прывязваючы кульгавага каня да задняй ручкі воза, сказаў Архіп і сам пачаў падкладваць пароўну яловыя лапкі пад абедзве аглоблі.

— Цяпер засталося толькі падпаліць,— задаволена паціраючы рукі адна аб адну, падміргнуў Капытку Бізун.

— Гэта ж навошта? — не разумее Капыток.

— Каб назад з поўным возам дабра вярнуцца. Хі-хі! З гэтай хвіліны мы з табою, браце, пагарэльцы! Зразумеў?

— А што ж у нас такое згарэла, што я і не ведаю? — зноў не разумее Мікіта.

— Што згарэла? А што можа згарэць у гарачыню ў вяскоўца? Хата, хлеў, клуня... Во, і ў возе аглоблі паабгаралі, конь адну нагу, хі-хі! — у пажары папсаваў... Ану падыдзі, Мікіта, сюды!

Капыток паслухмяна кульгануў да Бізуна.

— Прымераем да тваёй шыі торбы...

— Э-э, не!

— Што? — ажно падскочыў на месцы Бізун.— Сала маё еў? Еў! Ехаць згаджаўся? Згаджаўся! Цяпер паспрабуй толькі задам з аглабель выплішчвацца!

Уссеў, дармаед, старой маці на шыю ды яшчэ і нагамі пад бакі прышпорвае, каб хутчэй везла! На свой хлеб цябе выведу!

— А ты ж чаму не хочаш есці такога хлеба?

— Я? А хто ж, паглядзеўшы на маю шыю, падасць мне міласціну, га? Ды скажа, на тваю шыю і хамута цяжка падабраць, а ён руку за міласцінай цягне... А табе гэта падыдзе! Я цябе буду вазіць, ты будзеш прасіць, як пагарэлец, а пасля ўжо патрапім падзяліцца назбіраным. Табе — усе сухары, а мне — сала, бо каб цябе ад таго сала не пранесла, хі-хі! Бо каб мой конь, скажам, а твой авёс, дык бы куды яно яшчэ не ішло, а так — усё маё: і конь, і воз, і авёс! Твае толькі слёзы па багатых хатах і каб змог падаранае да воза дацягнуць, а я ўжо тут і дапільную, і далічуся... Ну, дык што ты будзеш гаварыць у першай жа хаце?

— Не ведаю...

— Не ве-едаю! — перакрывіў яго Бізун.— Тады паўтарай за мною: — Людзі Хрыстовыя! Гляньце сваімі добрымі вачыма на мяне, хто ледзь пералез цераз ваш парог, і вунь на майго брата, які і з воза злезці не можа,— усё гэта нарабіў нам пажар! Згарэлі да апошняй ніткі, нават каню нагу абпаліла, ледзь паспелі з-пад павеці выхапіць воз, хоць, як вы бачыце, і ў возе аглоблі паабгаралі...

— Людзі Хрыстовы! — слова ў слова паўтараў услед за Архіпам Капыток.

— Во-во! За вайну кожны навучыўся цяпер у чорную бяду верыць... Паверыць і ў нашу! Больш будзем намякаць на сала і на грошы... А за грошы — кожны дурань будзе харошы!

Калі зноў запрэглі кульгавага каня, Архіп усеўся на ўсколенках у перадку воза, а Мікіта — ззаду, начапіўшы на шыю крыж-накрыж дзве торбы.

— Тпрру! — прытрымаў каня Архіп і, саскочыў-

шы з воза на зямлю, падышоў з невялічкім мяшэчкам да стажка мурашніку.

— А гэта яшчэ навошта? — пацікавіўся Капыток.

— Калі не будзеш плакаць па хатах, у порткі мурашак буду падсыпаць! Ха-ха-ха!

— Ты жартуеш?

— Жарты я свае, браток, усе дома пакінуў! — сур'ёзна зазначыў Бізун і дужа ўскочыў у палукашак воза, зноў падкурчыўшы пад сябе ногі, нібыта зусім бяздзейныя.

— Но-о! Пхайся пакрысе, недабітак! — шлёгнуў паверх конскай спіны пугаю Архіп. Конь рэзка рвануў з месца, так, што ажно Мікіта кляцнуў зубамі.

У поўдзень яны пад'ехалі да адной лясной вёсачкі, пра якую ні Мікіта, ні сам Архіп ніколі і не чулі — Сасноўка! Спыніліся каля варот першай жа хаты, і Бізун штурхануў у плячо напалоханага Капытка:

— Ну то з богам, Мікітка! Якая будзе запеўка, такая будзе і прыпеўка!

Доўга не было Мікіты, які зайшоў у хату. А пасля адчыніліся дзверы сяней: на парозе першай паказалася старэнькая бабулька, пасля выцягнуў з ямы сваю доўгую нагу Мікіта і ўслед за ім выйшаў здаравенны барадаты мужчына.

— Мда! — сказаў ён.— Паглядзеўшы збоку на чалавека, ніколі і не скажаш, што ў яго такая бяда! — Гэта ўжо адносілася да Архіпа.

— Мяне б, можа, каб былі добрыя дактары, і вылечылі б, а яго... Зусім на ногі асеў!

— Хвядора! — крыкнуў недзе ў сені барадач.

— Я тут, тут я! — пачуўся з глыбіні сяней жаночы голас.

— Схадзі ў адрыну ды яшчэ з пяток яек прынясі людзям...

«З яйкамі вельмі па гэтых выбоінах не пагарцуеш! — злосна падумаў Архіп.— Прасіў бы грошай,

шэльма! На лес, на шкло для вокан, на цынкавую бляху на дах...»

— Калі будзеце варочацца, дзяткі, дык можаце ў нас і паначаваць: і для саміх месца знойдзецца, і для коніка,— гэта ўжо войкала ля самых веснічак тая бабулька, якая першай выйшла з сянных дзвярэй.

Але, калі ў трэцяй хаце Мікіту далі толькі лусту хлеба ды тры яйкі, Архіп не ўцярпеў:

— Слаба плачаш, шэльма! Апускай порткі! Дзе гэта мой мех з мурашкамі?

— Дык я і так патраплю...

— Слязьмі, слязьмі прасі! А то гатоў яшчэ і песні заспяваць... І хочаш, каб хто якую капейку падаў? А ты б сам такому падаў?

— А што б я яму падаў, калі і ў самога кішкі марш іграюць?

— Ну, браце, на трайцяк усё перадзеліцца: трэцюю частку ад сабранага атрымаеш! А калі што ўтоіш, душу выверну, як старую авечую шкуру... Ды яшчэ і з воза дзе пасярод дарогі выкіну!

— А ты мяне не лякай! — асмеліўся Капыток.— Глядзі, каб цябе самога...

— Дык ты мяне, значыцца, наважыўсяналякаць, так? На маім возе едзеш, а чорту рагатаму песні спяваеш? Ну глядзі, Капыток, каб мурашак — хе-хе! — у порткі не насыпаў! Слязу з вачэй выдаві, рот болем перакасі, каб усё было так, быццам ты і на самай справе пагарэлец... Бо пагарэлец не будзе ў дарозе песні спяваць ці якую маладзіцу за тлусты зад дзе ў куточку цёмным шчыпаць...

— Ну, дык што ж мне рабіць, калі не плакаць мне хочацца, а смяяцца, што мы такія махляры?

— От ты толькі паслухай яго... А ты ведаеш, галубок, што за гэта можа быць, калі трапім дзе на вочы якому міліцыянеру? Не? Дармаедствам займаешся! А за гэта... не крапівой караюцца!

— А за гэта, мусіць, у Сібір?

— Яшчэ і за Сібір! — азірнуўшыся, панізіў свой голас Бізун.— Так што трэба прабегчыся па вёсцы галопам ды і далей, каб ніхто і не апамятаўся...

— А мы ж жарабца твайго шукаем? — Як за выратавальную саломінку, ухапіўся за гэты апошні довад Мікіта. Яму ўжо і самому пачало падабацца, як можна хутка хоць крышку разбагацець, набіць жывот дармовымі харчамі сёння ды і назаўтра сёе-тое пакінуць...

— А ты, я бачу, Капыток, на нагу кульгаеш, а на галаву — не! Яна ў цябе хоць у чужой вёсцы крыху варыць...

— А ты думаў, што толькі ты сам...

— Сам не сам, але і тваёй паўгалавы не пашкодзіць. Ну то забяжы, во, у гэтую хату: бачыш — яна на дзве палавіны і два коміны, і з абодвух бакоў дзверы. У такіх хатах дзве рукі працягвай, шэльма! — Лёгка стукнуў у знак прымірэння па Мікітавай спіне сваёй магутнай далонню Бізун.— А калі што — пра жарабца пытайся! Зразумеў?

— Умгу! — кульгануў да веснічак Мікіта.

«Недзе напорашся ты на свой ражон, чалавеча!» — Уголас разважаў сам з сабой Бізун, з усмешкай пазіраючы ўслед Мікіту, і мацней, на ўсякі выпадак, нацягваючы ў руках лейцы: мала што можа здарыцца. Дык конь хоць і кульгавы, але калі пугай пекануць па падчарэўю, дык і колы могуць у бакі паразлятацца.

Доўга не выходзіў з хаты Мікіта. Так што ажно Архіп крыху захваляваўся: ці не здарылася якая трасца з яго хаўруснікам? А пасля хутка з дзвярэй першым вынырнуў Мікіта, за ім сярэдняга росту чалавек у зялёна-чорнай марынарцы на чыстай паркалёвай кашулі.

— Во, палюбуйцеся, людзі добрыя, у якога чалавека пажар ногі адабраў! — абапершыся адной рукой аб

уласнае калена, другою паказваў Мікіта гаспадару на чырвоны твар Архіпа.

— Але! — згадзіўся гаспадар.— І каб гэта адны толькі ногі адабраў той чортаў пажар, а то ж і чалавечае сумленне разам спапяліў! Чый жа ты будзеш, гэткі герой? Па мордзе бачу — Мікіты Бізуна расточак? За бацькам пайшоў? Той дык адразу да сцяны пад кулю людзей ставіў, а ты на другі манер перайшоў, так?

— Які Бізун, які Мікіта, дзядзечка даражэнькі? — ахрыплым голасам запытаў Архіп.

— Які Бізун? А той, якому некалі паны за непаслушэнства, хі-хі! — на стайні...

— Но-о! — рвануў за лейцы Архіп каня.

— Тпрру! — ухапіўся невядомы чалавек за аброць каня ля самых вудзілаў.

— Зараз мы табе сёе-тое падарым! Кандрат! Кандрат! — паклікаў ён некага праз вуліцу на дапамогу.

— Ну, я Кандрат! — выйшаў з веснічак другі такі ж дужы чалавек, але не ў марынарцы, а ў старой салдацкай ватоўцы, хоць на дварэ і было горача.

— Бяры майго жарабца ды скокні ў Ругляны ў сельсавет, участковаму накажаш!

— А то мне няма нічога другога рабіць? Зараз, во, паеду загон парыць, цялятку трэба будзе травы ўкасіць, а я буду па сельсаветах раз'язджацца...

— Ну тады на, трымай каня за аброць, каб не збеглі, пакуль вярнуся! — падштурхнуў да каня Кандрата чалавек у марынарцы. Кандрат не паспеў і слова сказаць, як чалавек у марынарцы перадаў яму ў рукі аброць, а сам пабег на паплавец, дзе пасвіўся стрыножаны конь, хутка яго распутаў, ускочыў на спіну і нагамі прышпорыў жывёліну.

— Трымай іх, Кандрат, я хутка вярнуся! — на ляту крыкнуў коннік і знік за паваротам нешырокай вясковай вуліцы.

Кандрат разявіў рот, забыўшыся, якую справу да-

верыў яму сусед. У гэты момант Архіп рэзка пацягнуў за адну лейчыну каня, свістануў пугай таму па падчарэўю, трымаючы на драбчыне не паспеўшага яшчэ добра ўсесціся Мікіту. Пасля ён, нібы ад чаго апамятаўшыся, адпусціў руку, і Капыток паляцеў з воза на зямлю, тройчы перакуліўшыся ўслед за фурманкай.

— Архіп! Архіп! — выплёўваючы з рота пясок, крычаў Капыток.— На тваім жа жарабцы паехалі ў сельсавет!

Але Бізун не чуў Мікітавага крыку. Не хацеў чуць! Ды ці мала бывае на свеце жарабцоў з аднолькавай лысінай? Каб гэта быў іх конь, ён пазнаў бы свайго колішняга гаспадара. Коні заўсёды надоўга запамінаюць сваіх гаспадароў: і добрых, ласкавых, і дрэнных, здзеклівых...

Скінуў тады з воза Архіп Мікіту і зрабіў гэта на сваю галаву: той пасля даказаў участковаму, адкуль сам і адкуль ён, Архіп...

З таго самага часу яны і не гавораць. Нават і не ўспамінае Архіп і пра свайго жарабца, які і на самай справе нейкім чынам дастаўся таму злоснаму дзядзьку ў марынарцы...

Баяўся тады Архіп, каб яшчэ і ў турму не пасадзілі за тыя яго выхадкі, але ўсё абышлося смехам, так што ён і з вёскі быў знік амаль на цэлых сорак гадоў і вярнуўся толькі зараз назад, зарабіўшы недзе разам з пенсіяй і кульгавасць, хоць і не такую страшную, як у Капытка.

Спярша Капыток пабойваўся Бізуна, але аднаго разу, калі па нейкай нагодзе крышку падпіў, пасмялеў:

— Запрагай, сусед, каня, паедзем у свет твайго жарабца шукаць!

— Ідзі пашукай гнід у сабакі пад хвастом! — узлаваўся тады Бізун. І больш ужо ніколі не ўступаў у размову з Мікітам, абыходзіў яго далёка бокам...

## Латарэйны білет

Аднойчы напрадвесні Ціхан Зосіч каля сваіх веснічак знайшоў чужы кашалёк з траяком. Траяк ён пусціў на пахмелку, а кашалёк падарыў меншаму сыну Халімону. А той хутка з яго зрабіў пшык: выкалупаў ножыкам замочак, а скура пайшла на латкі, якімі сам жа залатаў старыя бацькавы боты, каб латвей было ў іх выбягаць зімой на такую заманлівую коўзанку.

— Няхай бы спраўным быў кашалёк, вурдалак! Калі б падрос, дык грошы б у ім насіў...

— Многа ўжо ты нанасіў тых грошай! — заступілася за хлопчыка маці Хвядося.

— Не ўсе ж з адным ветрам у кішэнях жывуць! Нехта ж і грашыма шалясціць!

— То гэта нехта, ды не ты! — бразнула клямкай дзвярэй Хвядося, а Халімон адразу пусціўся ў плач, ведаючы, што ніякай яго правіннасці бацька ніколі не даруе — бярэцца за заскарузлы свой пасак, якім падпяразваецца.

— Я больш не буду! — выцірае рукавом слёзы хлапчаня.

— Малі бога, што чужы кашалёк сапсаваў, а не свой, бо каб яго ўласным мазалём нажыў...

— Я больш не буду! — аднымі ўсё словамі апраўдваўся Халімон.

— Ён не будзе! Думаеш, гэтак часта чужыя кашалькі валяюцца пад нагамі? Я за ўсё жыццё толькі другі раз і знаходжу. Першы раз жбан знайшоў з віном, які выпаў з панскай брычкі, калі паны ехалі на паляванне, і, во, зараз гэты кашалёк з траяком... Эх, і

было ж вінцо ў жбане! Восенню выпіў, а вясной ажно закусіць пацягнула!

— Табе абы піць! I траяк сам прапіў!

— Няўжо з табою буду дзяліцца? Мне ж ты, як я пастарэю ды ўжо зусім у пасцель злягу, і вады кружку не падасі...

— А завошта я буду табе яе падаваць?

— Во-во! Уся маці! — прыкурвае ад жарыны на далоні Ціхан.— Гэта тая дасць табе ражна праглынуць, а будзе чакаць падзякі, як за поўную чарку! Не да майго ты воза кола, ягамосць! Спіцы ў цябе маці паўстаўляла ды круціць на свой манер...

— А яна мяне б'е за тое, калі пачынаю круціцца...

— Бо ў іншы бок круцішся, не па яе заводу...

— I чаго ты прыліп да хлопца, як тая смала да конскага хваста? — вярнулася са двара з вядром вады Хвядося.— Абы я за парог, дык ён так і ўссядзецца на дзіця, хоць ты яму з хаты кожны раз уцякай...

Пры гэтых словах Ціхан змоўчваў, бо ведаў адно: бабу альбо бі, каб яечня была смачнейшая, альбо маўчы, каб гарэлка мацней пякла... Тады ён нацягваў на самыя вочы шапку і сыходзіў з жончыных вачэй. I з той пары, як трапіўся яму пад нагамі кашалёк з траяком, ён увесь час пачаў хадзіць унурана, быццам бы пад кожнымі веснічкамі ці плотам нейкія разявы гублялі свае кашалькі.

Было гэта даўно, калі Ціхан яшчэ мог вобыдзень збегаць да Пінска, стаптаўшы за дарогу ажно дзве пары лапцей. Цяпер ён жыве ў невялічкім пакойчыку з дошак, што збіў сваімі рукамі на ўласным котлішчы, так нечакана пакінуты сваёй жонкай Хвядосяй, якая яшчэ ў маладых гадах пасняшалася на неба, і сынамі — Мікалаем ды Халімонам, якія з'ехалі ад яго па той прычыне, што ён перайшоў жыць да старой удавы Паўліны Кунцэвіч. А тую можна было адной мерай мераць: што ўвышыню, што ўтаўшчыню! I не ён, Ці-

хан, пасватаўся да яе, а яна: была ў яе вялікая гаспадарка, а працаваць тоўстым людзям заўжды цяжка, вось Паўла і перайшла аднойчы да яго і спытала:

— Сарочкі сам мыеш?

— А то да цябе нашу? — не зразумеўшы захадаў хітрай Паўлы, адказаў Ціхан.

— А што ў цябе там мыць? Адзін рукаў на свята вымыеш, а другі — на будзень! Абабралі дзеткі, відаць, як ваўкі конскую костку? І прытулачак жа ў цябе! — акінула яна вокам Ціханава жытло: сцены аблуплены, стол без настольніка, у кутку стаіць ражка з пашчэрбленай клёпкай, а ўсяго ў хаце жывога — пад прыпечкам сапе ад вечнай спячкі кот Бургамістр.

— Было тут вельмі што і абдзіраць? — цікуючы за Паўлай, топнуў нагой на Бургамістра Ціхан.— Псік! Чаго трэшся аб лыткі? Хутка і штаны апошнія пратрэш!

— Во, хутка і без штаноў пойдзеш па свеце грэшным целам свяціць! — яшчэ больш балюча ўпікнула Ціхана Паўла.— Ты з бядоты, во, у кручок гнешся, а я — што дабро маё хутка па свеце разбяжыцца... Напладзіла з Міронам процьмы на сваю галаву, а зараз... Той у боб, а той — у гарох! А да цябе кожны лезе з адкрытым ротам, як тое плішчанятка: пасаладзі язычка цукерачкам! А дзе ж ты тых цукерачкаў набярэшся на ўсіх, га? Хіба ўжо сама пра свае шлункі забудзь? Ого-го! Гэта пакуль яшчэ варушуся, дык...

— Закапаюць, калі перастанеш варушыцца, ды яшчэ на магіле за тыя цукерачкі, як ты кажаш, перагрызуцца... Як мае! Здаецца, наважыўся каторы пацалавацца, а падставіш губы, дык зубамі ўшпіліць!

— І не кажы, чалавеча!

— Дык ты ж, Паўла, нездарма да мяне нахлынула? — асмялеў Ціхан, калі схадзіў у бакоўку ды прыклаўся да буталя з вішнёвай наліўкай.— Чалавека да

чалавека заносіць толькі гора, а шчасце — гоніць адзін ад аднаго!

— Не кожнага! — не згаджаецца з Ціханам Паўла.— Хто з горам векаваць пачаў, той і ў шчасці не зробіцца, як кажуць, лысым...

— Э-э, рэдка каторы вол не забывае, што некалі цяляткам быў: на рогі ўсю апору бярэ! — сказаў Ціхан, і яму зноў захацелася для лепшай гаворкі падвесяліць нутро вішнёвай наліўкай.

— Куды гэта цябе ўсё носіць? Незамужняя жанчына да яго зайшла, а ён, во, што вычвервае, пакіне яе адну на паўдня, а сам недзе па бакоўках нышпарыць? — з робленай злосцю ўпікнула Паўла расчырванелага ўжо Ціхана, калі ён у другі раз вярнуўся з бакоўкі.

— Дык я ж на двор не бегаю? — заўсміхаўся Ціхан.— Ды і ты добранькая: у чужы гарох са сваім рэшатам не лезуць ды яшчэ без папытання...

— А я хачу, каб ты быў маім гарохам...

— Як гэта — маім? — збянтэжана залыпаў вачыма Ціхан.— Я пакуль заўсёды быў сам сабе сваім!

— Ну ты не злуйся, калі не за тую лейчыну турзанула... Свахай ніколі не была і ў іншых, а тут самой давялося сябе сватаць!

— Нічога не разумею,— яшчэ больш зніякавеў Ціхан.— Дык ты быццам бы нешта сур'ёзнае пачынаеш гаварыць?

— Шуткаваць мне няма калі, Ціхуня! Прыйшла цябе забраць з гэтага пекла...

— Нікога пакуль маё пекла не спекла! — пачырванеўшы яшчэ больш, сарамліва апусціўшы вочы, сказаў у рыфму Ціхан.

— Трэба заўсёды пільнавацца, каб самога не апякло! А калі каго іншага і падсмаліць, не твая скура будзе сквірчэць!

— Во-во! Хочаш, бачу, мяне з майго раю ў сваё пекла перасяліць?

— Ну ты ж і дзівак, Ціхан! Тваe рукі, а мая гаспадарка — вось і ўвесь той рай будзе, па якім людзі так плачуць! Табе тут ніякага жыцця няма! — зноў акінула вачамі Ціханаву дамоўку Паўла.— Певень і той з падпечка не разбудзіць ніколі! Глуха, як у той дамавіне!

— А ты ўжо была там, што ведаеш, як у той дамавіне глуха? — не знаходзячы што гаварыць, сказаў Ціхан першыя словы, якія трапілі яму на язык.

— Не была, дык здагадваюся! Ты мяне на слове не лаві, а падумай добранька, што я табе гавару... І казе, і касе — траўка патрэбна!

— Дык ты нібыта хочаш, каб мы пажаніліся? — ужо добра асалавеўшы ад наліўкі, а па гэтай прычыне набраўшыся халасцяцкай рызыкі, абняў за тоўстыя плечы Паўлу Ціхан.

— От жа пусты чарапок на карку носіш! — не могучы павярнуць на тоўстай шыі сваю галаву, засмяялася Паўла.— Я яму паўдня талкую пра моркву, а ён грызе рэдзьку... Не думай, я тут ужо ўсіх удаўцоў перабрала! Бо як прыйдзе ноч ды ляжаш у ложак разам з курамі, і пачнецца, як у тым кіно: то маладой сябе ўявіш, а то закаханай, а ў хаце — нікога, як, во, і ў цябе — адзін вецер у коміне ўсю ноч ваўком раз'ятраным вые, калі ваўчыцу які паляўнічы заб'е...

— І са мной тое робіцца...

— А то я не ведаю? Калі нага ад нагі ў чалавека далёка ноччу ляжаць, дык і ім сумна, не кажучы ўжо пра адзінокую душу...

— Да-а! Душа душу заўсёды гукае! — згаджаецца і Ціхан.— І калі няма водгуку, ця-яжка жыць на свеце чалавеку! Дык, можа, мы гэта сватаўство зараз і адзначым?

— Э-э, не! — зразумела з паўслова Ціхана Паўла.—

Усё сяло тады пачне трапацца: сама пабегла сабе мужычую шапку шукаць! А я гэтага не хачу... Я пайду дамоў, а ты прыйдзеш пазней... Нібыта ты да мяне сватаешся, а не я да цябе...

— Можна і так! — адразу згадзіўся Ціхан.— Але ж шмаргані для сугрэву маёй вішнёўкі, лягчэй ногі дамоў будуць бегчы...

— Ды ты не лякайся, што я прыперлася на тваю вішнёўку! І я, во, тут... «казёнкі» прыхапіла, бо цяпер з гэтымі наліўкамі вішнёвымі — ой, не давядзі бог! Ды і закускі, во, бо чула, што ты апошняй курыцы галаву адсек, калі хадзіў у Забалацце сватацца... Відаць, благі з цябе быў сват, раз вярнуўся без нявесты?

— Ну пра тое лепш не ўспамінай! — незадаволена буркнуў Ціхан.— Антося, відаць, хацела, каб ёй пад пяткамі зімой ваду грэў, а летам — лёд замарожваў! Тая баба калі і плюне, дык наўздагон слюне пагля-дзіць, ці не з капейкай яна паляцела. То як калі будзе не па яе, дык на адну тваю нагу наступіць, а за другую — да пупа раздзярэ...

— А ты такі палахлівы? Віно ж піць не лякаешся? Відаць, ты, Ціхан, не здольны ні да арання, ні да кахання — крывая аглобля без брычкі!

— А ты хочаш з першага ж разу мяне ў свае аглоблі зацугляць? Дык давай дамовімся адразу: жывём па добраахвотнай федэрацыі?

— Па якой гэта яшчэ... ф-ферацыі?

— Ну ніхто нікога не будзе на сваю моду перарабляць! З якой хто лысінкай на свет з'явіўся, з такой і сканае... А будзе па-іншаму: кій у рукі, торбу на плечы — і бывай, Паўла Германаўна! Ціхан пайшоў на сваю дачу! — Пры гэтых словах Зосіч падвёў Паўлу да акна і паказаў ёй невялічкі дашчаны хлеўчык з прораззю для будучага акна.— Хату збуду, а гэта будзе мой прытулак, калі што...

— Дык ты ж у ім акалееш зімой?

— Не заўсёды ж будзе зіма, прыйдзе некалі і лета! А намерзнешся добра зімой, лета цяплейшым пакажацца... А гэта хароміна цяпер для мяне аднаго не трэба! — абвёўшы вачыма вялізны пакой і паказаўшы пальцам на дзверы бакоўкі, сказаў Ціхан і зноў сеў да стала.

— Сам з сябе жыўцом скуру лупіш! — не знайшлася што іншае сказаць Паўла.— Няхай бы чапела будыніна, можа б, каторы з сыноў знайшоўся?

— Абодва — у прымакі падаліся...

— Э-э, хлеб прымачы — хлеб сабачы!

— Праўду кажаш... Добрыя сыны ад роднага бацькі нікуды ў свет не пабеглі б... Нявестак бы для бацькоўскай палёгкі ў хату прывялі б... А калі яны так зрабілі, дык і я ім у залатой карэце залаты жбан з півам завязу... Абодвум! І Мікалаю, і Халімону! Піце, дзеткі, з залатога жбана бацькава піва!

— Ну і люты ты чалавек, Ціхан! Я сваіх лаю за тое, што мяне рабуюць, а ты — што адмовіліся ад твайго!

Калі стукнуліся чаркамі з «казёнкай», Ціхан павесялеў:

— Нешта сёння ў нас выйшла ўсё як з калочка! Слова да слова — і вяселле гатова!

— Цяпер усе так робяць: і маладыя і старыя!

— Але ж затое ў нядзельку на вяселлі цалуюцца, а ў панядзелак ужо спіны адзін аднаму паказваюць, разбягаюцца....

— Гэта як да чалавека, Ціхан! Некалі поп павянчае — і канец! Ці мілы, ці саплівы, а да скону яго цалуй... Хвідарацы тады не было!

— Федэрацыі! — паправіў па складах Паўлу Ціхан.— Сёння што ў нас, субота?

— Субота!

— Во-во! А ў панядзелак...

— Кінь чарцей сярод белага дня будзіць, няхай

спяць! Значыцца, я пайшла, а ты назіркам — за мной! Ды доўга тут не абаўляйся: у цябе ж ні ў хляве ніякая трасца не мычыць, ні пад печчу не кудахтае! Ды не забудзься памыцца, бо ўсё новае пасцялю... А то, можа, як яшчэ калі пупа завязвалі ды памылі, дык з таго самага дня і мыла цела не бачыла...

— От сказала! — раззлаваўся Ціхан.— Я ніводнай лазні не прапускаю! А калі ў нашай Гаёўцы не рабіла, у Забалацце не палянуюся, бывала, схадзіць...

— Там так і Антосю знайшоў?

— А хіба вас, баб, трэба яшчэ шукаць? Каб адно каторая ўдава дачулася, што за сто вёрст хто жонку пахаваў, адразу прыбяжыць...— упікнуў Паўлу Ціхан.

— Вельмі многа да цябе тых баб прыбегла? — не то са злосцю, не то жартам спытала Паўла.

— Бо ўвесь час хаваўся ад вас! І зараз, во, каб цябе раней праз акно заўважыў, зашыўся б пад печ замест пеўня...

— І карміў бы там курыных вошай! Дык жарты жартамі, а памыйся ды на цямочку падскочыш! — ужо на поўным сур'ёзе сказала Паўла і ўзялася за клямку дзвярэй.— Ну то, можа, на развітанне здагадаешся пацалаваць?

Ціхан, крэкчучы, ледзь абхапіў тоўстыя плечы Паўлы, цмокнуў яе ў губы.

— Вось так і будзеш крактаць, як некалі мой, калі пачне дзе ў кладоўцы цалавацца: здаецца, сама б яму дапамагла, так гэта даводзіцца яму цяжка рабіць!

— Яшчэ будзеш у мяне прасіцца! — горда сціснуўшы свае дробныя кулакі, патрос імі ў паветры Ціхан.— Як некалі мая Хвядося! Табе, казала, Ціхан, гарэм трэба, як таму турцу!

— Хваліўся заяц ажаніцца на ваўчыцы...

— І жывуць жа?

— Ваўчыца спіць у сваёй бярлозе на зайцавым футры...

— Не лякай дробнага калючага ярша вялікай платкай! — зноў прыклаўся губамі, на гэты раз не да губ, а да Паўлінчынай шчакі, Ціхан.

— Ну як, з соладам баба? Ці яшчэ не разабраўся як след? Прыходзь, разбярэшся, калі я таксама цябе пацалую...

— Дзіва што прыду, малявачка мая! — затросся ад нахлынуўшых пачуццяў Ціхан.

— Нічога сабе малявачка, на цэлы цэнтнер! — падзявочы хіхікнула Паўла.

— Цэнтнерамі каханне не мераюць,— прыціснуўся шчакой да Паўлінчынай спіны Ціхан.

— Дык каб ужо ж доўга я не чакала цябе,— яшчэ раз напомніла яна і пераступіла парог.

З таго вечара Ціхан назаўжды пасяліўся ў Паўлы. Але яго адвыклыя ад работы рукі хутка папрасілі спагады, перадыху, і ён ахаладзеў як да Паўлінчынай гаспадаркі, так і да самой Паўлы.

— Эх, а яшчэ пра гарэм хваліўся,— сказала аднойчы яму Паўла.— Рукі твае многа святкаваць любяць!

— А што ж мне ўжо цяпер трэба? — пытаўся больш сам у сябе, чым у Паўлы, Ціхан.— Пенсіі амаль паўсотні аграбаю — на хлеб хапае, а за чарку неабавязкова кожны дзень і брацца...

— Я цябе да сябе ўзяла, можна сказаць, што з падлогі на печ падсадзіла, а ты ўсё круцуеш, як здатней абдурыць мяне...

— Гэта ж дзе і ў чым я цябе абдурыў?

— Учора затрымалася каля царквы з жанкамі, дык карова засталася і не накормлена, і не напоена...

— Паставіў быў ражку, ды нагамі перакуліла...

— А ты не мог зноў яе паставіць на месца, га?

— Усё ж у гной вывернула, дык што, сам у тую ражку залезу, няхай твая карова жуе?

— Ата-та-та! Ата-та-та! — перадражніла Ціхана

Паўла.— З мяне ўсе людзі кпяць: займела дзірку на свой андарак! З табою і на людзях нельга паказацца — засмяюць!

— Разумны не засмяе...

— То ўсе людзі — дурні? Адзін ты, дзякаваць богу, у галаве цара маеш?

— Ні да кога не іду розуму пазычаць...

— А я думала, нарэшце, гаспадар у хату прыйшоў... А ён не да сябе, а ад сябе грабе... Учора каму два дзесяткі яек затарабаніў? А пасля яшчэ і яечні патрабуеш? Скулу табе ў бок! Смалы каб ты ўжо напіўся...

— Сёмы дзень ніякім смуродам рота не паскудзіў...— набраўшыся смеласці, устаў з услона Ціхан.

— Не паскудзіў? А пра што гэта ты ўчора ў Мікітавай адрыне выспеўваў? «Я набыў, браточкі, рэч: разам — жонка, разам — печ!» Гэта я табе і жонка, і печ? Дык злязай з печы, галубок, ды ідзі ў свой свінушак блох карміць!

Ціхан вельмі не ўпіраўся: хоць хату і прадаў, але ж у гародзе свой катух дакончыў на ўсякі чорны дзень!

— Як захочаш памілавацца, зноў прыбяжыш, але і дзвярэй не адшчаплю! — прыгразіў Ціхан і ўзяў сваё няхітрае багацце: драўляны куфэрачак, пратаптаныя валёнкі, стары, запэцканы сажай, чайнік, ды яшчэ сякеру, якая, пэўна, год дзесяць, а мо і больш, не калола дровы.

— Настольнікам табе дарожка! — перахрысціла на парозе Ціхана Паўла.— Калі і захачу з кім памілавацца, дык толькі не з табой, ядушлівым гарбылём!

— Ну заставайся, квактуха, без куранят! Хвалілася, што дзеці цябе на руках носяць, а яны, во, па году ніхто да цябе і носа не паказвае...

— Затое твае ад цябе ніколі не вылазяць? Нават хаты няма, як у людзей...

— Дык ты ж намовіла, каб хутчэй прадаў...

— А ты паспеў ужо на гарэлцы прапіць ды на цукерках прасмактаць тую сваю хату...

— Не-е! — рэзка павярнуўся з парога Ціхан.— Вось мае грошыкі, на ашчадкніжцы! На пахаванне берагу!

— Багадзельня цябе пахавае!

— Гэта больш пашаны, чым з папом! За дзяржаўны кошт, значыцца, пахаваюць, як якога міністра, ці генерала, альбо артыста вялікага! Во!

— Радуйся, Мікіта, што хата не накрыта!

— Пад адкрытым небам чысцейшае паветра! — яшчэ раз агрызнуўся Ціхан і падаўся ў свой катух.

Няхай сабе Ціхан быў раззлаваны, забіты сваім горам, але ўсё адно ён ніколі не здраджваў сваёй звычцы хадзіць унураным яшчэ з той пары, як знайшоў кашалёк з траяком.

«Насмяшыла вёску Паўлінка! — прыкра думаў ён пра Паўлу.— Мне дык што? Я адышоўся крышку ды пра ўсё і забыў, а яна? То людзі смяяліся, што мяне яна амаль на вужышчы прывалакла, а зараз будуць рагатаць, што ўцёк! Кепска толькі, што хату згадзіўся прадаць, але добра яшчэ, што грошы з чужой кішэняй не падзяліў! Калі зімой будзе нявыкрутка, стану ў каго-небудзь на кватэру, а вясной — зноў у свой катух! Хат цяпер у вёсцы мно-ога пустуе: жыві хоць у дзесяці адразу!»

Задумаўшыся аб сваім не вельмі зайздросным лёсе, Ціхан неяк нават і прайшоў кашалёк, які быў ужо ўтаптаны ў зямлю коламі трактара.

«Няўжо трактарыст не заўважыў? — падумаў ён і падняў той раздушаны кашалёк.— Каб хоць які чырвонец у ім ляжаў! З дасады б выпіў...»

Калі Ціхан выкалупаў з пяску кашалёк, з яго вылецеў на зямлю скамечаны камяк паперкі. Ён нахіліўся зноў, падняў той камяк і разгарнуў: гэта быў... латарэйны білет. Такі ж, якіх многа валяецца пасля чар-

говага тыражу: людзі са злосцю выкідвалі, хто дзе, усе свае нядаўнія спадзяванні на нечаканае шчасце, на ўдачу...

«Ты-ыра-аж адбу-удзе-ецца чатырнаццатага лі-іста-апада! — уголас прачытаў сам сабе Ціхан.— А сёння якое чысло? Дзесятае? Яшчэ не правераны білецік, можа, і павязе?» — азірнуўся Ціхан вакол, каб пераканацца, ці няма побач чужога чалавека. Але яго нагнала Тэкля, сяброўка Паўлы.

— Сваё знайшоў ці чужое падняў? — пацікавілася яна.

Ціхан зірнуў на сваю правую руку, ці не бачны з кулака памяты латарэйны білет? Не, не бачны!

— Ды, во, кашалькі людзі сярод дарог губляюць... Няхай бы з грашыма, а то... з цыганскім шчасцем!

— Грошы трэба зарабляць, а не на дарозе шукаць,— падкалупнула Ціханаву ляноту Тэкля.

— Няхай зарабляе той, у каго бракуе тых грошай... А ў мяне...

— А ў цябе ажно штаны з клубаў злятаюць, столькі грошайназапашана ў кішэнях!

— Грошы ў сваіх кішэнях сам і палічу, нікога не буду прасіць, каб дапамог...

— Ёсць у цябе там што лічыць? Усе ўжо крамнік Пятрусь пералічыў твае грошы...

— Пакінуў нямала і мне...

І трэба ж было здарыцца так, што той самы латарэйны білет, які Ціхан знайшоў у трактарнай каляіне, выйграў ажно машыну «Волгу»!

Першай пра гэта пачула, канешне, Паўла. Яна прыбегла да загадчыка магазіна Петруся Гардзея, спытала:

— Ціхан калі купляў у цябе латарэйныя білеты? Невядома, не! Ой-ой-ой! Гэта ж палянілася запісаць нумары білетаў, а цяпер дакажы, што гэта быў твой білет... Сцібрыў Ціхан, шэльма! Разам з дваццацьпяткай у шуфлядзе ляжалі, дык усё і прыхапіў!

— Не можа таго быць! — засмяяўся Пятрусь.— Гэта не наш білет, калі вы толькі ў мяне іх куплялі... Такой серыі я не прадаваў!

— Ды ці мала дзе я магла купіць той білет? Часам у райцэнтры хлеб купляеш, а на здачу капеек у касіра няма, дык латарэямі здае...

— Можа быць, можа быць! — згадзіўся Пятрусь і звярнуўся да чарговага пакупніка: — Вам чаго: цукерак, пячэння, джэму?

— Ой, божачка, от аблапушыў бабу, прайдзісвет, дык аблапушыў! — ледзь не плачучы, прабіралася на выхад з магазіна Паўла.— Пабачу, з горла вырву той білет!

— Няма ў Ціхана ўжо білета,— сказала бялявая жанчына, якая паставіла на прылавак сваю сумку, укладваючы ў яе пакупкі: начальнік паштовага аддзялення і загадчыца ашчадкасы.

— Як гэта — няма?

— На экспертызу паслалі. Такі парадак! А пасля дзядзька Ціхан можа на сто вёрст вакол раз'язджацца ды сватацца...

— Цьфу! А яшчэ начальніца! — злосна вылаялася Паўла.

— Баліць кабеце! — умяшалася ў гаворку старэнькая бабулька Вольга Іванаўна, Ціханава суседка.— Правуецца цяпер! А як вытурыла з хаты чалавека на зіму, калі ён яе і абкасіў, і абараў, дык тады і не дозубу! На руках хадзіла! Заходзіць гэтак пад вечар, дрыжыць ад холаду і ледзь не плача:

— Пусціце, цётка Вольга, хоць да вясны! Буду плаціць, як усе кватаранты-настаўнікі, дактары... Гатова была і з пятак скуру садраць, каб лепш ногі мерзлі!

— Абагрэла ўжо злодзея! Прытуліла! Дык ён жа табе ва ўнукі гадзіцца! Ведзьма старая!

— Няхай сабе і ведзьма, але не на памяле буду лятаць, а на «Волзе» раз'джацца, як якая прахвесар-

ша! На цябе з акна той «Волгі» і кіслым вокам не зірну! Бяжы, бяжы, там ён зараз якраз гараж будуе, дык сякера пад рукамі!

— Аха-ха-ха! — зарагаталі ўсе, хто быў у магазіне, у адзін голас.

— Паглядзіце, паглядзіце, людочкі, і Ціхан якраз у магазін паўзе! — сказала Арына, якая стаяла бліжэй да акна.— Цяпер наробяць смеху, бакі папенькаюцца ў людзей!

— Глядзі, каб бяды не нарабілі! — перастаўшы адпускаць тавары, утаропіўся ў акно і Пятрусь Гардзей.

Усе прыніклі да акна, але пачуць, аб чым гаварылі Паўла з Ціханам, адсюль было нельга.

— Во-во! Глядзі, зараз возьме за каўнер ды і зноў дамоў зацягне, як тады! — рагоча Арына.

— Дурань будзе, калі вернецца! — спачувае Ціхану Вольга Іванаўна.— Прачуюць пра машыну, дык і хлопцы з нявесткамі вернуцца...

— Трэба вельмі тады яны яму будуць...

— У бацькі заўсёды сэрца адыдзе...

— Але не ў Ціхана! — прыпаўшы носам да акна, кажа прадавец.— Пэўна, не менш пяці разоў кожны раз здачу лічыць, калі што купляе...

— Ашчадны на грошы...

— Клапоцішча, каб і назаўтра было завошта шклянога бога пабачыць...

— Не, не кажыце так, жаночкі! — перабівае ўсіх Ціханава суседка Вольга Іванаўна.— Ціхан ва ўсім ведае меру!

— Гэтку б меру — ды землямеру! То заўсёды б лішніх сотак людзям намераў...

— Павя-яла! — падвынікаваў усю дыскусію прадавец.— Пабег, як цуцік! Бо ёсць за чым бегчы!

А Ціхан тым часам рос сам у сваіх вачах, як гаворыцца, не па днях, не па гадзінах, а па хвілінах...

— Паклон Ціхану Мітрычу! — толькі што гукнуў

са свайго гародчыка Клім Андросік, які першы некалі на ўсю вёску набыў машыну — яшчэ гарбатую «Пабеду». Рэдка з кім тады ён трымаўся на адной назе, кожнае слова ў яго гаворцы было з зымзамі, з нейкай насмешкай.

— Лапцей наплёў на зіму, каб не басяком бегаць у райцэнтр па хлеб? — кпіў ён часам і з Ціхана. А цяпер во: — Паклон Ціхану Мітрычу! З набыццём уласнай «Волгі»! — Нават шапку для большага понту над ілбом падняў...

— Ат, трапіла курыцы зерне, ды не ў пару — ужо знясласся!

— Э-э! Цяпер усе дзеўкі твае! — хітравата падміргнуў Ціхану Клім.— Толькі нешта ў апошні час ты надта зморшчыўся, як стары гармонік! Мусіць, зусім закілзала Паўла? Печ, а не баба. Пэўна, добра грэе, га? А цяпер будзе грэць яшчэ лепш...

Гаварыў Клім так пераканана, нібы і не чуў пра тое, што Паўла даўно вытурыла ад сябе Ціхана. А той не пярэчыў. Ціхан радаваўся, што цяпер яго так клічуць-велічаюць, быццам старшыню калгаса: Ціхан Мітрыч! Таварыш Супоня! Во што багацце робіць! У каго, памяркуй, зараз у вёсцы ёсць на ашчадкніжцы пятнаццаць тысяч рублёў грошай? Можа, хіба ў брыгадзіра ці ў ляснічага, ды і то наўрад ці ёсць у іх такія грошы!

— Во, я ўсю вёску перанышпарыла, а ён спёрся на плот ды байкі бае! А вунь дома сыны: і Халімон, і Мікалай чакаюць!

— Ну дык ідзі пахваліся і перад хлопцамі, якім ты стаў багатым! — зноў хітравата падміргнуў Ціхану Клім.— Прыходзь да мяне, падвучу крыху шафёрыць... А то ж каго ты за руль пасадзіш, Паўлу?

— Так я і ўхаплюся! — злосна буркнула Паўла.— Хіба мала людзей на тых машынах свой канец знайшло?

— Можна яшчэ ўзяць і грашыма, не позна! — разважліва зазначыў Ціхан.

— Эх, галава твая, апілкамі набітая! Трэба было тайком штурхануць той білет якому каўказцу, азалаціў бы... А цяпер — по-озна! Шпікулянтам назавуць...

— Які ён табе шпікулянт? Які? — накінулася на Кліма Паўла.— Ён сваю ўласную вош пасаромеецца перапрадаць!

— А таму і без хаты сядзіць, па чужых кутках валяецца! — ускіпеў Клім.

— Па якіх гэта — чужых? Ён мой законны муж і ў яго ёсць дом!

— Ага! Як даеш паляру! І як гэта з табою патрапляе хадзіць у нагу Ціхан?

— Падскоквае ззаду за мной!

— Хіба што так...

— Ну дык ты што, не чуў, што цябе сыны паўдня чакаюць?

— Чаму ж не чуў? — ледзь чутна сказаў Ціхан і паплёўся за Паўлай.

— І без повада можна па баразне вадзіць! — усміхнуўся ўслед Паўле і Ціхану Клім.— Вырачашся там і сваёй «Волгі»! Зноў з хатулькам, згорбіўшыся, будзеш у мароз у свой будан вяртацца...

— Я бегаю з хаты ў хату, ва ўсіх пытаюся, куды гэта ён прапаў, а ён у Кліма аб плот зубы вострыць! І пра жонку, і пра сыноў ужо забыў, машына розум адабрала!

— Ну, тата, віншуем цябе з выйгрышам! — пачаў Халімон, але яго перабіў бацька:

— Сам выйграў тую машыну, сам сябе і павіншую!

— Во, чулі, як глыбока плуг у баразну запускае? — умешваецца ў гаворку Паўла.

— Перастаньце хоць вы зараз пры нас, дзецях, сварыцца! — супакойвае ўсіх Мікола.— Напрыклад, я зу-

сім нічога не чакаю ад гэтай машыны, але ж павіншаваць усё ж прыехаў...

— Мусіць, гадоў ужо з сем не прыязджаў?

— На поўначы быў! А калі і вырвешся ў адпачынак, хутчэй на поўдзень спяшаеш, на сонцы пагрэцца... Доўгі рубель, тату, намнога жыццё чалавечае скарачае.

— А кароткі — павялічвае, скажаш?

— Ну дык ужо, напэўна, і не ўкарачае?

— Дык вось я зараз начамі і не сплю, усё думаю, як той рубель падкараціць, каб жыццю не пашкодзіў...

— У добрых руках любы рубель не бывае лішнім,— ужо зусім спакойна гаворыць Паўла.— Я думаю, што табе, Ціхан, на старасці год трэба больш за ўсё нагамі тэпаць па зямлі, а ездзяць няхай маладыя...

— Не пашкодзіць і мне з ветрыкам палятаць..

— Мы, тата, так з Міколам рашылі: раз ты выйграў «Волгу», у цябе цяпер грошай на пражыццё хопіць, а мы мяркуем па закону падзяліць грошы за хату,— разважліва пачаў сваю гаворку Халімон.— Раней бы людзі сказалі: не дагледзелі бацьку, пакінулі, а грошы за хату патрабуеце! А мы ж табе прапаноўвалі: хоць да мяне ідзі жыць, хоць да Міколы...

— Хату б бацькаву праелі, а пасля б і бацьку — кіем па баку!

— Ну тады ты дрэнна аб іх думаеш! — лісліва заначыла Паўла.— Добрыя дзеці ніколі такога не зробяць!

— Дык то ж добрыя...

— А мы якія?

— Гэта вы адзін у аднаго запытайце!

Пакуль мужчыны цапаліся паміж сабою, Паўла сабрала на стол багаты пачастунак. Яна амаль не адыходзіла ад Ціхана.

— Ну, мужанёк, каб, як гаворыцца, па начах ваўкі не вылі ды авечак не лякалі! Будзем!

— Я чалавек ганаровы! — ужо трохі падпіўшы,

яршыўся Ціхан.— Ты, Паўла, пажартавала, а я цябе, во, як налякаў...

— Дык хіба табе ў мяне кепска, Ціхоня, га? Ад дабра дабра не шукаюць!

— Шукаюць датуль, пакуль не знойдуць!

— Ну, каб авечак ваўкі баяліся! — зноў лезла Паўла са сваёй няпоўнай чаркай да поўнай Ціханавай.— Тут, во, уся радня сабралася, дык і абсяймуем, як нам быць далей...

— А што тут абсяймоўваць, што? — абдымаў за шыю Паўлу Ціхан.— Я з сабою ў магілу тых грошай не забяру: усім пароўну! Па-бацькоўску! Шчыра, з усёю душой!

— Ну, я так і ведала! — усхапілася з услончыка Паўла.— Маё — есць, п'е, а грошы — у чужую кішэню кладзе! Пачулі, прыбеглі, расплакаліся! — крычала Паўла, пазіраючы то на Міколу, то на Халімона.— Я, я буду на той «Волзе» катацца! Чулі, бацьказабойцы? Я яго падабрала ў гразі, я з ім і свой век давякую! А цяпер — вось вам бог, а вось — парог! — тыцнула пальцам спярша на вобраз у куце, а пасля на парог Міколу і Халімону Паўла.

— Цётка! Цётка! — пачаў быў супакойваць гаспадыню Халімон.

— А-а! Дзень добры, мама! А бывай — цётка? Вон! Абодва — вон з маёй хаты! Прыперліся, як тыя сабакі на разніцу!

Мікола і Халімон хуценька апрануліся і, не развітаўшыся, пабеглі на аўтобусны прыпынак.

— Дзе білет? — грозна ўстала ўсім сваім мажным целам перад дробненькім Ціханам Паўла.

— Адаслалі ў Маскву,— ледзь чутка з пераляку азваўся Ціхан.

— А не хлусіш?

— Ды навошта ж мне хлусіць, малявачка? Во, і квіток маю, што здаў у ашчадкасу...

— Пакажы, бо ўжо зусім не веру табе...

— Недзе тут, у левай кішэні...

— Можна? — пастукаў нехта ў дзверы.

— Каго гэта яшчэ там носіць? Зайдзі! — сказала Паўла і хуценька пачала прыбіраць са стала пустыя талеркі і бутэлькі.

— А-а! Савецкая ўлада пажадала наведаць нас?

У хату зайшоў участковы міліцыянер з нейкім невядомым чалавекам.

— Ну, з незаконным набыццём «Волгі», Ціхан Дзмітрыевіч! — пацiснуў участковы Ціхану руку.

— Як гэта — з незаконным? — пачырванеўшы і адразу прыйшоўшы ў цвярозы стан, спытаў Ціхан.— Выйграў! Так, як і ўсе шчаслівыя людзі, Антон Карпавіч!

— Каб жа так, каб жа так, Ціхан Дзмітрыевіч! Тады б ніхто і слова вам не сказаў...

— Мы разам той шчаслівы білет купілі! — спыніўшыся пасярод пакоя з наруччам пустога посуду, зазначыла Паўла.

— Разам знайшлі, хочаце сказаць?

— Як гэта — разам знайшлі?

— А вось так! Вось гэты чалавек, Сіл Сілыч Майсейчык, трактарыст суседняга калгаса «Радзіма», дзесятага лістапада, праязджаючы на трактары праз вашу вёску, згубіў кашалёк чырвонага колеру з трыццаццю капейкамі і латарэйным білетам... нумар такі, серыі такой... Аб чым і складзены адпаведны пратакол дзяжурным па аддзеле міліцыі лейтэнантам Касцючыкам. І не добра вы паступілі, Ціхан Мітрыч! Усе сумленныя людзі... таго, усялякія знаходкі нясуць у міліцыю, а вы — у ашчадкасу! Каб не было дадзенага пратакола, вы б маглі яшчэ адпірацца, а так...

— То, можа, прысядзем,— забегала па пакоі Паўла.— Трэба дасканальна ва ўсім разабрацца...

— А што тут яшчэ разбірацца? Я падняў той сплямжаны кашалёк, а ў ім...

— ...быў шчаслівы білет,— закончыў прызнанне Ціхана ўчастковы.

— Вон! Вон з маёй хаты, аб'ядала! З сынамі не змог піва зварыць, дык думаў — са мною ўжо патрапіш?

— Жыццё — латарэя! — вяртаючыся ў свой катух, меркаваў сам з сабою Ціхан.

З халоднага лістападаўскага неба ўсміхаліся яму бляклыя зоркі, нібы таксама разумеючы яго смутак і боль, час ад часу падміргваючы:

— Выйграе — шчаслівы! І ніколі не здагадаешся — хто?

«Яшчэ і не паспеў на машыну сесці, як ужо паўсвету бяжыць цалавацца, нібы цябе сам Хрыстос на вялікдзень мёдам памазаў... Усе бачаць! А як увачавідкі збяднеў — кожны свае вочы за пазуху хавае!» — прыкра дакараў увесь чалавечы род Ціхан, першы раз, можа, зірнуўшы ў неба, да зорак...

# Аднойчы летам

У шыбіну акенца, якое глядзела проста ў сасоннік, стукнула дзюбкай нейкая невялічкая птушачка, і Раман расплюшчыў вочы. Ён даўно ўжо не спаў, але не хацелася турбаваць сябе нейкімі ранішнімі клопатамі. Проста хацелася паляжаць моўчкі з заплюшчанымі вачыма, памарыць, як гэта рабіў у далёкім дзяцінстве, якое прайшло тут, вунь у тым сасонніку за акном.

Тут яна, сцежка яго дзяцінства! І калі заплюшчыць вочы, доўга так паляжаць спакойна, можна ў думках перанесціся ў тую пару.

Розныя жыццёвыя падзеі мінаюць, як чыгуначныя станцыі — паволі, з працяглымі супынкамі, а часам мільгаюць, як слупы за акном аўтобуса: не паспееў разглядзець аднаго з іх, як ужо праскочыў другі, трэці...

Спярша мы імкнёмся ў жыцці ўсё наперад і наперад, пасля нам чамусьці хочацца зазірнуць у тое мінулае, якое намі пражыта, нават самая горкая хвіліна, колішняя трывога здаецца цяпер нам шчасцем, і хочацца вярнуцца да іх хоць кароценькім уцешлівым успамінам...

Раман даўно збіраўся прыехаць сюды, у родную вёску Рудку, асабліва восенню ці хоць ранняй вясной. Восень пішучаму чалавеку напамінае аб тым, што можна зрабіць за лета, калі не паляніцца: вырасціць яблык, колас, падперці нябёсы стагамі сена...

Раман усё жыццё лавіў сябе на думцы, што гэтая глеба для яго творчасці — Рудка, вёска, дзе некалі яго карані ўчапіліся ў родную зямлю. Гэта адна з самых вялікіх і неразгаданых таямніц, якая называецца лю-

боўю да роднага кута. Яе разгадваюць паэты словам, музыканты — музыкай, мастакі — фарбамі, а разгадка ўсё не прыходзіць. Яе, гэтую любоў, можна толькі адчуць сваёй душой, без сведкаў, без гукаў, без слоў і фарбаў...

Глядзець на тую сасну, з-пад якой ты ўпершыню зірнуў на сонца ў небе, і трапятаць душой, радавацца моўчкі, калі душа можа весці гаворку толькі сама з сабой. І добра, калі ва унісон гэтаму пачуццю ачуецца яшчэ адно — пачуццё да блізкага чалавека. Тады гэта будзе называцца шчасцем ці нават і раем!

У Рамана зараз аніякіх думак у галаве, адны пачуцці: узыходзячае сонца пазалаціла невялічкую шыбіну акна, якая да яго прыезду, пэўна, гадоў дзесяць — пятнаццаць не бачыла і кропелькі вады, таму зараз павесялела, памаладзела, упусціла ў пакой шмат лішняга святла, падбадзёрыла, падшанавала і на сценах старыя-старыя шпалеры, астыўшую даўным-даўно грубку. Сонца гаюча высвечвала бялюткія прасціны, упілося сваімі праменнямі проста ў чыгунныя дзверцы грубкі.

«Некаторыя пісьменнікі спярша запальваюць кволенькі, палахлівы агеньчык чалавечай мудрасці ва ўласнай хаце і выносяць яго на вуліцу, каб раздзьмухалі вятры, каб ён пасля разгарэўся шырока і бачна,— думаў Раман.— А ёсць другія — гэтыя з большым размахам бяруцца абнаўляць свет: прыпальваюць свой гатовы факел адразу ад вялікага агню сусветнага мастацтва і варочаюцца з ім на родны падворак, у родную хату, каб асвятліць гэтым факелам кожны куточак, кожную шчылінку ў родным котлішчы і разгледзець у ім усё, што да чаго... Але ў такім выпадку можа той чужы агонь часам падпаліць тваю родную хаціну... З ім трэба абыходзіцца вельмі асцярожна!»

Раман падумаў, што ён паспрабаваў падпаліць свой факел ад агню сусветнай думкі, вярнуўся сюды, каб

асвятліць тут і сабе і другім усе куткі і шчыліны жыцця. Ён перачытаў і старажытных грэкаў, і сярэдневяковых італьянцаў, і навейшых еўрапейцаў, паглядзеў на сваю зямлю вачыма Талстога, Дастаеўскага ды Буніна... Але для яго зараз трэба мець і свой зрок, і свае слова, каб убачыць новы свет і расказаць аб ім словам, якое б магло паднаўляць чалавечую душу.

«Ёсць шмат пунктаў гледжання на факт ці з'яву, але ёсць адзін-адзіны правільны, якога і трэба пісьменніку шукаць! Гэта і будзе называцца пошукам сэнсу жыцця,— думаў Раман.— Перш чым выбраць гэты правільны пункт, трэба з многіх бакоў падысці да яго!»

...У вёсцы жыццё пачынаецца вельмі рана. Вось недзе рыкнула, выходзячы з хлява, карова, у другім канцы вуліцы за ёй зараўлі другія. Зазваніў на шыі ў нейкай падкай каровы малінавы званочак: далёка, свавольніцу, пастух пачуе, не надта паласуецца яна аўсом ці бульбоўнікам, будзе скубці мурог разам з усёй чарадой.

— Міша, Міша, сынчык! Уставай! Людзі ўжо свае кароўкі на выган павыганялі! Усяго адзін дзянёчак папасём, а заўтра цётка Міроніха пагоніць! — будзіла нейкага хлопчыка маці, каму сёння, відаць, выпала радоўка пасвіць кароў.

«Цяпер не тое што ў мае дзяцінства,— думаў Раман, зноў заплюшчыўшы вочы.— Цяпер дзень-два папасе каторы падшыванец тых кароў ды ўсё лета з вудай ля азерца цешыцца. А раней раптам што ў якую святую нядзельку зробіць табе падмен той дзядзька ці цётка, у якіх ты заняў кароў перапасвіць лета. А калі пачнецца касавіца ці жніво, скажам,— і гэтага не дачакаешся! Так разаспішся, бывала, што маці і разбудзіць, але пакуль карову падоіць, зноў заснеш. Ды так, пад рукой з лапцямі ды анучамі, па халоднай расе і бяжыш за тым статкам, дзе-небудзь, калі спыняцца каровы на якую хвіліну-другую, тады і абуешся!»

— Мы-а-! — данеслася мычанне каровы недзе зусім зблізку: пэўна, цётка Кацярына ўжо выганяе і сваю Бонду.

— Ну ідзі, ідзі, набірайся малачка для нашага даражэнькага госцейка, можа, і пра нас з табой напіша што! — падганяе цётка карову.

«Нічога сабе! — зазначыў Раман.— Селянін без карысці і шклянкі малака не сапсуе: выпіў — касой размахніся шырэй! А за пяро ўзяўся — пішы, браце, пакуль вушы ў бакі не вывернуцца ад натугі! Вось у каго трэба вучыцца вынослівасці: каб па селяніна з труной пад'ехаў, спярша б на двары зрабіў бы парадак — плот бы падпёр якой загагулінай, дроўцы б як след склаў бы пад паветкай, сякеру б у калодку ўвагнаў і сказаў бы:

— Ну, здаецца, усё зрабіў — дай у труну легчы, ды паедзем, бо няма калі валаводзіцца! А там яшчэ крыкнуў бы:

— Не закрывай труны, пабачу, ці куры старая на курасадню пасадзіла! Во як яно ў яго выходзіць! А мы трынь-трах, ды ўжо і ў часопіс бяжым, каб людзям хутчэй сваё трынькание паказаць! Не, брат, баста, хопіць, нездарма ж я сюды прыехаў: кожнае слова розумам на месца пастаўлю, а душой узважу, ці гэтыя словы — зярняты ці амецці? Ды яшчэ і чытаць буду кожны раз каму-небудзь з вяскоўцаў: як гэта ім будзе здавацца? Дурноту ў вясковага чалавека таксама няма часу слухаць! Ты яму чытай, а ён будзе на гаршчок у печы пазіраць, каб варыва з яго не выбегла. Яму тое важней! А калі ён пра ўсё забудзе: і з гаршка варыва зусім выбегла, і карова застанецца незагнанай у хлеў, тут ты сваё ўзяў, тут ты — Гогаль, не менш!»

— Ну, пайшла, Бондачка, пайшла! Нядобра, калі цябе на выгане будуць чужыя кароўкі чакаць!

«А цётка Кацярына зусім не змянілася ў голасе,— падумаў Раман.— Хоць столькі часу мінулася! Але

пра Зоську — ні слова! Быццам зусім і не я прыехаў, а нехта іншы, хто ніякага дачынення ніколі і не меў да іх сям'і».

Сонца пачало біць у самыя вочы Раману, таму ён павярнуўся тварам да сцяны, да якой быў прымацаваны наспех учора ўвечары нейкі дзяшовенькі дыванчык з канапляных ці льняных нітак.

— І не паверыла б табе, Раман, што ты і на самай справе прыедзеш? — гаварыла ўчора за вячэрай цётка Кацярына.— От, думаю, напісаў пісьмо ў канцы зімы, а самога няма і няма. Дык я ўжо і думаць перастала... І раптам учора гэтая тэлеграма... Не паверыш, ажно расплакалася... Як па родным дзіцяці расплакалася! Як пачую па радыё тваё прозвішча, неяк уся вёска святлейшай робіцца: і наш чалавек нешта хоча свету сказаць! — думаў пра ўчарашняе Раман.— Гэта лёгка падумаць: сказаць! Сказаць-то можна і сказаць! Але што і як сказаць? Каб было цікава, каб тваё тое казанне чалавека рабіла лагоднейшым, вось што трэба сказаць! А што можа зрабіць чалавека дабрэйшым, якое такое магічнае слова са скупой, дапусцім, Праксэды, зробіць пяшчотную Аўдоццю? Ці Кузьму — п'яныя вочы — ардэнаносцам Кузьмом-непаседам?»

— Усё гарадскія справы, цётачка, трымалі: там тое, там другое! Як кажуць, тут зашыеш, там парвецца, тут памыеш, там запэцкаецца! А з гэтага зашывання ды мыцця і дні складваюцца, месяцы, гады...

— Ой, рана табе, хлопча, пра гэта думаць. Трэба кніжак многа напісаць, дзяток на ногі паставіць... Колькі іх у цябе?

Раман нібыта і не пачуў апошніх слоў: ён дастаў з талеркі відэльцам маласольны агурок, захрумстаў ім, абводзячы вачыма такі знаёмы пакой, дзе некалі яны з дачкой Кацярыны Зоськай урокі вучылі. Ды якая там вучоба была! Адно цётка куды ступіць крок, як яны ўжо абдымаліся. Няхай гэта было каханне па-

куль што бязвіннае, незразумелае, якое ніякіх разлікаў на будучае і не мела, але ўсё ж пакрысе ў іх душах прачыналася і яно: тое каханне, якое трымае ў сабе і сэнс жыцця чалавечага, і забяспечвае род людскі абнаўленнем яго.

Цётка Кацярына крайком вока заўважыла, што Раману не спадабалася пытанне: нешта і ў яго, мусіць, не паладзілася ў жыцці, бо інакш бы нечым пахваліўся б, быць таго не можа! А так больш пра вялікія справы вядзе гаворку: жыццё, літаратура, тое ды другое, а каб што пра сваю душу адкрыць,— таго нічога не кажа... Туляецца яго душа ад пабочнага вока! Нечым, відаць, паранена ці і зусім пакалечана!

— Ну, еш, еш! — падахвочвае Рамана цётка.— А я тым часам схаджу да каровы. Яшчэ паспеем нагаварыцца за цэлае лета...

— Паспеем! — згадзіўся Раман.

Цётка Кацярына ўзяла дайніцу, вядро, цадзілку, зірнула неяк крыху, як здалося Раману, здзіўлена на яго, пайшла даіць карову. За гэтыя гады яна намнога пастарэла: вочы, нос тыя ж, а вось стан не той — паблажэў, асеў, валасы пабялелі, але рухавасці час не прытупіў — яна ўсё ж такая была рухавая, гаваркая, мела ахвоту кальнуць сэрца жартам, удосталь пасмяяцца, калі гэта здаралася.

Раман устаў, падышоў да покуцця, на якім вісела чарнаватая рамка з фотаздымкамі: вось здымак іх сёмага класа, вось дзесятага...

«Ага, дзе ж гэта тут я? — падумаў Раман.— Недзе павінен быць вось тут, каля Вольгі Лукашук! Не, няма!»

І тут раптам ён убачыў, што яго фотаздымак павялічаны і прылеплены да здымка Зосі: нават галовы нахілены адна да адной. І яму зрабілася неяк не па сабе: хацелася ўзяць свой чамаданчык, пайсці да дваюраднага брата, пабыць там пару дзён і падацца назад

у горад. А прыехаў ён сюды таму, што ў цёткі Кацярыны ля самага лесу стаяла старэнькая хаціна, якая, як кажуць, ні ў кога хлеба не прасіла, таму ніхто яе і не чапаў: жыў тут некалі леспрамгасаўскі конюх, родам недзе з Браншчыны, Сямён Іваноў з жонкай Лушай.

Сямён, накарміўшы вялізных бельгійскіх коней аўсом, добра напаіўшы іх вадой, і калі іх разбіралі фурманы, яшчэ ішоў у лес пілаваць рудстойку для данбаскіх шахтаў ці метровыя дровы для раённага тартака з млынам. Часам хадзіла з ім і Лушка, але пасля яна больш упраўлялася па доме: рыхтавала абеды, а таксама корм коням — рэзала сечку, абмешвала яе аўсом. І рабіла гэта «па сумяшчальнасці» з амурнымі клопатамі. Аднойчы яе і застаў Сямён з мясцовым брыгадзірам калгаса. Во была пацеха: усе вокны — ушчэнт, з рамамі пасыпаліся, зляцелі з кручкоў і дзверы, а сама Лушка стаяла, упёршыся ў грубку спіною, з сякерай у руках і крычала:

— Ты і так з мяне ўсе сокі высмактаў! Ка-апі-ітан! Пакінуў роту ды сам у кусты? Скажы яшчэ дзякуй, што цябе так рана з турмы выпусцілі на волю... Адно паткніся, без трыбунала абязвечу! Ну, давай, давай! Спяшайся на небе з архангелам Гаўрыілам абняцца! Ды ты яшчэ радуйся, што табе, валацузе, бульбіну якую спару! Не лю-юблю, не люблю, абразіну бранскую! Любві душа жадае! Падыходзь, абразіна, і цябе палюблю, у самую макушку галавы сякерай пацалую!

Сямён і на самай справе ў вайну быў капітанам, але нейкі вялікі грэх з той вайны прынёс на душы, бо не любіў нікому аб гэтым нават і гаварыць. Нават ёй, Лушцы! А людзі пра гэта не ведалі і зусім нічога. Ды Сямён і не хацеў, каб яны і ведалі. Таму пры гэтых словах ён апускаў вочы, а зараз апусціў з-за плячэй бярозавую даўбешку і зусім мірна праказаў:

— Ну чорт з табою, Лушка! Не дапільнаваў змола-

ду, а зараз позна... Але ж людзі гавораць пазавуголлем! Бачаць жа, усе бачаць, адзін я сляпы!

— Кінь даўбешку! — камандуе Лушка і ідзе ад грубкі да дзвярэй.— Кінь даўбешку, кажу табе! — крычыць сурова яна яшчэ раз, скасавурыўшы да болю твар і наліўшы крывёю вочы.— Лушка зараз абшчэственная любоў пасля таго, як ты абганьбіў на фронце і сябе, і мяне, і дзяцей... Я б зараз не карчы за табой спальвала, а на Чорным бы моры загарала!

— Ну паедзем, паедзем на тое чортава мора,— супакойваў Лушку Сямён.

— Каб ты каленьмі ездзіў з торбай на шыі...

— Ну, Лушка, пабойся бога, калі не баішся людзей...

— А няхай і людзі ведаюць, які ты аматар у жыцці: капітанам быў — ротай камандаваў, а цяпер, во, пад хвасты коням зазіраеш...

Людзей тады насабіралася — ой многа! Дзіва, столькі шуму-бою, якога ў Рудцы ніхто не чуў і не бачыў з часоў цара Гароха!

Стаяў цёплы летні адвячорак. З хлява час ад часу даносіўся голас цёткі Кацярыны:

— Ну яшчэ кропельку, мілая, прапусці! У нас жа зараз яшчэ адзін раток у хаце на тваё малачко дабавіўся!..

Раман проста і не спытаў, хто яшчэ застаўся ў жывых: дзед з бабкай, відаць, памерлі даўно, а два браты Зоські — Аркадзь і Павел з'ехалі ў тыя часы, калі ў калгасе плацілі за работу — адзін пішам, два запамінаем!

Хутка цётка вярнулася: яна працадзіла малако, наліла конаўку Раману: здаецца, нічога ніколі ён смачнейшага і не піў, не еў.

— Можа, тут сёння пераспіш, а ўжо заўтра на сваю кватэру пойдзеш?

— Ды не, тут я вам буду толькі перашкаджаць,— неяк настойліва сказаў Раман.

Хоць ён нарадзіўся і вырас у Рудцы, але зараз не быў падобны на вяскоўца: гарадскі гарнітур, штыблеты, прычоска выдавалі ў ім гараджаніна, які прыехаў у вёску на дзень-другі, каб назбіраць малін ці грыбоў... Толькі вось душу не перакуеш, цягнецца яна туды, дзе на свет паявілася!

Так ён учора і апынуўся на гэтым драўляным ложку, у маленькай хатачцы, у якой давядзецца пражыць цэлы месяц. Праўда, сталавацца ён будзе ў тым доме, дзе жыве цётка Кацярына, але гэта ўжо хвілінная справа.

За сцяной, да якой ён зараз павярнуўся тварам, яго, а канкрэтней, яго бацькоў сядзіба: з аднаго боку рос высокі дуб, з абсечаным голлем да самай палавіны, каб менш даваў ценю на бульбу ці капусту, якія кожны год раслі побач з ім, а з другога боку — разложыстая бяроза, якая кожную вясну давала бочку-дзве бярозавіку. І дуба і бярозы зараз няма, няма і тых жоўтых руж пад акном, якія гарэлі гарачым полымем аж да самых маразоў. Хату прадалі яшчэ яго бацькі, сястра купіла сабе дом у гарадскім пасёлку, куды і бацька пераехаў, пахаваўшы маці на рудкаўскіх могілках. Сядзібу забудавалі новыя людзі, яна амаль нічым не напамінала Раману колішняе роднае котлішча, а гэтая хаціна, з яе колішнімі рамантычнымі падзеямі, хвалявала яго зараз як родны прытулак.

Кароў людзі павыганялі на пашу, недзе ў полі прастракатаў трактар. І навокал стала так ціха і прывабліва, нібы свет пачаў сваё стварэнне занава.

Раман выйшаў на двор, агледзеўся: таго плота, што раздзяляў іх сядзібы і пад якім заўсёды стаяла дзесятак вулляў-калод, пчолы з якіх часам перашкаджалі ўдзень апрацоўваць грады, зараз не было. Не было і тых бяроз, што абступалі хаціну: калі леспрам-

гасаўскія коні далі ім гарту, яны пазасыхалі. Праўда, на іх месцы добра расце бульба, яблыні і грушы, якія трапілі сюды яшчэ да вайны з панскага маёнтка. Дрэвы перасаджваліся ўжо вялікімі, таму доўга чэзлі і маглі б на той жылапудзіцы зусім засохнуць, каб не вырабілі яе пасля вайны пад агарод. Раман яшчэ раз добра агледзеўся навокал і падумаў, што, мусіць, ён і дарэмна сюды рваўся, што гэты куточак яго дзяцінства толькі здалёку здаваўся яму рамантычным. А на самай справе — так сабе, забыты мядзведжы куток! Рамантыка таму і называецца рамантыкай, што яна недасягальная. А калі чаго дасягнуў, дык гэтае дасягнутае становіцца нечым звычайным, будзённым, што пачынае засмоктваць цябе штодзённасцю, прывучае трываць усе нягоды прозы жыцця. І часта яна, гэтая празаічнасць, абломлівае крылы, тушыць вочы, робіць непаваротлівай душу, халоднай да чужога гора і нават да ўласнай радасці. А яму хацелася паднавіць душу, стрэсці з яе гарадскую драбязу пустаслоўных гаворак, ад якіх пасля не хацелася нават садзіцца за стол, каб нешта выліць на чысты ліст паперы: па сутнасці, нічога толкам ён аб тым горадзе і не даведаўся — вучоба, праца карэктарам. У горадзе людзі ўсё некуды бягуць, спяшаюцца, і раптам хто цябе локцем зачэпіць, дык і за гэта скажы яму вялікае «дзякуй», што не забыў напомніць аб сабе.

Стаяла сярэдзіна чэрвеня, самая клапатлівая пара на сяле: буяюць сады, цвіце бульба, пахне ўкропам, мёдам, сыраватым торфам, а адвячоркам — аерам, калі побач ёсць якое, хоць невялічкае, возера, якое людзі для зручнасці называюць больш ласкавей — азерца.

У Рудцы такое азерца было. Яшчэ калі сабіраўся сюды ехаць, дык Раман рашыў, што кожны ранак і вечар будзе купацца ў тым азерцы. У апошні час нешта здаюць нервы, і загартоўка цела ой як супакоіць іх! Ён узяў з сабой плаўкі, ласты, спінінг і дзве вудачкі,

пакуль што без вудзільнаў. Але тут арэшніку хопіць, ён выража сабе такія вудзільны, што пасля і ў горад іх не сорамна будзе забраць.

Ён узяў ручнік, мыла, зубную шчотку і подбегам падаўся на возера.

— Раман Патапавіч! — паклікала яго Кацярына Піліпаўна, калі Раман ужо быў амаль каля яе дома, бо ісці трэба было праз двор, пасля перайсці вуліцу і ўжо праз поплаў трапіш да таго возера.— Раман Патапавіч! — паўтарыла яна.— Пара і паснедаць!

— Нічога, Піліпаўна, я так рана не прывык снедаць, але калі трэба... Вось толькі збегаю на возера, крыху спаласнуся...

— Тут у нас адзін ляснічы жыў, дык таму ні дажджы, ні марозы не перашкаджалі — усё бегаў на возера, пакуль запаленне лёгкіх не схапіў. Ледзь урачы адхадзілі, а то мог бы і на той свет праз тую палонку трапіць. Але ж нічога, зараз лета, дзякаваць богу, костачка холаду просіць. Ідзі ды не абаўляйся, бо мне трэба на працу спяшацца: я ж яшчэ магазін прыбіраю. На якую другую работу сіл ужо маіх не хапае, а з венікам яшчэ варушуся сяк-так... Так што не абаўляйся вельмі, бо мне да васьмі гадзін трэба ўправіцца...

Раман зірнуў на гадзіннік: было без чвэрці сем! Вось як тут рана ўстаюць людзі.

— Адна нага тут, другая — там! — сказаў ён і, закінуўшы на плячо ручнік, трушком пабег да возера.

Возера пасля меліярацыі Палесся аслабела, звузілася, збяднела. Ніводная з канаў, што раней упадалі ў яго, не цурчала зараз сваёй халаднаватай вадой, якая цякла недзе з балот, куды вясною адпраўлялася на нераст рыба: вось тады браканьерам была раскоша — метровых шчупакоў асцямі выцягвалі з тых канаў, а некаторыя выстраламі з ружжаў глушылі такіх ляшчоў, якіх зараз і ў заалагічных музеях не пабачыш. А пасля на тую рыбу пайшоў мор: мачылі каноплі ў

возеры, рыба дагары жыватамі пачала ўсплываць напаверх. Нашто ўжо трывалы рак, а і той палез на лазовыя кусты, каб ўратавацца ад чалавечай напасці. Хадзі ды ў якую каробку сабірай іх, як з нізкіх дрэў яблыкі ці грушы. А зараз, відаць, і ярша за вялікае шчасце палічыш, калі на вудачку ўчэпіцца.

...Снедаў Раман сам: Кацярына Піліпаўна пабегла ў магазін. Яна будзе там ажно да поўдня, бо, акрамя ўборкі, трэба сёе-тое за зарплату падсабляць прадаўшчыцы: падаць з падсобкі крупы, цукар, усё, чым тут гандлююць. Так што думаць яму тут ніхто і не перашкаджаў. Толькі, калі адыходзіла, дык Піліпаўна сказала:

— Ты ўжо, Рома, тут сам паставіш у стол талерачкі, каб мухі не пладзіліся, а ў абед я іх памыю...

— Добра, добра, цётачка,— сказаў Раман, але тая яго не пачула, бо зараз ужо на вуліцы некаму крычала:

— За левую ляйчыну цягні, за левую! Усе калкі восямі паперашмульвалі, каб вам чэрці гэтак ногі ды рукі паперашмульвалі! У мяне няма каму платы тыя майстраваць, дык нібы знарок робяць, гіцлі!

— А тудою дарога каля вашага плота, дык каня і не выцягнеш з каляіны,— апраўдваўся з плачам нейкі хлапчук.

— Такі ж, як і ты, падшыванец, і ехаў проста на плот, каб людзям нашкодзіць...

Раман выглянуў у акно: цётка Кацярына ўзяла каня за вуздэчку, каб адцягнуць крыху ад плота, але той толькі галавой матануў і пайшоў сваёй дарогай.

«Трэба будзе ёй там слуп укапаць, дык аб'язджаць пачнуць той плот, не можа таго быць. А то і на самай справе — на пахілую вербу ўсе козы скачуць»,— падумаў Раман і вярнуўся да стала, каб даесці сняданак: засмажаную яечню, тоўчаную бульбу з маласольнымі агуркамі, ладную кружку малака.

«Ад гэтай яды пасля будзеш толькі цэлы дзень ваду папіваць,— падумаў Раман.— А вось пра цану, колькі трэба будзе плаціць за харчунак, і не дамовіўся? А-а, колькі скажа, столькі і заплачу. Усё роўна ў горадзе б за гэты час не столькі грошай разматаў, ды ў дабавак яшчэ і нічога не напісаў бы».

Яму ўсё думалася аб розных дробязях, толькі не аб Ніне, жонцы. Недзе ён у аднаго ці то чэшскага, ці то балгарскага спецыяліста па разводах вычытаў, што, калі муж з жонкай пасварыліся ды раз'ехаліся і на трэці дзень не засумавалі адно па адным, у іх адносінах завёўся мікроб нейкай хваробы, якая можа скончыцца разводам. Ён падлічыў: з таго часу, як ён з чаманчыкам выйшаў з кватэры, прайшло пяцьдзесят дзве гадзіны, да трох сутак засталося дваццаць гадзін — дзень і ноч і заўтра раніцай ён павінен засумаваць, ды так засумаваць, што, можа, пальюцца ясенінскія вершы, а не проза...

Але смутак усё ж падкрадваўся да душы: не-не ды і данясуцца недзе з маўклівай глыбіні яе словы:

— Кінь ты кіснуць у гэтай рэдакцыі! Ні ганарараў, ні славы! Ідзі на завод, павучыся з паўгода, будзеш мець тры сотні, і не трэба будзе табе паперу псаваць, каб звесці як канцы з канцамі... Дзеці падымаюцца на ногі, а ты як не меў той славы, дык і не будзеш яе мець... А есці трэба! Дзеці ж не вінаваты, што ты не Талстой! (Гэтае выслоўе яна ўжо аднойчы па тэлевізары пачула.)

А ён у сябе верыў, верыў у сваю зорку, якая павінна вось-вось узысці на літаратурным небасхіле!

Аднак не гэта было прычынай іх разладу, а нешта іншае. Але няхай пакуль усё будзе толькі ўнутры, пабачым, куды яно павернецца ў будучым? І каб не швэндацца цэлы месяц па горадзе, не выслухоўваць Ніліны прагнозы, ён і рашыў прыехаць сюды, каб напісаць аповесць аб сваім дзяцінстве і юнацтве.

Здавалася, сядзі ды ўсё ўспамінай, дзе што рабіў, дзе хадзіў, з кім сябраваў. Уставіш усё гэта ў нейкі сюжэцік, і будуць чытаць людзі ўсе ночы напралёт, асабліва тыя, хто толькі спрабуе свае крылы ў палёце.

Ён скончыў снедаць, сабраў усё са стала, памыў посуд і паставіў у шкапчык. Яму кінулася ў вочы на стале свежае пісьмо. Па почырку ён без памылкі пазнаў Зосьчыну руку. Прачытаць ці не? Звычайна, чужыя пісьмы не чытаюць, але тут... Зосьчына пісьмо? Раман азірнуўся, падышоў да акна, зірнуў праз яго на вуліцу — нідзе нікога. Ён дастаў з канверта пахучы лісток паперы, і ў яго моцна закалацілася сэрца: тут, ля гэтага стала, яны некалі рассталіся! Назаўсёды! Праўда, аднойчы ён яе быў спаткаў у лесе, калі прыязджаў да бацькоў і пайшоў па грыбы: яна ішла яму насустрач з кошыкам чырвонагаловікаў у руках, убачыла яго і расчырванелася. Яна ўжо тады раздалася ў стане, стала раскошнай, прываблівай жанчынай. Раман чуў, што яна недзе ў Карагандзе жыве зараз, развялася са сваім мужам, які, відаць, многа піў. Яна тады густа пачырванела, нібы не ведала ўрока, і ёй было сорамна і перад настаўнікам, і перад класам. Аслупянеў ад нечаканасці і Раман.

— Ну то дзяньдобры! — сказаў ён.

— Каму добры той дзень, а каму і не! — адказала яна і пайшла, не азіраючыся, не сказаўшы больш ніводнага слова. І ён тады засумаваў па ёй, моцна засумаваў.

І зараз гэтае пісьмо. На тым стале, ля якога ён абняў яе ў апошні раз пасля выпускнога балю. Не трэба было заходзіць у хату, а схавацца ад дажджу дзе пад паветкай ці яшчэ ў якім месцы. А так ён абняў яе за плечы і намацаў нешта цвёрдае:

— Што гэта ў цябе?

Яна адразу расплакалася: у яе быў бандаж пасля

цяжкай аперацыі, аб якім у класе ніхто не толькі не ведаў, але нават і не здагадваўся — на вёсцы трымаюць у самай глыбокай тайне нават самы маленькі недахоп у дзяўчыны-нявесты, каб гэта не пашкодзіла ёй, калі будзе да яе каторы сватацца. Раман ніколі нікому аб гэтым не гаварыў, але часам лавіў сябе на думцы: добра яна тады зрабіла, што адраклася ад яго сама. А пасля ўсё яе здароўе наладзілася, вунь якая красуня пазірае на яго з покуцця з вялікай фотакарткі!

Хоць і балюча сёння было яму браць гэты лісток, але ж перамагла цікаўнасць: прачытаў!

«А можа, ліст знарок цётка паклала навідавоку?» — з тайнай усмешкай падумаў Раман.

«Міленькая матуленька! — пісала Зоська.— Як ты напісала, што да нас у старую хатку на лета просіцца Раман, каб нешта там напісаць, прашу цябе: пашлі яму хутчэй пісьмо, няхай прыязджае! Ты ж ведаеш, у мяне зараз другі муж, але і той аказаўся непуцёвым: мала, што п'е, дык яшчэ і да кабет чужых хадзіць, адно срамоцце! На Рамана я не злуюся: я яго першая, як цяпер кажуць, адшыла і ўсё жыццё буду плакаць аб гэтым. Неяк тут у нас выступалі пісьменнікі з нашай роднай Беларусі. Я папытала ў іх пра Рамана. Вельмі і вельмі хвалілі, што такі таленавіты, але асабістага шчасця не мае. І мне ўсё больш і больш здаецца, што гэта ўсё з-за мяне: ён мяне, мама, любіў, як нікога больш не палюбіць. І, можа, ужо больш нікога і не любіў наогул. А адсюль і ўсё гора! Так што, калі ён прыедзе, ты мне адразу адбі тэлеграму. А як, падумай сама, каб не здагадаўся мой муж Валодзя. Бывай, мая матуленька! Ты толькі адзін чалавек на ўсім белым свеце, каму я магу паспавядацца сваім горам. Твая Зоська».

Раман адклаў убок пісьмо і тут жа ўбачыў квіток аб прыёме тэлеграмы. У вачах пацямнела. Ён ледзь не

ўпаў, але паспеў прысесці на табурэтку, ухапіўшыся рукамі за стол.

«Што мне зараз рабіць? — як маланкай працінала яго галаву гэтая калючая думка.— Тэлеграма паслана! Хутка тут будзе і сама Зоська! Цяпер гэта можна за лічаныя гадзіны зрабіць». Не, спаткацца з ёй ён не жадае! Навошта? Каб зноў развярэдзіць старыя раны? У яго цікавая жонка, дзве дачкі — адна ўжо ў інстытуце, другая — пакуль што малая, вучыцца яшчэ ў школе...»

Ён зірнуў на гадзіннік: да пачатку вялікага смутку васемнаццаць гадзін заставалася! Але нешта ўжо зараз пачало ў яго смактаць пад лыжачкай, нудзіцца без пары! Яму зараз здалося, што яго наважыліся адабраць ад Ніны, ад дачок і пасяліць недзе на неабжытым востраве...

«Што ж рабіць, што ж рабіць?» — мармытаў ён.

Палез у кішэню пінжака, дастаў адтуль нейкую паперку: о, божа, чысты бланк для тэлеграмы, які ён па рассеянасці засунуў у кішэню ў паштовым аддзяленні вакзала. Пабег у сваю хаціну, дастаў з футарала партатыўную пішучую машынку і адстукаў: «Мама захварэла тата прыязджай Света Таня».

Выразаў лязом дзве палоскі з надрукаваным тэкстам і прыляпіў на чысты бланк тэлеграмы. Добра, што хоць клей захапіў з сабой! Адрас надпісаў ад рукі, як гэта робяць на пошце. Сабраў усе свае рэчы і хацеў проста ісці на спадарожную машыну. Але пасля перадумаў — трэба сказаць цётцы Кацярыне...

Ён начапіў на дзверы замок і з усімі рэчамі рушыў да магазіна: там можа быць адразу і нейкая машына! Але як сказаць, хто прынёс тэлеграму цётцы, яна ж папытае пра гэта ў паштаркі! Скажу, што ў «раёнцы» атрымалі тэлеграму, а адтуль хлопцы прывезлі з нагодай на машыне. Паверыць!

Яго Кацярына Піліпаўна заўважыла яшчэ здалёк:

яна выбегла насустрач, радасна махаючы тэлеграмай:

— Зоська едзе ў госці, Рома!

Ён напусціў на сябе падроблены смутак, які адразу заўважыла Піліпаўна.

— Гора ў мяне, цётка,— сказаў Раман і працягнуў ёй тэлеграму.

Тая доўга разбірала друкаваныя літары тэлеграмы, а пасля сказала:

— А паштальёнка мне хоць бы адненькае слоўца закінула...

— Яна ж нічога і не ведала пра тэлеграму. Хлопцы мне яе з радакцыі «раёнкі» прывезлі на машыне. На рэдакцыю прыйшла тэлеграма...

— Дык вы адразу так і едзеце? — перайшоўшы чамусьці на «вы», спытала Кацярына Піліпаўна.

— Думаю, зараз. У райцэнтры якраз паспею на патрэбны мне аўтобус. Ну дык бывайце, цётка Кацярына! Неяк ужо, можа, другім летам выберуся да вас,— схлусіў Раман, каб абы-што сказаць на развітанне.

— Будзем чакаць з вялікай радасцю,— толькі і сказала яна.

У гэты час да магазіна пад'ехаў «газік», шафёр зайшоў у магазін купіць цыгарэт, і пасля разам з Раманам яны паехалі ў горад.

Раману сумна было развітвацца са сцежкамі свайго басаногага дзяцінства, але ж страх сустрэчы з Зоськай перамог яго. Яму сорамна было б глядзець ёй зараз у вочы за тую далёкую ганьбу, калі ён назаўсёды парваў са сваёй любімай дзяўчынай.

Няхай застаецца ўсё перажытае тут па-ранейшаму яго далёкім шчасцем, якое цяпер яму здавалася не мінулым, а нейкім будучым, да якога няма гэтак жа дарогі, ніякай дарогі, як і да мінулага... Яно толькі жыве ў яго душы, грэе пачуцці і выклікае смутак па чалавечым цяпле і дабрыні... І з гэтага смутку здольна нараджацца песня, шчырая і балючая!

Паўз самай дарогі клапатліва разлівалі сваю прыгажосць беленькія бярозкі, часам да колікаў у вачах зелянелі елачкі, успырхвала з прыдарожнага малінніку рознае птаства... І падалося Раману, што ён ужо ў другі раз у сваім жыцці па ўласнай волі ўцякае ад чалавечага шчасця, якое нараджаецца ад сутыкнення з першымі краявідамі, якія ты ўбачыў пры сваім з'яўленні на белы свет... Але так ужо пабудаваны чалавек: яго цягне ў невядомае!

Ён зараз паедзе шукаць спакою для душы недзе ў іншым месцы, дзе-небудзь у другім баку, дзе нічога не будзе напамінаць аб мінулым, а толькі перад вачыма будзе стаяць зарыва новай далячыні, да якой трэба дагукацца яму словам...

...Кацярына Піліпаўна пабегла на паштовае аддзяленне і яшчэ з парога сказала загадчыцы:

— Адбі, Верачка, Зосі: «Маці паправілася, не выязджай!»

— Добра! — сказала тая.— Семдзесят тры капейкі...

Пілiпаўна налічыла грошай і высыпала іх на талерачку, якая стаяла побач з Верынымі рукамі.

# Знак памяці

На старой дзічцы, якая нават самай лепшай вясной мела ўсяго сілы, каб ледзь-ледзь даць зеляніну аднаму ралу, якое таксама збіралася даўно памерці, быў прымацаваны жалезны крыж. Яго нечая клапатлівая рука штогод, з самай ранняй вясны, фарбавала ў зялёны колер, таму ён не пакрываўся ржой і здаваўся намнога мацнейшым за старую грушу.

Бабулі, калі праходзілі вуліцай паўз дзічкі, хрысціліся і маліліся на той крыж:

— О, госпадзі высокі! Пашлі вечны рай на небе вялікамучаніцы Агаце! Амінь!

Маладзейшыя, хто праз кніжкі ці ўласны розум дабраўся, што неба пустуе без святых духаў, спыняліся па традыцыі: хлопцы здымалі шапкі, а дзяўчаты прыкладвалі да грудзей далоні рук, выказваючы сваю павагу ці то крыжу, ці то старой дзічцы...

Абыякавых сярод вяскоўцаў да гэтай грушы з прыбітым крыжам не было.

...Пад вечар, калі сонца вось-вось сядзе за далёкі лес, нямецкі стараста Якуб Шостак, якога зараз называюць «пан Якубек», хадзіў ад хаты да хаты і наказваў гаспадыням:

— Падлогу ў хаце мый, заўтра гасцей чакай: немцы ў нашай вёсцы на пастой спыняцца. А яны — Еўропа, значыцца,— чысціню любяць! Дык каб падлога блішчэла, як люстэрка!

Шостак амаль два гады пасля трыццаць дзевятага года недзе туляўся, бо яго б Саветы прыбралі за верную службу пану Вайцахоўскаму. Якуб у пана лічыўся

нешта накшталт аканома, але больш выконваў абавязкі экзекутара. Калі, скажам, дзе чыя карова трапіць у панскі авёс ці бульбу, ён не чакаў прыезду паліцыі, а вучыў самога пана, як лепш пакараць злачынцу — гаспадара жывёлы:

— Мужыку зад часцей трэба дубцом падмаладжваць, дык і розум фасоністым стане!

Вінаватага зацягвалі куды-небудзь за панскую абору і добра там лупцавалі якім вужышчам. А штраф — само сабой: бізун толькі розуму на будучае дабаўляў грэшніку!

Так што, калі ў трыццаць дзевятым прагналі паноў, дык і падпанкі былі пазашываліся немаведама куды, каб і сонца не бачыць, бо цяпер яно было таксама савецкае.

Дзе ўвесь гэты час быў Якуб, ліха яго ведае, а вось калі пачалася вайна, ачуўся, разам з панам Вайцахоўскім на брычцы прыехаў у вёску.

Быў ён бабылём, але жаночага цела не цураўся, усе панскія парабчанкі, наймічкі не былі абыдзены ім бокам.

— Я вам Еўропу прывёў, быдла! — крычаў ён у першы ж дзень, добра выпіўшы за свой зварот.— Азадкі ад бізуна адвыклі, дык я іх зноў да яго прывучу! Цяпер ужо да нямецкага! А гэты агнём пячэ, наматайце сабе на вус, бальшавіцкія халуі!

— Ох, божачка, якая ж гэта трасца на нашу галаву звалілася? — войкалі жанкі.— Ну няхай гэта быў бы які немец, а то ж свой чорт — і гаворыць па-нашаму, і хлеб наш еў, а зверам звер... Воўк у параўнанні з ім — мілейшы кум ці сват! Нават немец у параўнанні з ім — маленькае ваўчанятка...

— Я вам зараз не Якуб! — крычаў ён.— Якуб, Якуб, не агораў свой зруб! Пан Якубек! Хай адно пачую ад каго, што будзе называць мяне неяк па-іншаму! Няхай тады на сябе крыўдуе! — І ён стукаў па ха-

лявах сваіх ботаў плёткай. Той самай плёткай, якой некалі «заганяў розум» мужыкам пры панскай Польшчы.

— Агата! — Стукаў ён ручкай плёткі ў акно Агаты Якімовіч, старой бабулі, якая была ў вёсцы і ўрачом, і папом, і мудрым дарадчыкам.— Чула, падлогу ў хаце трэба мыць — заўтра немцаў на пастой возьмеш! Дык каб насы не варочалі ад смуроду: Еўропа ж!

Агата выйшла з хаты, трымаючы на руках трохгадовую ўнучку Алесю, дачку сына, які пайшоў на манеўры ў Чырвоную Армію, ды тут нахапілася і вайна. Калі нашы адступалі, то яшчэ дамоў забег, сказаў Агаце і жонцы Хвядоры:

— Не плачце вельмі — не я адзін трапіў на вайну... Пакуль што адступаем, але пасля ўвапромся нагамі ў зямлю, спынім злыдня, лопне яго жоўць!

— Ой, божачка! — загаласіла Агата. А Хвядора толькі ўздрыгвала плячыма. І праз слёзы паўтарала ўсё адны і тыя ж словы:

— Беражы сябе, Сеня! Беражы сябе, Сеня!

Алеся нічога не разумела, але, калі мама і бабуля, пацалаваўшыся з татам, загаласілі наўзрыд, заплакала і яна:

— Мама, тлімай тату!

Пры гэтых словах дачкі Сеня заплакаў і сам. Ён узяў ад Хвядоры сабе на рукі Алесю, моцна прыгарнуў яе да грудзей у салдацкай гімнасцёрцы і гэтак нёс яе аж да самага канца вёскі, дзе быў прызначаны збор іхняй роты. Цалаваў Алесю і шаптаў:

— Сонейка ты маё ненагляднае! Пакідаю цябе і сам не ведаю, ці хутка зноў вазьму цябе на ручкі ды прыгарну да сэрца, маё ты немаўлятка?

— Аўняйс! І-ірна! А-агам а-рш!

Толькі гэтыя словы і запомніліся бабульцы, маме і Алесі. І яшчэ плач: амаль уся рота была з рэзервістаў з іхняй вёскі.

— Чырвонаармейка? — тыкнуўшы плёткай у бок Алесі, спытаў пан Якубек у Агаты.

— Унучка! Мая гэта ўнучка! — агрызнулася Агата.

— Не мог дзе ў кусты скруціць твой сынок? Цяпер бы, во, жыў, як людзі, а то ўжо недзе за Масквой прэе ў твані балотнай, ратуючы ад пагібелі бальшавікоў... Вялікіх жа грахоў не меў перад панамі, мог бы пры немцах і чын які прыдбаць... Мог бы і я ў свае намеснікі ўзяць... А так! Ну дык каб чыста было ў хаце, каб не чырванеў я перад немцамі! Сама павінна разумець: яны і мяне гатовы нюхаць, ці не нясе ад мяне бальшавіцкім смуродам. А пан Якубек лепшымі еўрапейскімі парфумамі пахне!

Агата стаяла зусім блізка ад пана Якубека, таму добра чула носам, як ад яго несла «парфумай» самагонкі.

— Налаўчышся немцам кланяцца ў патрэбны момант, вось і ласку будзеш мець! Яны любяць, каб іх паважалі! Жывая Еўропа, значыцца! Дык каб па-еўрапейску было чыста ў тваёй халупе, Агата, з торбай багатай!

— То, во ж, прыйдзе нявестка ды памые падлогу,— азвалася Агата.

— А дзе ж яна зараз? — пацікавіўся з тайным намерам пан Якубек.— Мусіць, гарыць нутро без Сенькі, га? Ну аб гэтым мы яшчэ паваркуем у патрэбны час, а зараз... Кароў, значыцца, Хвядора пасе?

Калі пан Якубек адышоўся ад Агаты, падцягваючы на левым рукаве белую павязку і падкінуўшы на правым плячы вінтоўку, тая паглядзела яму ўслед і ціха вылаялася:

— Каб цябе ўжо ў дамавіну абмылі, ваўкарэзіна! Панам боты лізаў, а цяпер немцам і зад будзеш языком лашчыць! Цьфу!

— Дзядзё! — залепятала Алеся.

— Не дзядзё, а воўк! Воўк, Алеська! Воўк: а-аву-у!

— Воўк! Воўк! — заляскала ў далонькі дзяўчынка і прыціснулася моцна да бабулькі шчочкай.— Я баюся!

— Хай ён і яго кузла чарцей рагатых баяцца! — сплюнула Агата і вярнулася да сяней. Яна паставіла Алесю на зямлю, узяла драўлянае вядро і пайшла да калодзезя, каб зачэрпнуць вады ды пачаць мыць тую падлогу, хоць зараз толькі серада, а мылі яны яе звычайна па суботах.

— Баба! Баба! — лепятала Алеся.— А тата мне дудачку злёбіць?

— Зробіць, зробіць, мая ты дзяціначка, няхай толькі немцаў пражане... І дудачка тады ў цябе будзе, і лялю табе тата з сасновай кары выража...

— І лялю! І лялю! — радавалася Алеся.

...Немцы ў Дуброўку прыехалі на другі дзень з самага ранку. Пан Якубек сустрэў даўгалыгага афіцэра, у якога звешваўся з левага пляча ягоны мундзір так, нібыта ў кішэню з таго боку было насыпана не меней чым паўпуда пяску, з непадробнай радасцю. Стараста быў апрануты на еўрапейскі манер: у чорным гарнітуры, у капелюшы-кацялку, з кіёчкам пад пахай.

— Вёска з вялікай радасцю прымае дарагіх гасцей, пан афіцэр! — схіліўся да зямлі перад даўгалыгім стараста.— Сам пастараўся!

Афіцэр не слухаў пана Якубека: ён ляснуў пальчаткай аб пальчатку, рэзка пайшоў наперад міма старасты.

— Яволь! — пралепятаў стараста і, падняўшы капялюш над галавой, паплёўся за немцам, лісліва шчабечучы на хаду:

— Для вас, пан афіцэр, асаблівую свяцёлку...

Але той не слухаў. Пан Якубек толькі зараз успомніў, што не прадугледзеў учора, да каго б паставіць на пастой нямецкае начальства. Яму нават здалося, што Даўгалыгі здагадаўся пра гэтую прамашку па яго вачах і зараз зусім незадаволены.

«Да каго ж яго пасяліць? — пакутліва думаў ён.— Здаецца, лепш за ўсё да Агаты: хата вялікая, чыстая, ды і... Калі што — Хвядора пад бокам будзе! Хі-хі! Калі не пагрэбуе пан афіцэр?»

У Агаты і на самай справе хата вялікая, як абора, бо не разгароджана ўсярэдзіне на пакоі. А чысціня ў ёй была заўсёды! Бо да Агаты ўсякі раз звярталіся людзі: адных родаў яна прыняла — не пералічыць! А то каго зваліць у ложак якая хвароба, таксама да яе — пашэпча, дасць якога ўзвару травянога, дымком абдыміць ды, глядзіш, і на ногі паставіць небараку! Так што амаль кожны божы дзень у хаце не зачыняліся дзверы — нехта свежы забяжыць да яе па якой патрэбе, дык не будзеш жа чалавека гарой смецця ў парозе сустракаць! Наконт гэтага быў у яе парадак! Ды і сям'і вялікай ніколі не было: яна, муж, пасля сын Сеня. Муж памёр яшчэ пры панах — падарваў жывот, калі вазіў бярвенні на новую абору пану Вайцахоўскаму.

А Сеня — фарсун з дзяцінства, лічы, з самай калыскі: бывала, як апранецца на якое свята, пан з зайздрасцю пакосіць вока ў яго бок, не тое што які лапцюжнік-мужык! І Хвядору ўзяў сабе — прыгажуня з прыгажунь, хоць і не на грашах, не на золаце дома спала!

— Нічога, маці ёй сваё варажбіцтва перадасць, не прападзём! — часам пад чарку адкрываўся Сеня.— А то возьмеш якую карову з-за багацця, дык пасля ўсё жыццё будзеш бугаём раз'ятраным вакол яе бегаць! А мая Хвядора — анёл, толькі адных крылаў за спіной і не хапае!

— Дай ёй яшчэ крылы, дык тады ты яе так і пабачыш — фюіць! — і паляціць дзе да каго другога ў гняздзечка,— жартаваў часам каторы з Сеневых сяброў.

— Ад мяне не паляціць, маці зеллем такім да мя-

не прызяліла-прысушыла, што хіба з жывым адарвеш!

— Хай адно які панок пальчыкам з залатым пярсцёнкам паківае — пастромкі парве!

— Ну давай аб чым іншым гаварыць,— перабіваў Сеня таго, хто хацеў жыўцом адарваць Хвядору.

— Душа ў пяткі палезла, а-а?

Немцы бегалі ад хаты да хаты, нешта невядомае для вяскоўцаў гергеталі: іх разумеў толькі пан Якубек, ды і тое — з пятага на дзесятае.

Афіцэр прайшоўся з канца ў канец вёскі, павярнуўся да пана Якубека і спытаў па-нямецку:

— Дзе будзе мая рэзідэнцыя?

Пан Якубек залыпаў вачыма, азірнуўся, залепятаў:

— Вы будзеце, пан афіцэр, жыць у Агаты. Праўда, у яе сын у Чырвонай Арміі...

— Бальшавік? — надзьмуўся, як той індык пана Вайцахоўскага, немец.— Пайшоў нас страляй? Ха-хаха! Яго даўно... капут!

Пан Якубек вылупіў вочы: немец разумеў па-руску прыкладна гэтак, як ён — па-нямецку. А то, мажа, і лепш! Так што тут трымаць трэба вуха востра. І язык з-за зубоў надта без пільнай патрэбы не высалопваць, каб чаго лішняга на сваю скуру не нагаварыць!

А тым часам па гародах кудахталі куры, недзе заквічаў падсвінак: немцы пачыналі гаспадарыць!

Пан Якубек павёў афіцэра, які часта падкідваў сваё левае плячо, нібыта нёс на ім бервяно ці мех бульбы, да Агаты. За імі плёўся маладзенькі немчык, цяжка згінаючыся ад двух чамаданаў. Салдацік скасавурыўся, паглядзеў на сваё начальства, калі да яго падбег пан Якубек і ўшчаперыўся аберуч за адзін з чамаданаў: даўгалыгі матнуў галавой, сцепануўшы плячыма, адначасова ўдарыўшы пальчаткай аб пальчатку,

што значыла: аддай, хай гэты халуй крыху пападрываецца!

— Тут вам будзе добжа, пшэпроша, пане! — забыўшыся, каму зараз служыць — польскаму пану Вайцахоўскаму ці немцу, сказаў на ламанай польскай мове пан Якубек.

Даўгалыгі, які цяпер напамінаў яшчэ і тэлефонны слуп з вушамі-кубачкамі, на які нехта наспех з размаху накінуў форменную шапку, паглядзеў на яго вельмі крыва, але нічога не сказаў. Аднак гэты позірк скалануў усё нутро пана Якубека: па вопыце ён ведаў, што такі маўклівы пагляд гаспадара нічога добрага не абяцае! І ён прыціх, моўчкі нёс цяжкі чамадан, перавязаны двума рамянямі.

— Прашу, пан начальнік, заходзьце, вельмі буду рада! — падроблена-ліслівa запрасіла ў хату даўгалыгага афіцэра Агата.

Яна адчыніла дзверы ў сенцы і сама адступілася ўбок — дзверы ў хату былі адчынены раней. Агата і зараз не расставалася з унучкай Алесяй — трымала яе ля грудзей, адчуваючы ўсім сваім целам, як часта білася з перапуду сэрцайка ўнучкі.

Афіцэр нахіліўся ў парозе, баючыся, каб не зачапіцца сваёй вялізнай гусаковай шапкай за касяк дзвярэй, але яны былі высокія, ён мог бы прайсці і не згінаючыся.

Некаторы час афіцэр пастаяў: са двара не так у цемнаце вельмі і разбярэшся, што дзе стаіць ці ляжыць. Пасля падышоў да покуцця: там вісеў вобраз распятага Хрыста і святога Георгія, які з вогненнага каня пранізваў пікай рыжую гадзюку.

— Гут! — азваўся немец і падышоў да абразоў, пад якімі вісела рамка з фотаздымкамі: муж Агаты ў форме польскага жаўнера і Сеня... у форме савецкага пехацінца. Гэты здымак ён прыслаў усяго за дзень да вайны, з манеўраў.

— Убраль! — закрычаў Даўгалыгі, тыкаючы пальцам у фота Сені.— Сын з бацькам ваяваль, да? Оха-ха! Рускі ест швайнэ! Сам на свой вярхом да магіль ехаль!

— Агата! — павярнуўся пан Якубек да гаспадыні.— Што гэта? Сваім чырванапузым адшчапенцам пана афіцэра страшыць?

— Гэта сынок, сынок мой! — заплакала Агата і памкнулася да покуцця, каб зняць са сцяны рамку з фотаздымкамі.

— Вам ён чырвонаармеец, вораг, а мне — сынок, мая кроў, маё сонейка ў хаце! — гаварыла праз слёзы яна.

Але яе папярэдзіў пан Якубек: ён падскочыў да рамкі, схапіў Сеневу фотакартку, якая не была яшчэ нават засаджана пад шкло, парваў яе на дробныя кавалачкі і ўкінуў у печ.

— Малядзец! — паляпаў Даўгалыгі пальчаткай пана Якубека па плячы. Той лісліва нахіліўся, зграб з галавы капялюш-кацялок і буркнуў:

— Лічу за шчасце! Лічу за шчасце, пан афіцэр!

Агата ледзь-ледзь стрымлівала сябе, каб не плюнуць яму ў яго ліслівыя зекры.

Праз момант у хату ўбег фельдфебель: ён спытаў, куды што паставіць-размясціць пану афіцэру — паходны ложак, стол, крэслы, чамаданы.

Пак Якубек паклікаў у сенцы Агату, якая стаяла пераляканая, знямелая, аслабелая, баючыся, каб хоць не ўпасці на дзяціну.

— Еўропа, значыцца! — сказаў ён.— Дык ты ўжо некуды перасяліся, на дварэ пакуль цёпла, а там будзе бачна... А дзе ж Хвядора?

Агата нічога не сказала, толькі паглядзела доўгім-доўгім позіркам на гэтую панскую гніду, якая так выгінаецца перад чужынцамі, што ўсю вёску са свету звёў бы, адно б за гэта яго паляпалі па плячы паль-

чаткай... Пасля сказала, калі прыйшла ў прытомнасць ад парванай Сеневай картачкі:

— Можа, пакуль у адрыне пажывём...

— Ось, ось, у адрыне! Чаго ж будзе пуставаць такая будыніна? Немца туды не паселіш — Еўропа! А мы і ў куратніку — хе-хе! — можам перакачацца ноч! Не гордыя ж, не паны, каб перабіраць сваёй пасцеллю! — як тая сарока сакатаў пан Якубек. А потым зусім ціха.— Агата! Не будзь дурной — дагаджай афіцэру чым можаш, у будучым спатрэбіцца! Бальшавікоў прагналі, а нам жыць трэба... Калі будзеш да яго з ласкай, дык я потым, як будзе ад'язджаць, шапну пану афіцэру, каб табе даведку такую чыркануў — хе-хе! — што ты, таго, добра іх прымала... А гэта некалі — хе-хе! — спатрэбіцца! Як тая зорка з неба ў твой хвартух упадзе...

Агаце хацелася плюнуць проста ў вочы гэтаму прайдзісвету, але... Усё асела цяжкім болем на дно душы.

Яны яшчэ ўчора перанеслі з Хвядорай сёе-тое ў хлеў, так што зварыць якое варыва можна будзе і на двары, а паначуюць яны з Алесяй і на саломцы ў адрыне.

Хвядора пайшла на хутар да маці, там і прабудзе датуль, пакуль немцы не з'едуць, бо пан Якубек прагаварыўся, што яны ў сяле пракалоцяцца тыдзень-два, а там пададуцца далей, на ўсход. Так што два тыдні не вельмі цяжка будзе і прасядзець на хутары, далей ад прагнага вока гэтых разбэшчаных фашыстаў. Агата ўправіцца сама і з Алесяй, і з каровай, бо свінню забілі яшчэ зімой, думалі на лета прыдбаць якое парасятка, а тут вунь як усё павярнулася!

У гародчыку стаяла старая груша-дзічка: калі каторы год уродзяць грушкі, дык Агата назбірае іх столькі, што напоўніць імі вялізны альховы кадаўб у склепе — пасля ў якое свята ці і проста ў божую нядзельку

ля гэтага кадаўба збіралася паўвёскі і дзяцей, і дарослых. Выбіралі гнілкі, якія былі салодкія, як той мёд, у роце раставалі самі...

— Ешце, ешце, мае вы галубочкі! — падбадзёрвала Агата, сама дапамагаючы маленькім дзецям выбіраць смачнейшыя грушкі.

Цяпер пад гэтай грушай дыміла паходная нямецкая кухня, ля якой завіхаліся ажно трое немцаў: пажылы, з барадаўкай на верхняй губе, у белым халаце і каўпаку на галаве — кашавар, і два маладзейшыя — на іх долю выпадала рыхтаваць прадукты і дровы ды мыць катлы.

Афіцэру варыў той, што нёс чамаданы, асобна: праз якія паўгадзіны з коміна над хатай у ранішняе неба ўзвіўся дымок і па двары разнёсся смачны пах смажанага сала.

Малады немчык, што прыслужваў за Даўгалыгім, падышоў да Агаты: ашчэрыўшы зубы, ён пастукаў пазногцем пальца правай рукі па зубах:

— Ко-ка! Яйкі, матка!

Агата замахала рукой:

— Разумею, пан немец, разумею!

— Гут, гут! — яшчэ больш ашчэрыўся ў нейкай дзікай усмешцы той.

Агата паставіла Алесю на зямлю, а сама пайшла недзе ў адрыну.

«Няхай сабе і немчура, а есці кожнаму хочацца,— думала яна.— Гэты ж немчык таксама недзе мае сваю маці, а калі яго прыгналі сюды, дык... Не па сваёй волі і ён сюды прыбег, і яго ж нехта сілай адарваў ад роднай матулі ды прыгнаў сюды...»

Агата ніколі за сваё жыццё не пажадала нікому зла: от, кепскае слова, бывала, скажа каму, але тут жа і адыдзе яе сэрца, забудзе пра ганьбу. Ды і шаптуха з яе такая, што адзін смех: захварэла некалі яе суседка Тэкля, ляжыць пад абразамі, склаўшы рукі на

грудзях, паміраць сабралася. Зайшла да яе Агата, убачыла гэтыя дзівосы Тэклі ды і кажа:

— А ты ж, гультайка, яшчэ лёну цэлы загон ля Лысай гары не дапалола, а ўжо на неба сабралася ўцякаць? Хто, Сідар за цябе даполе? Ці, можа, найме каго? А грошай ты для таго найму пакінула, га? Не, кажаш?

Тэкля павярнулася да Агаты тварам, расплюшчыла вочы і заўсміхалася:

— От як здушыла грудзі, дык і паратунку ніякага няма... Вечнай цемнаты вочы просяць...

— А дай-тка я пашапчу. Мяне навучыў Панас, дай яму бог шчасця на небе! Дык ён казаў, што і ад сухотаў памагае, і ад задышкі тое яго шаптанне...

Гэты самы Панас з пакручанымі нагамі, з крывым ротам, кожную зіму заяўляўся ў Дуброўку, каб дачакацца дзе ў каго ў цяпле вясны. Яго ўсе баяліся, а Агата, як толькі даведвалася, што зноў Панас дыбаў у іх вёску, сама бегала ды шукала яго:

— Завітай і да нас, Панаска, зрабі Агаце ласку! Хата вялікая, ды і лыжка твая не вычарпае столькі з маёй міскі, каб голад у хату завітаў...

Так Панас кожны раз і асядаў у яе аж да вясны: паходзіць па хатах, назбірае ў торбу таго-сяго ды і зноў да Агаты. Пагаворвалі, што ён яшчэ і шэпча: вядома, бог перад ім вінаваты, што калекай на свет белы выпусціў, дык хай хоць другім людзям дабро робіць! Праўда, ён ніколі нікому не шаптаў, раптам што калі каму параіць, як якую хваробу лепш з сярэдзіны вытурыць.

Пашаптала нешта тады Агата над Тэкляй, перахрысцілася ды і кажа:

— Ну ўставай ды бяжы лён утравелы ратаваць!

Тая пакрактала, пакрактала ды і ўстала:

— Ох, дзіва мая, адразу ў грудзях палегчала...

— А то як жа? Гультая і бог на небе не згодзіцца

карміць за будзь здароў, не кажучы ўжо пра вопратку... Бо і на небе будзеш галяком круціцца сярод анёлаў, каб каторы за зад ушчыпнуў святымі пальчыкамі...

З таго часу Агата і стала дуброўскім лекарам: налаўчылася роды прымаць, настоек з розных траў нарабіла, п'яўкі ўсе ў карыціне за сялом павылоўлівала ды так і лячыла пакрысе сяго-таго.

Але больш дабром, ласкай ставіла на ногі хворага, чым самаробным лякарствам ды шаптаннем. Да добрай душы і бяда не так хутка прыстае, уцякае, з сораму ўцякае...

А калі хто часам крыўдзіў роднае дзіця, Агата заўсёды дакарала:

— За гэта, ягамосцю, з цябе сам бог нагавічкі не палянуецца сцягнуць ды крапівой пачаставаць на тым свеце! Бессаромнік ты!

І хай сабе які злы быў чалавек, а слухаўся Агаты, вінавата апускаў вочы і пераставаў здзекавацца з дзіцяці.

А Агата павучала:

— Калі бог ужо стварыў чалавека, падвязаў яго вяроўкай пад рукі, каб апусціць з неба на зямлю, дык пачасаў сабе калматую галаву, расправіў бараду і буркнуў:

— Што гэта я яшчэ забыў яму сказаць на дарогу? Ага! Дабра малавата, мусіць, у яго душу пасяліў? Ён там пачне пладзіцца, дык трэба будзе і дабро сваё новай душы ад сябе адрываць...

Але калі бог задумаўся, як яшчэ дадаць чалавеку таго дабра, дык вяроўка ненарокам вырвалася з яго рук, і чалавек паляцеў на зямлю. З перапуду бог яму наўздагон як закрычыць:

— Будзь добрым! Усіх любі-і!

А ў чалавека ў вушах у гэты момант быў такі свіст

ветру, што ён і не расслухаў як трэба. І здалося яму, што бог крычаў:

— Будзь кобрай! Усіх губі-і!

І толькі калі чалавеку на зямлі стала сумна, бо яго дзеці адразу ж уцякалі ад яго, калі станавіліся на ногі, тады яму і дайшло, што бог крычаў: будзь не кобрай, а будзь добрым! Ды не губі ўсіх, а любі...

І гарнуліся людзі да Агаты, верылі, што яе дабрыня ідзе ад самога бога, калі яна можа і хвораму дапамагчы, і здароваму паспачуваць.

А гэтыя немцы? І іхняга ж прашчура бог з неба апусціў, дык хіба яны не людзі, як і мы? Ну, вайна, салдат салдата забівае, тут няма нічога дзіўнага, так заўжды было, а каб там дзяцей ці старых забіваць? Гэта вялікі грэх! Ды і той, не Даўгалыгі, другі, праўда, яшчэ зусім малады немчык, тройчы няўзнак перахрысціўся на вобраз, калі зайшоў у хату ды паставіў на падлогу панскі багаж. Значыцца, мае ў сэрцы бога, дык такога чалавека няма чаго вельмі і баяцца. А ваююць немцы з бальшавікамі: можа, калі гандлявалі адзін з другім, дык каторы каторага і абдурыў,— хто цяпер патрапіць гэта разабраць? От дрэнна толькі, што Сеню ў войска забралі!

Праз колькі часу Агата несла ў хвартуху дзесяткі са два курыных яек.

— Вось вазьміце, пан немец! — сказала яна і працягнула хвартух так, каб повар змог узяць тыя яйкі. Але ён нешта буркнуў і паказаў Агаце, каб яна сама занесла яйкі ў хату — няма ўва што яму іх пакласці.

Калі Агата зайшла ў пакой, дык убачыла, што даўгалыгі афіцэр сядзеў ля акна і, выцягнуўшы шыю, нешта ўпарта ўглядаўся туды, дзе дыміла пад грушай паходная кухня, толькі ледзь-ледзь бачная з-за склепа. Зірнула ад печы туды і Агата: яна заўважыла, што Алеся падышла да кашавара, той пагладзіў яе па галоўцы і, дастаўшы на нажы кавалачак мяса з катла,

падзьмухаў на яго і працягнуў дзяўчынцы. У Агаты нешта пенькнула ўнутры, як напятая струна: каб хоць не атруціў той немчура ўнучку!

Алеся спярша не хацела браць ад немца той яго ласунак, але потым працягнула ручку, узяла, пацягнула да ратка. Даўгалыгі ўсхапіўся з-за стала, на якім да гэтага разглядаў цяжкі крыж, што Сеня дастаў недзе ў горадзе, каб пасля ўмураваць у бетонны слупок і паставіць яго на магіле бацькі, бо драўляны крыж амаль ужо згніў. Немец думаў, што крыж, пэўна, з чыстага золата, бо, маўляў, рускія недарэкі ні ў чым не разбіраюцца: дзе гной, а дзе і золата! Таму ён у некалькіх месцах пашкрабаў крыж ножыкам, але той быў чыгунны.

Агата падбегла да стала, схапіла з яго крыж і хуценька схавала пад хвартух так, што гэтага не заўважыў і немец-повар, выбегла на вуліцу.

Афіцэр на хаду выхапіў з кабуры рэвальвер, лаячыся па-нямецку на ўсю вуліцу. Кашавар выцягнуўся ад страху ў струнку і моўчкі слухаў яго лаянку. Агата не разумела, аб чым крычаў немец, аднак яна была ўпэўнена, што ён выгаворвае кашавару за тое, што той даў кавалачак мяса Алесі. Яна не ведала, ці то бегчы забраць унучку, якая зусім аслупянела ад гэтай лаянкі, ці перачакаць, пакуль перастане лаяцца Даўгалыгі.

— Казаў, дагаджай, Агата, не лянуйся, пасля як з неба ўпадзе падзяка, не паслухала! — залепятаў недзе ззаду пан Якубек. І адкуль толькі яго чэрці прынеслі?

— Вон, хрыстапрадавец! — закрычала на яго Агата.

— Ах, хрыстапрадавец? Я — Хрыста прадаў? Немцам, значыцца, прадаў?

Ён кінуўся да афіцэра і, пасінеўшы ад злосці, зашыкаў:

— Гер афіцэр! Пан афіцэр! Гэты медхен, гэты кляйн — дачка таго чырвонаармейца, што я ў печ картачку ўкінуў!

Даўгалыгі павярнуўся тварам да пана Якубека: Агата ўбачыла яго налітыя крывёй вочы, збялелы ад гневу твар, перакошаны рот, левае плячо пачало паднімаць на сабе нябачнае бервяно, правая рука калацілася ад рэвальвера, з якім ён падбег да кашавара — тыцкаў яму ў рукі зброю і, паказваючы пальцам на змярцвелую Алесю, загадаў:

— Бальшавіцкіх байструкоў карміць ты сюды праз усю Еўропу ішоў? Так? Страляй!

Кашавар маўчаў. Маўчалі і два астатнія немцы, якія дапамагалі на кухні. З'явілася некалькі пажылых і маладых салдатаў за плотам. Даўгалыгі азірнуўся яшчэ раз: яму зрабілася не па сабе — што скажуць яго падначаленыя, якіх ён і дзень, і ноч вучыў забіваць рускіх, калі ён толькі пакрычыць-пакрычыць і даруе?

Яго раптам ускаланула нейкая дзікая сіла.

— Шысэн! Шы-ысэн! — зароў ён нечалавечым голасам.

У гэты час Агата куляй падляцела да немца і з усяе сілы крыжам урэзала яму па лысай галаве, бо ён быў у гэты час без шапкі, якую забыў у хаце на стале. Пан Якубек кінуўся да Агаты, але ў гэты момант раздаўся выстрал: стрэльнуў кашавар з рэвальвера Даўгалыгага, які ад Агацінага ўдару з акрываўленай галавой паваліўся на дол. Побач забарабаніў нагамі па зямлі і пан Якубек: яму куля ўгадзіла якраз у грудзі, вырваўшы ззаду ашмотак з яго шыкоўнага «еўрапейскага» пінжака. Недалёка адкаціўся і капялюш-кацялок, а кіёк так і застаўся заціснуты ў яго руцэ.

На стрэл набеглі немцы, абкружылі з усіх бакоў кухню, трымаючы напагатоў зброю.

Над Даўгалыгім схіліўся немец у акулярах, відаць, урач ці фельчар. Але яго, нерухомага, хутка панеслі ў хату. Адтуль ужо на другі дзень вынеслі наперад нагамі.

Агата ўхапіла на рукі Алесю. Яна не плакала. Старой набожнай бабулі хацелася душыць гэтых гадаў, біць іх па галовах святым крыжам, але яе пасля падвялі да грушы, сабраўшы перш жыхароў з усяе вёскі.

Людзі маўчалі ад вялікага страху. Толькі нехта адзін парушыў цішыню:

— Мухі ж ніколі не пакрыўдзіла!

Потым азваўся хтось яшчэ:

— І другім тое ж наказвала: любіце адзін аднаго — і вас бог усіх палюбіць!

— Святым крыжам забіла!

— Людзі! Душыце гэтых гадаў, інакш яны вас падушаць! — толькі і паспела пракрычаць Агата.

Ёй зашмаргнулі на шыі вяроўку: яна ніяк не выпускала з рук Алесю, якая зусім знерухомела ад страху, сумна пазіраючы на чужых людзей, прыціснуўшыся да бабулі і нічога не разумеючы.

— Дзіця пашкадуйце, ірады! — закрычала адразу некалькі чалавек з натоўпу. Але гэтыя галасы заглушыла аўтаматная чарга.

Вяроўку перакінулі цераз галіну грушы і падвялі да яе таго кашавара, які страляў у пана Якубека. Даюць яму ў рукі вяроўку, каб падцягнуў да галіны за шыю Агату. Але той схаваў рукі за спіну. Тады за вяроўку ўзяўся фельдфебель і два перапуджаныя маладыя салдаты, што дапамагалі на кухні кашавару і якіх зараз акружылі некалькі аўтаматчыкаў: яны падцягнулі за шыю да галіны Агату і патрымалі, пакуль яна не перастала біцца нагамі і рукамі. Толькі тады і выпала на зямлю з яе рук Алеся. Затым фельдфебель зрабіў два выстралы: адзін — у Алесю, другі — у кашавара.

У гэты час, расштурхоўваючы рукамі натоўп людзей, да грушы прабіралася анямелая Хвядора. Яе ўхапілі некалькі пар рук, не пускаючы туды, дзе яе чакала таксама немінучая смерць.

— Не ідзі! На лезь сама ў пятлю! Трымайце яе, людзі, бо звядуць са свету, ненажэрныя ірады, і яе! — зашапталі кабеты.

Хвядора ўпала ў непрытомнасці на зямлю, яе падхапілі на рукі і хацелі аднесці да каго ў двор, каб даць вады... Але нікога зараз немцы нікуды не адпускалі з гэтага пекла, якое ж самі і ўтварылі на грэшнай зямлі.

Жанкі абступілі непрытомную і зрабілі так, каб яна прыйшла ў прытомнасць без пабочнага мужчынскага вока...

Агата вісела на грушы да таго дня, пакуль немцы не пайшлі з іх вёскі. Хату яе яны падпалілі.

А пасля вайны і з'явіўся на грушы той цяжкі крыж, які нехта штогод вясною фарбуе ў зялёны колер. І дагэтуль усе, хто праходзіць паўз гэтую старуюстарую дзічку, кланяюцца добрай бабулі Агаце, якая некалі першай сустракала ўсіх, хто нараджаўся пры ёй на белы свет, і лячыла, як магла, каб дачасна не пакідалі яго...

# Стрэл на світанні

Пані Ядвіга яшчэ маладая жанчына, таму яе цела прагне фізічнай напругі, руху, каб адчуваць сябе больш здаравейшым, прыстойным і не даваць месца раўнадушшу і цнатлівай абыякавасці да ўсяго прыгожага на ўсім свеце, якім ёй уяўляўся яе родны хутар. Муж яе пан Янэк трапіў у нямецкі палон з Войска Польскага, і цяпер яна пра яго нічога не ведае, бо зараз яе хутар знаходзіцца пад бальшавікамі, а гэта значыць — яна жыве за мяжой, хоць і жыве на тым самым хутары, на якім адышлі ў невядомасць, у вечнасць яе дзяды, бацькі...

Пані Ядвіга вялікім багаццем ніколі не валодала і разам з Янакам, а цяпер у яе тым больш яго няма, бо ў верасні трыццаць дзевятага лішняе, на думку бальшавікоў, у яе рэквізавалі: аднаго каня, дзве каровы, тры авечкі і выязную брычку, пакінуўшы ёй каня, карову яшчэ з польскім цяляткам і сякі-такі воз, каб было на чым прывезці дамоў з лесу дроў, навазіць на поле гною, наказаўшы пры гэтым не распускаць вельмі свой язык супраць новай улады.

Пані Ядвіга паспрабавала сама (бо цяпер наймаць парабкаў было забаронена) узяцца за касу ды плуг, але хутка кінула гэты занятак, палічыўшы, што яго стварыў пан Езус не для яе, жаночых, рук. Яна схадзіла ў часовы камітэт, сказала, каб забралі ў яе зямлю і падзялілі паміж тымі, хто мае дужыя рукі, але не мае да чаго іх прыкласці.

Так убаку ад яе даволі шыкоўнага дома зляпіў сякую-такую хаціну Кандрат Гуль, якога перасялілі

сюды Саветы з берага Буга, бо там якраз прайшла дзяржаўная граніца, а гэта...

Нельга сказаць, каб пані Ядвіга надта ветліва спаткала свайго новага суседа, але і ганьбу сваю яму не выказвала, жывучы па прынцыпе: ты мяне бачыш, а я цябе — не!

У Кандрата было, разам з ім самім, ажно чатыры едакі, але не было каня, каб іх хоць сяк-так карміць, калі не салам з маслам, дык няхай бы ўжо хоць хлеба бачылі даволі тыя раты! Жонка яшчэ, як і ён сам, магла і на хлебе з вадой перабівацца, а дзецям, тым няма ніякай справы да таго, што Кандрат і працуе, і святкуе ў латаным-пералатаным зрэб'і ды большую частку года басанож зямлю топча, ім налі конаўку малачка і хлебца мякчэйшага падай, бо крыку-плачу не абярэшся... Вось ён неяк і кажа сваёй жонцы:

— Паслухай-ка сюды, Алена, што я надумаў сваёй дурной галавой...

Алена — жанчына больш памяркоўная, разважлівая, яна ведае цану ўсялякай справе лепш, чым Кандрат, таму да яго розных прапаноў адносіцца вельмі рызыкоўна, бо ён скажа гладка, а зробіць... Адным словам, даверу вялікага ў яе да мужа не было.

Захадзіўся быў неяк Кандрат балотца на хутары асушыць, каб крыху ворыва дабавіць, дык нават пані Ядвіга смяялася:

— Вы, пан Кандрат, толькі лішняй сюды вады напусціце з наваколля, калі накапаеце канаў, бо няма нікуды ніякага сцёку з таго балота!

Але Кандрат, што стары вол: запрэглі шыю ў ярмо, трэба цягнуць хоць барану, хоць плуг!

І смяхоцця ж пасля было, калі і на самай справе Кандрат пракапаў адну канаву, каб пусціць ваду цераз невялічкі сасновы барок у нічыйнае балота! Ох і пабегла тады вада ў адваротным кірунку, ледзь спыніў!

— Дык што ты там новае надумаў? — хітравата

ўсміхаючыся, пытае Алена.— Мажа, будзеш барок чужы карчаваць?

— Кінь ты кпіць! — узлаваўся Кандрат.— Табе ўсё хіханькі ды хаханькі, а што дзеці без малака пухнуць, цябе гэты клопат за сто вёрст мінае.

— Дык, мажа, тваю сучку пабягу даіць?

Гэта ўжо было самай вялікай абразай для Кандрата! Бо ён ведаў, што жонка заўсёды смяялася з яго, калі гаварыла пра рабую сучку Аўдоццю. Калі пераязджалі сюды, дык Кандрат аддаў нейкаму сабакару ажно пуд грэчкі за яе, бо хацеў, каб і на яго хутары быў сабака, каб было здалёку чуваць, у якім баку гаспадарыць ён, Кандрат Гуль!

Але пакольні той сучцы не было чаго пільнаваць, дык і яна свой галодны рот далучыла да сухой Кандратавай скарынкі, не надта клапоцячыся аб тым, каб падзяліць свой полудзень, скажам, ці вячэру на два разы.

— Лепш якога б парсюка карміў, дык бы некалі скваркай хоць бы ў гаршку капусту засмуродзіў, а то ж, людочкі, гадуе пустабрэха, адно пані Ядвігу па начах палохае! А калі ж яшчэ ашчэніцца, што тады будзеш рабіць?

— На кірмаш павязу прадаваць ды табе шубу кратовую куплю! — смяяўся, бывала, Кандрат.— Будзеш, як жонка пана Пілсудскага ад дуба да сасны бегаць, ажно заснежаныя полы будуць у бакі разлятацца! А я ззаду за табой пабягу, каб, крый божа, шуба снегу не мяла за табой...

— Цьфу! Бессаромнік! — злавалася Алена, але супакойвалася: сабачанят можна і на самай справе прадаць.

Яны мірыліся, і жонка абыякава пытала:

— Ну якая яшчэ трасца твой язык муляе?

— Хачу схадзіць да пані Ядвігі ды прапанаваць

ей: яе конь — мае рукі, дык трэба нам спараваццa, каб крыху разам угору расці...

— Уга! Куды пяткі дзярэш! Пані з малака жыве, а ты... У яе цяпер ажно дзве дойныя каровы ды яшчэ адна — пярэдайка!

— Гэта яна, мамачка, улетку ў малацэ топіцца, а прыйдзе зіма... Сама пад нос каровам не ляжа...

— Пра-адасць! А за грошы і ў мядзведзя боты купіш...

— Грошы ўцякаюць з кішэні, як вада з рэшата... Сёння кішэня твая і пухнатая, і шалясціць-звоніць, а заўтра — гатовая стайня для цыганскіх коней! Але стайня-то ёсць, ды цыганы недзе далёка за морам гуляюць...

— Ну, тады глядзі, каб пані зноў не пасмяялася з тваёй прапановы, як некалі з той асушкі балотца...

— За папытанне не пасмяецца і пані! Тры аглоблі заўсёды замнога на аднаго каня — адна будзе лішняй...

Але ж на другі дзень Кандрат ужо заводзіў у аглоблі каня пані Ядвігі, задаволены і зговарам, і будучым сваім дастаткам.

— Вы, пане Кандрат, цяпер будзьце поўным гаспадаром каню, аж пакуль не вернецца пан Янэк...

— З вялікай радасцю, пані Ядвіга!

— І па малачко для дзетак прыходзьце...

— Дык я даіць вам каровак буду дапамагаць,— чырванеючы, хвалюючыся, прапанавала свае рукі і Алена.

— О, не! — узняла ўгору свае доўгія павекі пані Ядвіга.— Скажуць, што вы ў мяне парабкуеце...

— Што вы, што вы,— трымаючы ў зубах супоню, не згаджаўся Кандрат.

— Не, не і не! — цвёрда стаяла на сваім пані Ядвіга.— Не хачу, каб мяне па розных камітэтах улады цягалі! Я здаю малако, сама яго даю, мне за гэта пла-

цяць грошы... На кавалак хлеба, а там... будзе бачна, які куток хаты сонца асвеціць...

— Ой, пабойцеся бога, пані Ядвіга, не гаварыце больш так,— азірнуўшыся па баках, ціха прашаптала Алена.

— Яшчэ, пані Алена, можа ў адзін ранак з трох бакоў сонца ўзысці: з Масквы, Варшавы і з... Берліна! Я нічога цяпер не баюся: няма майго Яначка, дык і мне не трэба жыць...

— Усім трэба жыць, пані Ядвіга!

— Ат! — махнула рукою яна, і на яе вачах блінулі слёзы. Пані цяпер добра гаварыла «па-мужыцку» — па-беларуску, хоць раней прытваралася, што нічога не разумее.

Кандрат рукі меў здольныя, працавітыя, хоць часам і не было іх да чаго прыкласці, а калі ўжо ён прыкладваў іх, дык рабіў любую работу як сабе, не пану. У яго і там, над Бугам, вялікай раскошы на ўласнай зямлі не было: пакуль скурыш адну цыгарку, дык тройчы абыдзеш усё сваё каралеўства! Во які вялікі «пан круль» быў некалі Кандрат! У войску якога было: восем жаб-жаўнераў ды адзін забеглы заяц — фельдмаршал! Так што сякера яго больш у пушчы стукала на карысць англійскіх купцоў, а сабе дровы секла сама Алена...

Абрабіўся ў саракавым годзе Кандрат добра: і пані Ядвізе пасеяў ды пасадзіў сёе-тое, і сабе цаліны дзерануў, так што хлеба нарасце, а малака дачакаецца ажно ў сорак першым, калі ацеліцца цялушка, якую падаравала пані Ядвіга, бо яго нібыта тыя Саветы і наогул забылі: не таўчэцца чалавек на ганку сельсавета, значыць, не мае ніякай патрэбы! Што належыць з падаткаў, сам прывозіць, дык няхай там слухае на сваім хутары салаўёў ды жаб...

Накасіў ён і сена каровам пані Ядвігі, так што жылі яны цяпер ледзь не адной сям'ёй. Але гэта толькі

яму здавалася так: пані Ядвіга не-не ды і кіне, хоць, здаецца, і незнарок, калючае слова:

— На чужой фурманцы латвей і цыгану ехаць...

— Дык як сказаць! — нібыта нічога не разумеючы, хітра заўважаў Кандрат.— Калі трэба тую фурманку папіхаць, то і чужы чалавек радней за роднага брата стане...

Пані Ядвіга пры такіх словах моўчкі адыходзіла ўбок і ўжо некалькі дзён маўчала, хоць і не пярэчыла, калі Кандрат запрагаў каня альбо Алена падсабляла даіць кароў.

— Чужая кроў у тваё жылы вялікага цяпла не прынясе,— разважала нібы сама з сабой пані Ядвіга.— Калі свая астыне, ад чужой яшчэ больш пахаладзееш...

— Але і не абледзянееш,— уставіла сваё слова і Алена.

— Толькі што не абледзянееш,— згадзілася пані Ядвіга.

— Нешта я перастаў разумець, Алена, што да чаго: пры Польшчы перад панам Карскім на пальчыках бегаў, а пры Саветах — перад паннай Ядвігай трэба бегаць,— скардзіўся неаднойчы на свой лёс Кандрат.

— Хто пры панах насіў рогі, той і зараз іх носіць, толькі поўсцю прыхаваў,— разважала Алена,— а мы як былі мужыкі, дык так імі і засталіся, і зараз пасталом у рот зацірку носім... Ды яшчэ хвалімся, што так смачней есці! Абутым вокам яна на нас пазірае, як на якіх парабкаў, хоць і малюецца перад іншымі, што нібы стала нам раўнёй...

— Сеем у згодзе, а як будзем збіраць пасеенае? Хто каму горла сярпом перарэжа? Быў я ўчора ў Сасноўцы, дык пра вайну ўсе байкі баюць: нібыта немец пасля Польшчы і нас хоча пад ногі стаптаць... Таму і паненка наша так свой хвост на спіну паклала! Ад немца ласкі, відаць, чакае...

— Такой, як яе Янэк дачакаўся? Можа, угнаіў дзе сабой кавалак нямецкай зямлі!

— Яно-то так, але ж памяркуй сама: і паляк быў нам панам, і немец, калі прыйдзе, да плуга не пабяжыць, а таксама запануе за нашай, мужыцкай, спінай... А пан з панам заўсёды ў адной карэце ехаць захочуць! Нешта страшна мне робіцца, Алена, калі яна на мяне такім чужым позіркам глядзіць...

— А ты яе не бач! Глядзі на яе — і не бач!

— Са страху ў цемры і за пяньком будзеш цікаваць, бо думаеш, што гэта — мядзведзь на цябе даўбешку падняў...

— Гэта ты толькі перада мною такі мондранькі, а перад іншымі... душу з грудзей у пяткі хаваеш!

— Не буду я больш каня ў пані Ядвігі браць,— ціха сказаў Кандрат.

— Дык тады мяне будзеш ужо ў плуг запрагаць?— падкалупнула Алена.— Дзіва ж, хто лепш цягне, на таго і больш навальваюць... Цягні, дурань, хутчэй ногі выцягнеш!

— Ты ўжо вельмі так нацягалася, карона з цябе зляцела? — не на жарт раззлаваўся Кандрат.

У гэты час да іх падышла пані Ядвіга. Яна колькі часу пастаяла моўчкі, а пасля сказала:

— За каня і за малако будзеце плаціць... Падтрымалі вас: з аднаго боку я, а з другога — Саветы, дык пара і мерку ведаць!

— Добра, няхай будзе і так! — згадзілася Алена.

Тая ноч была трывожная: у Кандрата захварэла меншанькая, Алеся, дык усю ноч яны не зводзілі воч.

— Можа, да доктара трэба звазіць? — неяк упаўголаса пытаецца Алена.

— А за якую трасцу наймеш каня? Заўтра ўдзень вазьму накрамы ды на сабе занясу... Можа, да ранку не пагоршае?

Але ў гэты час нешта моцна страсянула Кандратаву хату.

— Ці не пярун дзе ў які дуб урэзаў? — прыслухаўся гаспадар.

— Звечара ж ніякіх хмар не было на небе,— удакладняе Алена.

— А доўга ім знайсціся? Яны ж не спяць па начах так, як ты: дзень і ноч усё плывуць некуды...

Алена маўчала над сапучай з гарачкі Алесяй.

— Дзе мае нагавіцы? Дай ано я выйду паслухаю,— устаў з пасцелі Кандрат, вобмацкам шукаючы ў цемры свае порткі.

Вярнуўся хутка:

— Алена! Уставай ды дзяток апранай, Брэст гарыць, мусіць, вайна пачалася!

— Ну пайшоў дзёгцем платы маляваць! — не згаджаецца спрасонку Алена.— Каб была вайна, яшчэ б учора хто прыбег з вёскі ды пераказаў...

— Скажа, чакай! Хутчэй варушыся, чуеш, як уся зямля гудзе?

А на досвітку, як толькі пачало ледзь-ледзь выбельвацца на дзень, па наваколлі разнесліся калючыя гукі стрэлаў, і, перабягаючы ад дрэва да дрэва, да хутара набліжаўся ланцуг людзей з закасанымі па локці рукавамі і з зялёнымі каскамі на галовах.

— Ой, куды ж цяпер нам падзецца? — мітусілася Алена, прыціскаючы да грудзей хворую Алесю.

— Лезь пад печ, там захаваешся ды перасядзіш усю вайну, а калі скончыцца, я цябе паклічу! — злосна азваўся Кандрат.— Не бегай па двары, як тая квактуха! Немцы таксама людзі...

Але ж Алена добра ведала яшчэ па той, далёкай вайне, у чатырнаццатым, якія гэта людзі — немцы!

Кандрат стаяў самаўпэўнены, хоць нутро яго таксама і халадзела, і гарачэла, бы ўжо на яго было накіравана дула нямецкай вінтоўкі.

— Не мітусіся, сказаў табе! — сціскаючы зубы, як ад вялікага болю, злосна папярэджваў ён жонку.— Зойдуць у хату, пап'юць вады ды і далей, на Маскву, пашыбуюць! Што ім рабіць на нашым хутары! Ім Масква ў бельмы лезе!

Кандрат азірнуўся: на парозе свайго дома стаяла пані Ядвіга, прыхарошаная, з ручніком у адной руцэ, на якім ляжаў бохан хлеба, а другою яна трымала вялізную белую кружку, напоўненую свежым малаком. Побач з ёю стаяў і бідон з учарашнім удоем.

Немцы амаль не звярнулі ніякай увагі на Кандрата з жонкай, яны адразу кінуліся да пані Ядвігі.

— О-о, млека! — апусціўшы рулі вінтовак і аўтаматаў, цешыліся яны.

— Пшэпроша, панове! — спрабавала пачаставаць са сваіх рук пані Ядвіга аднаго з немцаў.

— Найн, найн, матка! — замахаў немец рукамі і пачаў паказваць пані Ядзвізе: выпі першай ты сама!

Тая зразумела яго і выпіла з кружкі малако.

— Гут, гут! — рагаталі немцы і паказвалі яшчэ і на бідон: выпі і адтуль!

Ядвіга выпіла і з бідона паўкружкі малака.

Тады ўсе немцы па чарзе пачалі піць ахалоджаны сырадой, прычмокваючы губамі і рагочучы ад задавальнення на ўвесь хутар.

Але ў гэты час недзе зусім непадалёку ўсхадзілася шалёная страляніна: немцы пакінулі піць малако і ўхапіліся за зброю.

Кандрат стаяў ззаду таго немца, які дапіваў малако апошнім, і сказаў:

— Сталін — капут?

Немец азірнуўся і, пераканаўшыся, што ўсе пабеглі ў той бок, дзе ўсчалася стральба, сказаў:

— Найн! Гітлер — капут! Гітлер — капут! — паўтарыў ён і сабраўся даганяць сваіх суайчыннікаў.

— Хальт! — выбег з-за Кандратавага хляўца немец, на бягу падпяразваючы рэменем штаны.

Той, што дапіваў малако, спыніўся, і тут раздаўся стрэл: немец высока ўскінуў адну руку, а другой ухапіўся за ўласныя грудзі і ў такой позе мякка паваліўся на дол.

Да немца падбегла пані Ядвіга:

— Іх! Іх — пух, пух! Шысэн іх, пан салдат! Яны адабралі майго паўхутара...— І яна ціха заплакала, выціраючы далонямі мокрыя вочы.

На стрэл нямецкага салдата павярнуўся фельдфебель, які ішоў ззаду за ланцугом немцаў, трымаючы напагатоў рэвальвер.

— Чаму застрэліў свайго? — падбег ён да салдата.

— Ён не верыў у нашу перамогу, пан фельдфебель! — сказаў па-нямецку той.— Я на свае вушы чуў, як ён казаў вунь таму мужычку: — Гітлер — капут!

— Ах, не верыў? — перапытаў фельдфебель.— Тады яго трэба было пакараць перад усім строем, каб ведалі, завошта. А так...

— Не мог вытрымаць, пан фельдфебель, такой ганьбы,— выцягнуўся ў струнку салдат.— Агітацыя супраць фюрэра! Хайль Гітлер! — ускінуў угору правую руку салдат.

— Хайль! — аўтаматычна выкрыкнуў, ускінуўшы руку, і фельдфебель.

— Ком! — паклікаў пальцам ён да сябе Кандрата. Той са страхам прыблізіўся да фельдфебеля.— Закапаеш няверца! — загадаў ён Кандрату. Той нізка нахіліўся ў знак згоды выканаць загад.

— Усіх, хто не верыць у перамогу фюрэра, туды іх! — паказаў рэвальверам у неба фельдфебель і паляпаў па плячы салдата за яго вернасць фюрэру. Пасля ён павярнуўся да пані Ядвігі і спытаў, паказваючы пальцам на Кандрата і Алену з Алесяй на руках, ля

якой збоку таўклася, хаваючыся тварыкам у мацерын хвартух, і Марылька.

— Бальшавікі?

— Не-е ве-едаю... Але яны мяне абрабавалі з дапамогай бальшавікоў.

Яна не паспела дагаварыць: яе словы абарвала аўтаматная чарга. Фельдфебель зноў хутка павярнуўся і, убачыўшы, як упалі ад куль пані Ядвіга і Кандрат з Аленай і дзецьмі, закрычаў:

— Завошта ты такую гасцінную гаспадыню?

Салдат спярша пачырванеў, пасля з пераляку спалатнеў.

— Ну? — накіраваў на яго рэвальвер фельдфебель.

— Я не хацеў! — пачаў заікацца салдат.— Я страляў бальшавікоў, ды куля зрыкашэціла...

— Ух, швайнэ! — скрыгатнуў зубамі фельдфебель.— Разбірацца трэба!

— Надалей буду разбірацца, пан фельдфебель! — казырнуў салдат.— Сталін — капут! — выкрыкнуў ён, каб крыху супакоіць фельдфебеля. І ён яшчэ раз секануў з аўтамата па мёртвых ужо хутаранцах.

...Стрэлы адплывалі на ўсход, а на хутары, дзе ўсяго некалькі гадзін назад так духмяна пахла на дасвецці росная трава, запахла порахам і смерцю... І толькі ў маўклівы лес пасылала сваё трывожнае выццё Кандратава сучка, ды разбівалі рагамі дзверы хлява каровы пані Ядвігі...

# Парабак

На другім тыдні пасля вайны ў Сасноўку вярнуўся без нагі Астапаў парабак Мікола. Хлопцы і дзяўчаты добра яго ведалі — не было такога вечара ўлетку, каб ён не браў гармонік ды не выходзіў на вуліцу, не садзіўся на лавачцы, што ля плота старога Восіпа. Па першым часе Восіп хаваўся за плотам у галлі вішняку з вядром вады, і як толькі дзяўчаты з хлопцамі акружалі Міколу ды прасілі зайграць «Лявоніху» ці польку «Янку», стары бухаў у гуллівую гурму вадою і лаяўся:

— Адпачыць, гіцлі, па-чалавечы не дасцё!

Хлопцы і дзяўчаты разбягаліся хто куды, атрасаючы з вопраткі кроплі вады, а потым збіраліся зноў і пасылалі да дзеда «парламенцёра». Восіп сядзеў ля печы і хмурыў свае белыя бровы:

— От пажывяцё, пацукі, на свеце з маё, тады пабачым, як гэта латва старым вушам слухаць усю ноч піскі-віскі пад вокнамі...

Валя ступала да Восіпа і прасіла:

— Ля вашай хаты добры грудок, пылу няма...

— Можа, у мяне і яшчэ што лепшае ёсць, дык аддай вам... На печ да сябе завядзі гэтую гайню ды хай там на гарачай чарэні і падскоквае да самага ранку...

— Самі нябось некалі ў польцы не адну пару ботаў стапталі?..

— Эхе-хе-хе, стаптаў, каб ім чорт бокі патаптаў!— І дзед пачынаў расказваць пра сваё жыццё-быццё, пра багатых вяскоўцаў, якія і абворвалі яго, і абкошвалі, а калі агрызаўся, дык і ў каршэнь давалі за рызыку...

— Вам цяпер лягчэй жыць. Папрацаваў удзень,

боты ўвечары надзеў, якіх некалі і ў паноў не было, і айда на польку! Ну, ліха з вамі, ужо і гэтую ноч не пасплю — вам аддам свой сон...

Мікола недзе з-пад Баранавіч, а сюды забрыў, як гаворыцца, самапасам: у каго кароў лета пасвіў, каму дровы зімой калоў, за што меў і прытулак, і харчунак. А ў Сасноўку калі забрыў, асеў у кулака Астапа.

...Мікола сядзіць ля стала. Заходзяць моладзь, дзеці. Старыя выціраюць слёзы — мала хто з вайны ў сяло вярнуўся. Снуе ля стала Астапіха: прынесла літровую бутэльку самагонкі, цвілога сала, цвёрды, як замёрзлая купіна, бохан хлеба, некалькі брудных курыных яек. Ля Міколы сядзіць Астап. Ён пасівеў, шчокі апаўзлі, а рукі сталі яшчэ больш азызлымі. Праўда, дастаў з куфра пахнучую нафталінам камізэльку, надзеў юхтавыя боты і ля боку паставіў сучкаваты кій: маўляў, так цяпер модна!

— Вайна скончылася, Мікола, а і жаданага перадыху чалавеку няма: удовам дапамагай араць-сеяць, падаткі плаці, шарварак адбывай...

— Рэзрух, дзядзька Астап, рэзрух! Думаеце, на вайне лягчэй было? Гэта з вашай хаты ніхто на вайну не пайшоў, а па вёсцы, лічы, праз хату то сын загінуў, то бацька дзяцей асіраціў... Што, ім лёгка зараз?

Мікола абвёў людзей вачыма, зірнуў на стол, над якім вісеў сіні дым ад табачных карашкоў, перамешаных з мохам. Побач з Міколам стаялі дзве мыліцы, на якія ён пакуль што і спадзяваўся ў жыцці абаперціся, бо больш ні на кога і не абапрэшся...

— Вайна нікога не нагрэла,— лісліва зазіраючы ў вочы Міколу, працягваў Астап.— Ты сабе таксама медалёў у кузні не накляпаў, за кожны кроў сваю праліў. Ой, божа-божа, колькі таго гора паражылі людзі!

Да Міколы падсела Мірoніха, Валіна маці. У Міколы ёкнула сэрца, у вачах зацямнілася, як перад навальніцай у густым ельніку.

— Дык, мусіць, вельмі балела, як нагу адразалі? — неяк неўпапад запытала Міроніха.

— Цьфу, от жаночы язык! — ускіпеў Астап. — І не сорамна табе пытацца аб гэтым? Можа, чалавеку смерць такое ўспамінаць, а яна...

Мікола схамянуўся ад думак, заўсміхаўся:

— Не было калі, цётачка, думаць. Пад Познанню, у Польшчы, гэта было. Тры гадзіны не было сувязі паміж нашай ротай і штабам батальёна. Камандзір роты лейтэнант Камісараў, Пецем, здаецца, звалі... там столькі камандзіраў за які месяц перачаргаецца, што ледзь прозвішча запомніш, не тое што імя... Дык лейтэнант мне, значыцца, і кажа, загадвае, па-ваеннаму, адным словам:

— Рыскні, Лукашэвіч, можа, ты, на сваё шчасце, сувязь адновіш...

Усе, хто быў у хаце, цясней акружылі Міколу, слухалі. Калі хто каго чапаў локцем, той рэзка абрываў руку і слухаў далей:

— Я, значыцца, поўную амуніцыю на сябе, вінтоўку ў рукі і папоўз, перасоўваючы наперадзе сябе катушку з провадам. Толькі гэта я, значыцца, дапоўз да таго месца, дзе ўжо бачу, што сувязь перарвана, аж — ц-цік! — адна куля, пасля — другая: ж-жык! Я стаіўся, агледзеўся — адкуль? Аж бачу, невысокі курганчык і ў ім дзірку, ну, як кату галаву прасунуць. Я тут і здагадаўся, што да чаго. Агледзеўся пільней: а братачка, вунь Скварцоў забіты ляжыць, а вунь Піўтырак з Палтаўшчыны. Гэта яны пасылаліся ўзнаўляць сувязь...

— Ай-яй-яй! — застагналі жанкі, і па хаце пранеслася хваля шуму.

— Я тады рэчавы мяшок з сябе, кладу яго наперадзе, праверыў добра вінтоўку, і — была не была: а-ах!

— Ох! — усклікнуў нехта ля печы.

— І ўсё! — засмяяўся Мікола.— Хоць «Рускага» танцуй, нікога наперадзе няма, ніхто цяпер цябе не зачэпіць, не тое што некалі Восіп... І вось каб, здаецца, сваёй зямлі меў тысячу гектараў, не так яна была б міла, як тады... А то ж парабак вечны, смаку зямлі не ведаў, а калі яна засталася без ворага — цалаваць яе хацелася!

Напружаная цішыня перарвалася, і хату напоўніў бадзёры, звонкі смех.

— Злучыў, як умеў ад радасці, правады — і будзь здароў!

— Малайчына! — ухваліў Астап і паглядзеў на Міколавы медалі.

— Але вайна — на ёй радасці мала. Пачаў я ў поўны рост да сваіх напрасткі бегчы. Ды толькі зрабіў крокаў сорак: сві-і, бух! — і нагі як і не было!

— Ой, божачка! — забожкалі жанкі, а больш за ўсіх Мірoніха, як быццам толькі зараз даведалася, што ў Міколы няма нагі.

— Далібог, болю ніякага не было! Некалі, як служыў у адной вёсцы парабкам, пасвіў кароў ды заснуў, а яны ў авёс трапілі, і гаспадар падлавіў, от дзе адхапіў болю, як з трох войнаў вярнуўся ў вёску.

Гэты Міколаў жарт зноў развесяліў людзей.

— Ну дык што ж, будзем садзіцца за стол? — сказаў Астап і першы палез на покуцце.

— Ордэн Чырвонай Зоркі за гэта атрымаў! — з гонарам закончыў Мікола, адставіўшы мыліцы ад стала.

Пачалі з натоўпу перабіраць, каго пасадзіць за стол — калі залазіў лішні чалавек, Астап аж дыханне затойваў.

— Сядайце, цётка Міроніха! — запрасіў ужо ад сябе Мікола.

Цётка папраўіла на галаве хустку і пачала залазіць за стол, каб сесці поруч з Міколам.

— Ну дык вып'ем за ўсё лепшае, чаго кожны сабе жадае! — прапанаваў Астап.

Мікола паднёс сваю чарку да Міронішынай і так і застыў — у яе вачах ён прачытаў нейкую спагаду, нешта невыказнае, стоенае. Хацелася выкрыкнуць: што зВаляй? Ён паволі пацягнуў шклянку да губ і гэтак жа паволі выпіў. Загаманілі гучней, кожны хацеў выгаварыцца сам, не даючы гэтага зрабіць другому. Як выпілі яшчэ па адной-другой, Міроніха заплакала.

— Што, цётка, вайна ж скончылася? — узяўшы старую за плечы, сказаў Мікола.

— А для мяне яна будзе вечнай: Валька, дочанька! Я не гаварыла табе, сынок,— яе Мішка рыжы расстраляў, бо не захацела на сябе грэх узяць, не пайшла за яго замуж,— не сунімаючы слёз, гаварыла Міроніха.— Ён у паліцэйскіх халуях хадзіў...

— Дзе ён зараз? — ускочыў на адной назе Мікола.— Ды я яго... на той свет адным мігам адпраўлю...

— Яго даўно ўжо нашы адправілі, але што ён нарабіў, што нарабіў... Каб яго косці і на тым свеце не ведалі спакою...

Мікола ўспомніў тыя далёкія раніцы, калі пасвіў кароў у аднаго багацея з суседняй вёскі Загацце, а Валя — свой статак. Мікола рваў арэхі, а статак пайшоў лугам, сабіраючы ўсе лясныя калюкі на свае бакі і хвасты. Чуе — нехта крычыць. Пачыналася восень, лісце з дрэў пакрысе асыпалася, а трава на лузе гэтак добра зелянела, што каровам яшчэ хапала ежы. І вось выйшла яна. Загарэлая, з сінімі вачыма, з недаплеценым кошыкам у руках. Зараз забі Міколу, дык ён не ўспомніць, аб чым яны тады гаварылі. Але ў тую ж восень Мікола апынуўся ў Сасноўцы. Два гады да вайны пражыў у Астапа. І цяпер у яго была ўся надзея на яе, на Валю. І вось — ні надзеі, ні спогаду. А ў Астапа зараз яму месца не будзе — які ён цяпер работнік? Ды і хіба мала ён высмактаў з яго, Міколы, кры-

ві? Бывала, не паспееш прывезці з балота прыцяганку сена, а ўжо бяжы ў клуню ды бярыся на ўсю ноч за цэп, а раніцай — каровам сена падавай, напаі, дроў у хату, вады нанасі. Ды яшчэ і хлусі ўсім — сваяк ты Астапу. Бо з яго душу за эксплуатацыю вытрасуць бальшавікі! Ось толькі і адвядзеш, бывала, душу гармонікам. А за гэта ўсё — дазвол у нядзелю боты надзець з гаспадарскай нагі ды пасядзець часам за сталом разам з Астапам, калі той быў у гуморы...

Гэтых Міколавых думак ніхто не падслухаў за сталом — усе былі «навесяле», лезлі адзін да аднаго цалавацца.

Мікола спахапіўся ад Астапішыных слоў:

— Я кажу Астапу: вычаві якую кроплю самагонкі, а можа, Мікола і ачуецца, дык куды ж яму падзецца на першым часе? Хоць і пісем не пісаў, а душа чула... А калі што, дык усё роўна жыта прарасло,— гаворыць яна.— А гэту кроплю і збыць лягчэй...

З-за стала вылез з узмакрэлай лысінай, з размяклымі губамі Астап.

— Мікола, а пра гармонік і забыліся? А я табе яго прыбярог, прыхаваў, хоць і насіўся з ім усю вайну, як дурань па кірмашы з пустым мехам... Але збярог! — з гонарам паглядзеў ён на Міколу. І пайшоў па гармонік.

Пакуль Астап корпаўся недзе там, за дзвярыма каморы, Астапіха, хітра падміргнуўшы людзям, дзялілася таямніцай:

— І Астап ледзь галаву не паклаў. О-о, было бяды! Паехаў неяк у млын у горад, зайшоў на станцыю, а там якраз немцы ад'язджаюць. І адзін гэтак на губным гармоніку грае, гэтак грае,— расказвала яна, нібы тое гранне чула на свае ўласныя вушы.— Астап папрасіў гармоніка і потым шмарганув з ім... Немцы: шысэн, швайнэ, шысэн! — застрэліць, значыць, трэба свінню, а Астап у прыбіральню схаваўся. Мусіць, каб

знайшлі, чэрапам бы заплаціў за той пракляты гармонік... А так — абышлося ўсё добра, і цыганы жменю грошай потым далі за яго. Можна было б і даражэй прадаць, ды Астап вельмі мяккі на сэрца...

Астап у гэты час з сяней вярнуўся, трымаючы ў руках амаль новенькі гармонік. Мікола ўзяў яго ў рукі, дзьмухнуў на мяхі і замоўк.

— Польку, Мікола, «барыню» давай, як некалі! — загаманілі падвесялеўшыя госці. Мікола маўчаў. Потым адшчапіў раменьчыкі, якімі былі сцягнуты мяхі, прабегся пальцамі па гузіках гармоніка. І як урэжа:

На границе тучи ходят хмуро,
Край суровый тишиной объят...

У жанок паліліся слёзы, задрыжэлі губы ў мужчын. Старэйшыя, хто стаяў ля парога, замахалі галовамі — салдацкую ўрэзаў, баявую... Мо-оцны баец быў, нічога не скажаш!

Зашэйгаўся на месцы Астап, нешта пачаў пераміргвацца з Астапіхай. А Мікола заплюшчыў вочы, дрыготкімі губамі памагаў гармоніку:

Три танкиста, три веселых друга,
Экипаж машины боевой...

Па збялелых яго шчоках закапалі скупыя салдацкія слёзы.

— Дапаможам беднаму салдату! — сказаў-ускрыкнуў Астап і першы палез у кішэню па кашалёк. Гэтыя словы апрытомнілі Міколу, ён на паўакордзе спыніў ігру і адкрыў вочы: перад ім на самаробным табурэце ляжала яго перакінутая дагары пілотка, і да яе Астап працягнуў руку, у якой была чырвоная трыццатка. Салдат ускочыў з услона, ухапіў адну мыліцу і пад агульны крык выцяў ёю Астапа па распаранай лысіне. Той хацеў кінуцца на Міколу, але яго з усіх бакоў абхапілі мужчыны і жанчыны рукамі, павялі ў ба-

коўку. Астап трымаўся адной рукой за лысіну, другою — паграјажаў, супраціўляючыся нагамі, Міколу:

— Гэта так за мой хлеб адплаціў, гэта так за мае сарочкі ды за боты, якія табе, галадранцу, дазваляў са сваёй нагі? А чым зараз будзеш жыць? Для разжытку хацеў капейку сабраць... У цябе ж, акрамя гэтай зялёнай робы, і пераменку няма...

— Свалата, жмінда, вар'ят! — не знаходзіў слоў для дастойнай лаянкі Мікола.— Ты з мяне перад адыходам на вайну цалейшую сарочку злупіў, у лапцях адправіў, бо за боты можна было аўса ці які пуд жыта выменяць... Можа, на цябе працуючы, не зарабіў, скажаш? Сабака!

У хаце ўсе заціхлі, рассаваліся па кутках, спадкрадня сачылі за Міколам. А ён сабраў усе свае рэчы ў мяшок, узяў гармонік і падышоў да Міроніхі:

— Пераначаваць, цётка, пусціце, пакуль што?

Тая баязліва азірнулася:

— Дзіва што пушчу! Месца ж не праляжыш, ідзі начуй на здароўечка...

Мікола націснуўся на мыліцы і выкінуў наперад здаровую нагу. Упэўнена, лёгка.

Міроніха адчыніла яму дзверы...

# Сенька-інвалід

Ён з'яўляўся на базары ў адзін і той жа час — праз паўгадзіны пасля адкрыцця «ўстаноў» з гарачымі напіткамі. Правае вока яго было перавязана анучкай, паўвуха з таго ж боку было ўжо чырвоным, як жарына.

— Сенька ў вялікім суме-жалобе жыццё сваё бавіць: Сенька Берлін пракімарыў на шпітальным ложку... Сябе не шкадаваў! Рукі-ногі фрыц на кавалкі пасек! А на медалі грудзі аказаліся завузкія — і без іх абыдуся...

І Сенька здатна выкідваў наперад сваю дзеравяшку-нагу, абходзячы ўсе прылаўкі, вывіжоўваючы, дзе што лепшае можна будзе прыдбаць.

Народ быў намардаваны за вайну кожны сваім горам, таму да інвалідаў адносіўся з вялікай павагай, нават калі тыя і тварылі часам такое, за што іншаму каму ніякага даравання не было б.

На базары, ды яшчэ ў невялічкім гарадку, звычайна бываюць адны і тыя ж людзі: і тыя, хто прадае, і тыя, хто купляе.

— Сеньку да Гітлера міна не падпусціла, у шпіталь загнала, а то б... Сенька за ўсіх вас яму б адпомсціў...

Вакол Сенькі збіраўся народ: кожны хацеў ведаць, як гэта Сенька за ўсіх іх адпомсціў бы Гітлеру?

— Сенька б яму адпомсціў! — крычаў ужо зусім ахмялелы інвалід. Стары шынель быў не надта прыстасаваны да яго стану, шапка адным вухам звісала з левага боку галавы, правае ж вуха, як запэўніваў сам Сеня, яму адкусіў нямецкі генерал, калі ён, Сеня, браў гэтага генерала ў палон.

— Ну проста і генерал табе адкусіў вуха? — не верылі людзі.

— Сеньку не верыш? Дакуменцік патрабуецца? — І ён лез за крысо шыняля па той нібыта «дакуменцік», у якім чорным па белым было напісана, што менавіта Сеньку вуха адгрыз генерал, да таго ж яшчэ — залатымі зубамі!

— А чаму ж таго не можа быць? Хіба генералы не ўмеюць кусацца? — падахвочваў Сеньку яго хаўруснік па чарцы Мікіта Сук, для якога ён паспеў ужо стаць сваім чалавекам.

— А ба-але-е-ела! — удакладняў Сенька.— Лепш штык яфрэйтарскі перанёс бы, чым тыя генеральскія зубы...

Сенька тым часам браў з прылаўка ўсё, што яму траплялa на вочы: агурок, памідор, галоўку-другую часнаку, а парою і кавалачак вяндліны ці сала. Такім чынам, закусіўшы пасля буфетнай чаркі, ён ужо разыходзіўся не на жарт:

— Але прывёў таго нямецкага генерала і асабіста перадаў яго нашаму генералу: ордэна не далі, а чарку поўную, як вока, з саміх генеральскіх рук шмаргануў...

— Ось гэта да-а! — зноў перабіваў Сенькаву гаворку хтось з натоўпу.

— А як жа: на вайне чарка — першая зброя! Там не шкадавалі гэтага дабра, адно кулі патрапляй, п'яны не пераблытай, куды пасылаць!

— Было, было так! — зноў сведчыць Мікіта Сук, як быццам сам ён быў на той вайне, хоць і сядзела ў яго галава крыху набок яшчэ з даваеннага часу.

— А цяпер? — пытаецца Сенька.

— Яно і тое праўда,— выціралі хусцінамі вочы кабеты.— Чалавек, можна сказаць, усяго сябе за нас аддаў, а мы яму і чарку шкадуем...

І пускалася шапка па крузе.

Праз момант Сенька шкандыбаў у буфет, дзе высы-

паў на прылавак сабраныя грошы, якія лічыла буфетчыца і налівала яму гарэлкі. У буфеце ён не закусваў — хопіць гэтага дабра, закускі, і на базары! Зараз восень — закусак у людзей сто восем!

Пасля другога вялікага паходу ў буфет Сенька на агуркі ды памідоры не звяртаў ніякай увагі: цяпер хапала ў яго рызыкі і на сала, і на каўбасы! Цяпер ён мог сёе-тое і рэквізаваць, калі бачыў, што прадае тавар прадавец, у якога авечы розум у галаве і блышыная сіла ў плячах.

— Свайго героя не пачастуеш? Мы ў немца вось так бралі! — ён у лепшым разе толькі адломліваў кавалак каўбасы, а калі лічыў за патрэбнае, дык цэлае кольца нанізваў на руку.

— Герой павінен частавацца па-геройску! — бубніў ён і адыходзіў. За варотамі базару ўсё хутка прадаваў, бо яго там даўно чакала свая «кліентура».

Сёння Сеня зрабіў ужо трэці рэйс ад кабака да базару і наадварот, таму нахабнасці ў яго было столькі, што ён не мінаў ні старога, ні малога.

— Дарогу свайму вызваліцелю! — крычаў на ўвесь базар ён.— Хай дажывае герой у вяселлі ды радасці свае апошнія дні-дзянькі!

Гарадок быў ціхі, міліцыя на базар не завітвала, таму Сенька і заявіўся тут немаведама з якой часткі свету і на якой кабыле. Дзе ён начаваў — ніхто толкам і не ведаў. Ды летам, як гаворыцца, кожны кусцік пераначаваць пусціць! А зіма? Ну, зімой Сенька пойдзе шукаць лепшыя мясціны!

Пасля трэцяй вандроўкі ў буфет ён абмінуў прылаўкі з гароднінай і накіраваўся да мясных закусак.

— Я за вас вуха і вока аддаў, пад Варшавай нагу пахаваў, а вы тут раскашавалі... Тлушч нагульвалі! Сенька ведае ўсё! Сенька з нямецкім генералам у абдымку прыйшоў да нашага генерала! Ордэн за кемлівасць начапілі, ды згубіў. А дублікатаў ордэнаў не

выдаюць: ідзі, кажуць, новы зарабі, калі хочаш, каб твае грудзі золатам гарэлі! А куды зараз пойдзеш у атаку — правы фланг не выстаіць...

— Ну ты, барадачанька! — звярнуўся ён да пажылога мужчыны, які гандляваў крыху салам, крыху каўбасамі. Ён тут упершыню, таму яго, як і Сеньку, ніхто не ведаў, адкуль ён.

Мужчына падправіў на прылаўку каўбасу, падсунуўшы яе ад краю бліжэй да сябе.

— Дзе бараду такую, як памяло, адгадаваў, можа, скажаш, што ў акопе пад Гдыняй ці Прагай? Дык у акопе не дазваляецца яе гадаваць, каб гасцініцай для палявой вошы не стала тая твая барада! У жонкі пад крылом, вось дзе добра яна расце! Ха-ха!

Сенька ўжо зусім захмялеў: ён наваліўся ўсім целам на прылавак, за якім стаяў барадач, аберуч ухапіў усю каўбасу і згроб яе на зямлю. Да выкрыкаў Сенькі тут паспелі ўжо прывыкнуць, таму на яго выкрунтасы ніхто вялікай увагі пад канец дня і не звяртаў.

— Ах ты, шкурнік! — закрычаў барадач. Ён выхапіў з-пад прылаўка ўласную кульбу і пачаў ёю дубасіць «героя» Сеньку. Збегліся людзі. Яны здзіўлена пазіралі на каўбасу, якая валялася на пяску, войкалі за кожным разам, калі барадач, ухапіўшы за руку Сеньку, «хрысціў» яго сваёй кульбай.

— Перастаньце біць інваліда! — крычалі спалоханыя жанкі на барадача.

— Інваліда? — не на жарт разышоўся барадач.— Ды ён таго пораху і не нюхаў! Зараз я вам пакажу, які ён інвалід...

Але як толькі адпусціў барадач рукаў Сенькі, той куляй ірвануў да варот базару, згубіўшы на бягу і сваю драўляную нагу, якой удагонку яму запусціў барадач.

— Ды я яго ведаю як аблупленага! — крычаў ён.— Гэта ж з суседняй вёскі бусайла, прыстасаваўся да на-

роднага гора! Бачыце, ды ў яго і ногі ёсць, і вочы! А вуха яму, п'янаму, сабака на каляды на сметніку адкусіў!

— Ату яго, ату! — закрычалі пад агульны рогат людзі.

Усе з павагай пачалі пазіраць на барадача — сам інвалід, а не просіць, нават уласнай скаромнінай гандлюе!

— З зямлянкі хутчэй хочацца вылезці, вось і прывёз сёе-тое сюды, каб крыху латвей прадаць... Сам не з'ясі, каб капейку да капейкі на хату прыдбаць... А ён, шэльма, не пазнаў: ці то з п'яных воч, ці, можа, мяне і зусім не ведае... А я яго і бацьку добра ведаў — з-пад ката яйкі выграбаў ды прапіваў... Немцы дынатуратам напампавалі — «спакойнай ночы» з-за маладых год зрабілі... Дык сынок пачаў працягваць яго занятак! Адкляпаў на бутэльцы язык, як чэшскую касу-дзевятку, ды ўсіх напавал і косіць... На спачуванні народным барышуе, шэльма!

Нехта падняў павязку з Сеневага вока.

— Ад сораму людскога адгароджваўся,— сказаў барадач.— Адно вока ў сабакі пазычыў, а другое — анучай заткнуў... Так латвей смярдзючую душу супакойваць...

Больш Сені на базары не было бачна. Можа, перабраўся дзе ў іншую мясціну? Дзеравяшку знойдзе ды і вока чым-небудзь заткне, як выбітую шыбіну ў акне, каб у душу не прасочваўся чалавечы сорам...

## Першы «настаўнік»

На трэцім месяцы вайны па вёсцы прабег дробненькі, вечна з цыгаркай у зубах нямецкі стараста Арцём Гачок, якога нашы мужыкі яшчэ на польскі манер называлі солтыс, і абвясціў усім, у каго былі дзеці школьнага ўзросту, што пятнаццатага верасня новыя ўлады адкрываюць школу, таму, каб нікога не пакаралі цывілізаваныя немцы, дык трэба, каб у гэты дзень усе селі за парты. Ну, а там, хто зможа выкруціцца ад той школы, дык хай сабе робіць так, як ведае сам... Да гэтага ўжо ён, Арцём Гачок, ніякага дачынення мець не будзе...

У кожнай хаце ён папярэджваў:

— Калі мне ў жандармерыі скінуць штаны за каго, дык і я таго потым не пашкадую... Падаткамі даканаю ды рознымі работамі, якіх у немцаў не забракуе, а пры выпадку — і зубы палічу... Дакладна палічу, ніводнага не прапушчу!

Кожны вясковец завяраў пана старасту, што выканае яго загад, бо ведалі яго круты нораў яшчэ з часоў панскай Польшчы, калі і тады ён аціраўся каля розных паноў, якія заўсёды давалі яму пасаду солтыса. А гэтая пасада — і гарэлка дармовая, і закусь, ды мала што яшчэ... Часам і ля маладзіцы такой бокам цярнешся, што каго іншага яна і за вярсту не падпусціла б да сябе...

У новай хаце — новая пагроза.

— Што мне? — гаварыў Арцём.— Я чалавек пры пасадзе, і з яе, можна сказаць, зараз ем свой хлеб, дык і раблю, што немцы загадваюць. Ну, васпане, каб я

больш гэтых дзвярэй не адчыняў! Бо калі яшчэ раз адчыню, хі-хі! — праз акно будзеш выскокваць! — пагражаў ён гаспадару ці гаспадыні.

— Ды пойдзе, пойдзе мой падшыванец! — гаварыў каторага вучня бацька.— А што ж яму зараз рабіць? Хіба па сяле сабак будзе ганяць? А не, на вяровачцы прыцягну, як таго бычка непаслухмянага: навука — гэта ого! — святла ў вочы чалавеку дабаўляе...

— Так, так! — згаджаўся Арцём і бег у наступную хату, напамінаў: — Немцу трэба будуць ра-азу-умныя памочнікі: на машыне працаваць «сляпы» не патрапіць! Немцы ўсіх з валоў на машыны перасадзяць! Цылізацыя!

Вяскоўцы сабраліся на раду.

— Ну што ж, у школу дык у школу! — кажа Сымон Канцавы.— Не ў возера ж тапіцца прымушаюць немцы... Навука заўсёды не памяшае чалавеку... Немец цябе будзе аднаму вучыць, а ты пра сваё думай у рукаў... Сваімі клопатамі набівай галаву...

— Цьфу! — сплюнуў дзядзька Сідар праз пракураныя вусы.— Чаму яны будуць там вучыць нашых дзяток? Як на сабак брахаць?..

Сідар не дагаварыў, бо яго перабіў дзед Тарас, вельмі памяркоўны і паважаны на сяле чалавек:

— Глядзі, голубе, каб табе часам твой худы азадак не пачасалі немцы. Загадваюць — выконвай! Я яшчэ з мінулай вайны іх не забыў: любяць пачасаць свае кулачкі аб нашы бачкі...

— Так, так! — загаманілі ля плота жанкі.— Трэба ліць ваду і ў іх рэшата, калі загадваюць... А якая ўжо будзе тая вучоба, пабачым. Каб адно адчапіліся немцы, няхай дзеткі ідуць цяпер у школу...

У прызначаны дзень мы селі за парты. Адных нас прывялі, некаторыя прыйшлі самі. Трохі прыбраліся: як-ніяк у школу ж ідзеш!

А школа ў нас была яшчэ з польскіх часоў — ззя-

ла на сонцы цынкавай бляхай, красавалася чырвона-жоўтымі сценамі, глядзела на свет божы белымі вокнамі. Яе будавалі нашы бацькі самі, скінуўшыся, хто што мог: хто пуд-другі аўса ці жыта, а хто і грашыма дапамог. Гэта каб купіць дзерава. Будавалі ж самі. Вось толькі востра было паўстала пытанне: на чыёй зямлі пабудаваць тую школу? Выбралі намер дзеда Тараса. Ён не пярэчыў, хоць і ўласных дзяцей-школьнікаў не было ў яго.

— У сяле ад вучоных жыццё пасвятлее! — кажа ён.

— Абібокаў адно больш развядзецца,— не згаджаўся Сымон Канцавы.— Шэльма падвучыцца, дык і пра зямлю забывае, усё прымерваецца, каб дарэмны злот аб злот у кішэні званчэй бразгаў, а рукі ў такіх ох як мазалёў не паважаюць!

— Э-э, гэтага ты, чалавеча, не мялі! — кажа Тарас.— Граматны хутчэй дзверы да праўды знойдзе ды адчыніць... Калі і з панам пачнем судзіцца, свой, пісьменны чалавек, тут лепш ва ўсім разбярэцца, што да чаго, якую спіцу ў якое кола ўставіць... Ён лепш прыкмеціць, у які бок круцель пачынае справу закручваць!

Рашылі тады Тарасу ад іншых участкаў зямлі адрэзаць, каб чалавек не пацярпеў вельмі вялікіх страт.

...Дык вось, у прызначаны дзень мы селі за парты і чакалі, калі прыйдзе да нас у клас той наш — першы настаўнік! Расчыніліся дзверы, і на парозе паказаўся... поп з былога нашага райцэнтра. Раней мы гэтага касматага дзеда бачылі толькі тады, калі яго прывозілі да нас у вёску на пахаванне. Ён быў для нас вельмі ўжо нейкім таямнічым: у сваёй пазалочанай рызе, са свечкай і крыжам у руках, ён здаваўся даверанай асобай на зямлі самога нябеснага бога, а ўсе астатнія вакол яго і сам нябожчык — толькі маленькія зямныя чарвякі. І яшчэ. Хоць сам гэты поп і здаваўся надта

ўжо старым, але думалася, што ён ніколі не памрэ, а толькі павесяліцца-паспявае на хаўтурах усіх прыхаджан і будзе жыць вечна, нараўне з богам.

Мы паўскоквалі са сваіх месцаў у страху, што нас гэты служка божы зараз усіх без перасадкі адправіць проста на неба анёламі прыслугоўваць самому госпаду! Ён перахрысціў нас і сказаў:

— Дзень добры, рабы божыя!

— Добры дзень, святы айцец! — зараўлі на розныя галасы мы.

Недзе з-за шырокай паповай рызы вытыркнуўся невысокі адкормлены хутаранчык з нейкай вялізнай кніжкай пад пахай. У яго быў тлусты падбародак, галава лысая, як тое калена. Апрануты ён быў у жоўтую кашулю, на якую была нацягнута зверху чорная марынарка, якая ледзь не пенькалася па швах.

— Я, дзеці, кіроўнік школы і адначасова буду вашым настаўнікам,— сказаў ён на польскі манер.— Будзеце называць мяне: пан Мацей Прохаравіч! Першы ўрок сёння правядзе свяшчэннік нашага прыхода айцец Апалінарый. А называцца гэты ўрок будзе — Закон Божы!

І пачалася тады наша муштроўка! Вучыліся нараспеў дэкламаваць «Ойча наш». Ногі падкошваліся, па спіне градам каціўся пот, а сесці нікому не дазвалялася. Ды, відаць, і папу не холадна было, бо і ён, мусіць, добра паспеў прапарыцца пад сваёй рызай.

Пасля пан Мацей Прохаравіч зліtаваўся. І, як толькі поп пачаў насавічком выціраць свой твар, абвясціў:

— Пшэрва!

О божа ты наш на небе, ці бачыш ты нашы пакуты? Нам здавалася, што прайшоў цэлы дзень, а на самай справе — толькі адзін урок. І праз момант пан Мацей, падсадзіўшы на воз айца Апалінарыя, зірнуў на свой карманны гадзіннік на бліскучым ланцужку, выцяг-

нуўшы яго недзе з-пад камізэлькі, загадаў вартаўніку школы крывому Леўку:

— Канец пшэрвы!

Той падняў над галавой званок, які, пэўна, быў перад гэтым зняты з шыі нейкай каровы, пазваніў на новы ўрок.

Пасля святога айца Апалінарыя, які заклікаў насіць у сэрцы бога, а на шыі — крыж з распятым Хрыстом, пан кіроўнік гэтак жа безапеляцыйна даводзіў, што нам трэба быць вернымі, як і богу нябеснаму, так і богу зямному — Гітлеру! Што гэта за зямны бог, да нашай свядомасці не даходзіла, а калі і даходзіла каму, дык вельмі слаба. Мы ведалі толькі адно — гэта самы галоўны немец, які загадвае падмятаць з нашай вёскі ўсё, што можна — жывёлу, хлеб, зімовую вопратку і асабліва яйкі і шпэк, сала, значыцца!

Мяне пан Мацей знатурыў на першым жа ўроку. Я не паспеў павярнуцца да свайго суседа па парце Федзі Сідарэвіча, як пан настаўнік тыцнуў у мой бок пальцам і загадаў устаць.

— Сава Малінчык! — са страхам прамармытаў я.

— Сава́ ты, а не Са́ва! — загрымеў магутным басам памазанік бога і Гітлера, зрабіўшы націск у маім імені на апошнім складзе.— На першы раз перасаджу цябе да дзяўчынак, а ў наступны раз... Тады пабачым!

Так я апынуўся побач з Хведаравай Волькай. Яна была крыху старэйшая за мяне, ад яе кулакоў у нашай вёсцы не адзін такі падшыванец, як я, насіў пад вачыма сінякі. Гэта мяне зусім збянтэжыла і прынізіла. Я заўсёды стараўся сядзець роўна, як праглынуўшы аршын, рукі мае ляжалі на парце нерухома да той пары, пакуль паварушыць іх не загадваў пан кіроўнік, калі трэба было нешта запісаць у сшытак. Я кожны раз адчуваў усёй сваёй істотай, што чырванею адразу да самых вушэй, адно толькі крывы Леўка блыхой падскочыць на даўжэйшай назе ды зазвоніць тым

счарнелым званком на чарговы ўрок. А на перапынку ўсе мяне пачалі дражніць:

— Сава́ — дубовая галава! Ідзі з Волечкай — згуляй полечку! Не працягвай рукі да мудрай навукі!

Але затое я вельмі дбайна рыхтаваўся да ўрокаў, таму прычапіцца да мяне пану кіроўніку ніяк не ўдавалася.

Аднаго разу пан кіроўнік загадаў усім нам прынесці на наступны дзень па жмені грэчкі, якую мы ссыпалі ў вядро, што паставіў на ганку школы крывы Леўка. Падумалі, што ў пана кіроўніка круп няма на кашу, бо жыў ён тут жа, пры школе, дык так бы і сказаў: прынеслі б гатовых круп! А то — грэчкі!

Але аднойчы нам стала вядома, для чаго расла на загонах нашых бацькоў пры Савецкай уладзе гэтая культура — грэчка!

Калі пан настаўнік быў чым незадаволены, ён адчыняў дзверы, і ў клас блыхой ускокваў крывы Леўка з тым вядром, у якое мы ссыпалі грэчку. Чалавек гэты пры панскай Польшчы таксама быў вартаўніком пры школе, а пасля два гады пры Саветах ён пракурыў, седзячы на прызбе каля сваёй хаты летам, а зімой — дзе ў запечку без усялякай справы. І вось цяпер ён зноў пры школе. Звычайна разам са званком у яго ў руках была і канапляная вяроўка, якую ён прыстасаваў насіць з-пад павеці дровы для школьных грубак, што аж калолі вочы сваёй бліскуча-белай кафляй. Калі што на перапынку выходзіла не па ім, ён падскокваў на здаровай назе да вінаватага і вяроўкай перацягваў хлапчанё па чым папала: па галаве, па спіне ці па нагах...

— Калі цябе пан кіроўнік не таму навучыў, дык я перавучу! — крычаў ён.— Вяроўкай перавучу, дык будзеш ведаць не на «пяць», а на «осім»!

А калі дзе недалёка ў гэты момант быў пан кіроўнік, ён толькі задаволена чмыхаў:

— Быдла трэба вяроўкай у навуку падганяць... Так яго, шыбеніка, так!

Першым паспытаў «методу» выхавання нашага настаўніка Рыгорка Казлюк. Хлапчанё гэта было слабенькае, дробненькае, расло без бацькі, які загінуў у польскую вайну, было крыху неспакойнае: не-не ды і крутанецца без дай прычыны за партай. Для яго ў першы раз і прынёс у клас тую грэчку крывы Леўка. Ён высыпаў палову грэчкі ля кафельнай грубкі, ухапіў Рыгорку за каўнер, загадаў закасаць вышэй каленяў слабенькія картовыя штонікі, паставіў хлопчыка голымі каленямі на грэчку, дастаў з-за грубкі тоўстае палена, даў яго ў рукі Рыгорку. Затым прымусіў падняць тое палена ў выцягнутых руках над галавой.

Мы ўсе аслупянелі ад страху. Рыгорка плакаў, палена апускалася ў кволых ручанятах на галаву, але крывы Леўка зноў выпростваў яму рукі. Скончылася тым, што хлопчык зусім аслаб, і яго худзенькае цельца пахіснулася да грубкі, забілася ў канвульсіях.

— Досыць! — загадаў пан кіроўнік.— Цяпер усе зразумелі маю «методу»? — звярнуўся ён ужо да нас.— Наматайце сабе на вус усе да аднаго! — пагрозліва закончыў ён.

Хлопчыка пад рукі давялі да парты і пасадзілі на месца.

І яшчэ была ў пана кіроўніка адна «метода». На першым уроку ўсе мы пасля малітвы клалі на парты свае рукі, пры праходзе пана настаўніка паварочвалі іх так, каб ён змог удасканаліцца, памыў ты іх сёння ці не? На вінаватых, хто дрэнна памыў рукі, паказваў пальцам. Тыя выходзілі з-за партаў і станавіліся ў шарэнгу ля стала настаўніка. Тады ён распяразваў свой жоўты рэмень, браў за пальцы рукі вінаватага і выносіў канчатковы прысуд:

— Пяць «гарачых»! — Рэмень маланкай узносіўся над галавой кіроўніка і пяць разоў агнём апякаў да-

лонь вучня. Калі ж той пачынаў плакаць, дабаўляўся яшчэ адзін «гарачы» для душэўнай раўнавагі. Так што кожны мацаваўся з усіх сіл, каб не пусціць, крый божа, слязу!

Мяне пакуль гэтая «метода» абыходзіла бокам. А тое, што дражнілі Савой, гэта не бяда! Хоць і злаваўся часам, што мяне параўналі з лупавокай птушкай, якая адно толькі што і здольная мышэй па начах лавіць! Але аднойчы і я трапіў пад усемагутную «методу»: у маім сшытку, у якім я добра парашаў арыфметычныя прыклады, нейкім чынам аказалася чарнільная пляма. Пан кіроўнік і мне паказаў пальцам на сярэдзіну класа. Усе цікавалі за мной: адзнакі ў класным журнале супраць майго прозвішча стаялі амаль што толькі выдатныя, і тут раптам...

Я стаў першым у чаргу да «методы».

— Адзін «гарачы»! — катэгарычна прысудзіў пан суддзя.

Ён ухапіў сваёй здаравеннай лапішчай за пальцы маёй дрыжачай рукі, размахнуўся з усяе сілы рэменем, і толькі той маланкай пачаў ляцець на маю далонь, я рвануў свае пальцы з лапішчы экзекутара і пад агульны рогат усяго класа схаваў руку за спіну. Рэмень секанў па тоўстым калене самога пана кіроўніка. Ён збялеў, затрымцеў усім целам, але падышоў да чарговага падсуднага і працягваў прыводзіць у дзеянне сваю «методу».

Клас зацята маўчаў. «Прыгавораных» пасадзілі за парты. Пан настаўнік выйшаў з класа, але ніхто мне не сказаў ні слова. Толькі мая суседка Волечка шапнула на вуха:

— От добра ты правучыў гэтага Лысага Бугая!

Яе падтрымка крыху супакоіла мяне. Але калі пан настаўнік вярнуўся ў клас і ўсе ўбачылі ў яго руках тоўстую кляновую лінейку, заціхлі. Пан кіроўнік, чыр-

воны, як тая жарына, подбегам падскочыў да маёй парты і загадаў:

— Лапу на парту!

Я абедзве рукі схаваў за спіну.

— Лапу на парту! — са слінай на губах паўтарыў ён.

Давялося падпарадкавацца: ён двойчы рубам лінейкі з усёй сваёй мядзведжай сілай урэзаў па маёй далоні, ад чаго адразу з'явіліся на ёй два тоўстыя сіне-чырвоныя рубцы.

— Працягнем урок! — нібыта нічога і не здарылася, сказаў ён, паглядзеўшы на ўвесь клас.

Я даў волю сваім слязам адразу ж, як толькі сышоў з высокага школьнага ганка. Не ад болю, не! Руку хоць і разнесла, як калодку, але трываць той фізічны боль было можна. Душа не прымала другога. Не хацела прымаць! Гэта было ёй не па сіле! Я, лепшы вучань класа, у якім зараз былі і колішнія друга- і трэцякласнікі, якіх пан кіроўнік спрабаваў «перавучыць» на новы лад, атрымаў, можна сказаць, і першы «прыз» яго бандыцкай «методы»!

Вучні, нібы па камандзе, сабраліся вакол мяне і імправізаваным хорам заскандзіравалі:

— Лысы Бугай! Лы-ысы Бу-угай!

На ганак школы блыхой выскачыў са сваёй вяроўкай у руках крывы Леўка. Усе мы рванулі да школьных веснічак. Да мяне падышла Волечка і ціха, з нейкай невядомай мне дагэтуль пяшчотай, мякка дыхаючы мне ў шыю, супакойвала:

— Не плач, Саўка! Мы яму адпомсцім за цябе...

Мне адразу зрабілася намнога лягчэй ад гэтай пяшчоты, ад яе ціхіх, але ўпэўненых слоў.

Ды лёгка сказаць: адпомсцім! Але як? Якім чынам? За яго спіной — немцы, уся вялікая Германія, а за намі хто? Пераляканыя бацькі?

На ганак выйшаў услед за вартаўніком і пан кіроў-

нік, цяпер ужо для нас навекі — Лысы Бугай! Ён нешта сказаў крывому Леўку, і яны пайшлі ў школу. Мы дамовіліся, што ніхто з нас больш не пойдзе ў школу на такія здзекі. Але назаўтра ж стараста Арцём Гачок з дапамогай некалькіх паліцэйскіх усё ж сабраў амаль усіх вучняў у школу. Схаваўся толькі на вышках, закапаўшыся ў мурожнае сена, я, прыхапіўшы з сабой невялікі запас харчоў.

Маці з бацькам бегалі па суседзях, пыталіся, ці не бачыў каторы з іх дзе мяне. Ніхто не бачыў. Я з вышак, са свайго надзейнага сховішча, чуў, як маці, доячы карову, плакала:

— А каб ты была згарэла ад маланкі, гэтая чортавая школа, як ты-ы ада-абрала ў мяне адненькае дзіцятка... Можна і без той школы навучыцца хадзіць за плугам ды е-есці хлеб і веяны, і сеяны...

Яна галасіла па мне так, як па нябожчыку, быццам мяне ўжо закапалі на могілках, адкуль я ніколі-ніколі ўжо не вярнуся дамоў, хоць я мог бы і зараз злезці з вышак ды супакоіць маці ад яе такога вялікага гора.

Усхліпваў у сене разам з ёю і я, але так ціха, каб яна, крый божа, не пачула: гэтым сапсую ўсю сваю рызыку!

І раптам на двары забасіў нечы яшчэ голас. Я вушам сваім не паверыў: пан кіроўнік!

— Дык, кажаце, не ведаеце, дзе ён зараз туляецца? — пытаецца мой самы люты на зямлі вораг.— Можа, у партызаны збег? Хі-хі!

— А што ж вы з ім на-арабі-ілі? — яшчэ галасней заплакала маці.

— Ён мяне ашукаў...

— Не трэба было ашукваць пана кіроўніка! — гэты голас ужо належыць старасту Арцёму Гачку.— Пан кіроўнік — ён жа і настаўнік дзецям, і начальнік нам усім цяпер ад новых улад...

— А божачка-божа! — галосіць маці.

Чуваць недзе недалёка і кашаль бацькі. Яго павучаў зноў той жа Арцём Гачок:

— Да папругі своечасова не прывучыў зад падшыванца, вось ён і натурыцца зараз...

— Хто яго ведае, як дзяцей сваіх вучыць: ці гэта ласкавым словам, ці часцей частаваць іх бярозавай кашай? — не разумее бацька.

А Гачок — сваё:

— Скура ў яго тонкая — ад сонца прасвечваецца... Нашаму брату толькі праз задняе месца розум да галавы даходзіць, тады яно будзе ўсё ладам ісці... Гэта бальшавікі валаводзіліся: сходы, мітынгі, песні там... Не, брат, у такой дзяржавы, як Германія, другія парадкі!..

Якія гэта такія парадкі, ён, мусіць, і сам не ведаў, бо перавёў гаворку зусім на іншую тэму.

— Можа, да цёткі на хутар збег? — пытаецца Гачок пра мяне.

«Чорта табе лысага! — падумаў я.— Каб і там, у цёткі, мяне знайшлі?»

На двары яшчэ крыху пагаварылі, крыху павойкалі ды і разышліся. А мама ўсё плача ў хляве. І я не вытрымаў.

— Я тут, мама! — азваўся з-пад сена я.

Яна ледзь не страціла прытомнасць ад той вялікай радасці, якая вядома ў такіх выпадках толькі маці.

У школу я прыйшоў аж праз тыдзень. Пан Мацей падышоў да мяне, я ўстаў з-за парты. Ён пагладзіў, як мне здалося, з вялікай брыдотай мяне па галаве і спытаў:

— Будзеш хадзіць у школу?

Я маўчаў.

— Вось табе за тое, што сёння прыйшоў...

І ён паспрабаваў усунуць мне ў жменю некалькі

белых манетак, якія я адмовіўся ўзяць. Тады ён грошы паклаў на парту і адышоўся да стала.

— Зараз у нас па раскладу ўрок арыфметыкі! — сказаў ён.

На перапынку мы ўсім класам пералічылі тыя грошы: іх было нешта каля рубля, нашымі, савецкімі, капейкамі, за якія мы перад вайной куплялі ў краме сабе цукеркі. Я раздаў іх усім пароўну. Не ўзяў толькі ніводнай капейкі сабе. Пасля я даведаўся, што гэтыя грошы далі яму ў мяне дома, каб «заахвоціць» мяне да навукі...

Хадзілі мы ў школу, нешта чыталі, пісалі, лічылі, але рабілі ўсё гэта з-за страху перад «методай» пана кіроўніка.

У вёсцы завялося некалькі бобікаў-паліцэйскіх, якія ўсё хваліліся, што хутка бальшавікам немцы зробяць каюк.

Але, мусіць, няпраўда, хлусня, што немцы ўзялі наш самы галоўны горад — Маскву? А хутка загаварылі, праўда, цішком, і пра партызан. І аднойчы я нават пачуў, як нехта ноччу да нас прыходзіў, каб дастаць машыннага масла, якога ў нас не было, але яго знайшлі ў бацькавага брата, дзядзькі Пятра, у якога была да вайны швейная машына. І была яшчэ адна радасць, калі мы дачуліся ад старэйшых, што нашага Лысага Бугая аднойчы зімовай ноччу наведалі лясныя госці і, гавораць, крыху далі пад бакі за здзекі над намі. А праз колькі дзён пасля гэтага выпадку пан кіроўнік знік са школы зусім, з'явіўшыся амаль праз год восенню ў вёску з павязкай паліцая на рукаве.

Ды і з'явіўся ён да нас нечакана: калі вяскоўцы прачнуліся аднойчы, дык убачылі, што ўся вёска была акружана немцамі ды паліцэйскімі: адны ляжалі дзе на ўзмежку за кулямётамі, другія стаялі невялічкімі групкамі, папыхваючы ў сонечным ранку сінім дымком цыгарэт.

Нікога з вёскі не выпускалі: нельга нават было выганяць на пашу кароў. Ды па жывёлу немцы і з'явіліся да нас, бо, відаць, вялікая Германія падсылала ім не вельмі вялікую падтрымку, таму харчы трэба было раздабываць больш на месцы.

Стараста Арцём Гачок паспеў аббегчы вяскоўцаў, наказаў, хто павінен на гэты раз загнаць у загарадзь на ўскрайку вёскі ці то карову, ці цялушку, або бычка... Не ганьбавалі немцы і авечкай ці якім падсвінкам.

Жывёлы назганялі шмат, яна раўла, тут жа мэкалі некалькі абстрыжаных авечак, квічэлі і тры свінні.

Па вёсцы бегалі немцы і паліцэйскія, трымаючы ў руках яшчэ жывых, а часам ужо і з адкручанымі галовамі, курэй ці пеўняў. Вяскоўцы стаялі кожны ля сваіх веснічак, сумныя і маўклівыя, каб, крый божа, не раззлаваць благім словам няпрошаных гасцей.

Арцём Гачок, мусіць, мужчын з пяць вызначыў, каб дапамаглі немцам і паліцэйскім загнаць гэты «кантынгент» жывёлы ў былы райцэнтр.

— Казаў разявам: вастрыце нажы ці косы ды рэжце жывёлу, бо ўсё роўна немец прапусціць яе праз свае шлункі! — апіраючыся на кій, гаварыў Хведар Клімковіч. Яго таксама прызначыў Гачок у пастухі.

— Ціха ты! А то праз твой язык усім можа ўляцець! — зашыкалі астатнія мужчыны на Хведара.

— Ат, раз давядзецца памерці, а не сто разоў! — махнуў абыякава рукой Хведар.— Сёння прыгалубяць, а заўтра — скуру злупяць,— не то сабе, не то каму іншаму гаварыў ён.

— Ціха, табе гавару! — сказаў да Хведара Лявон Кудзелька.

Хведар на момант заціх, пасля гучна пракрактаў, шмаргануўшы носам.

— Няхай сёння твая сучка сані вязе, а мая ўлегцы бяжыць,— незадаволена буркнуў ён на Лявона і закурыў.

Сонца падбіралася пад поўдзень, немцы пачалі збірацца ў дарогу.

— Вось бы дзе нашы заселі ў хваіне на могілках, сама што з рукі іх там спаткаць, гэтых ваўкарэзаў! — сам сабе пад нос прабубніў Хведар.

— Што, шкада з кароўкамі развітвацца? —запытаў пан Мацей, які падышоў да мужчын, пачуўшы незадаволенае Хведарава крактанне. Пан Мацей, пэўна, не разабраў, аб чым гаварыў Хведар, таму ён лісліва ўсміхаўся:

— Бальшавікоў біць не паздужаеш з пустым жыватом! Ды немец — цывілізацыя, ён не будзе гічанамі буза напіхваць, яму катлетку падавай, тады ён і паваюе як след!

Хведар нічога на гэта не сказаў, толькі калюча паглядзеў на пана Мацея.

Нечая карова пераскочыла праз плот і з усіх ног кінулася да свайго двара.

— Чаго стаіце, лапавухія, павывальвалі бельмы? — закрычаў пан Мацей на мужыкоў.— Трымайце карову, разявы!

Але ад гэтага крыку ніхто не скрануўся з месца. Тады пан Мацей і яшчэ двое паліцэйскіх і адзін немец, не згаворваючыся, пайшлі ў бліжэйшы двор, да ўдавы Марылі Кот, выгналі з яе хлява карову. Тая паспрабавала павярнуць жывёліну назад у двор:

— Красуленька мая, Красуленька! Вярніся ж ты назад у хлявец, там цябе цялятка чакае, дасі яму малачка!

Але ў гэты час пан Мацей груба адштурхнуў Марылю ад каровы і буркнуў:

— Забярэш сабе вунь тую цялушку, што пабегла да некага дамоў, ты яе, напэўна, ведаеш, чыя яна?

— А хто-о ж мне я-яе аддасць? — не пераставала галасіць Марыля.

— Атрымаеш адпаведны дакумент на тое, і няхай

адно хто адмовіцца выконваць нашы загады! — запэўніў пан Мацей.

— А мне ж не дакумент трэба, а ка-ароўка, каб дзяток на ногі паставіць! — працягвала ісці за каровай Марыля.

Я стаяў побач з дзядзькам Хведарам, да якога падышоў мой былы настаўнік пан Мацей.

— Заганіце яе ў загарадзь! — загадаў ён Хведару і паказаў пальцам на Марыльчыну карову.

Хведар валюхавата адсунуў жардзіну заставак і моўчкі загнаў жывёліну ў статак «кантынгента».

— Ды пільнуйце лепш, калі вас на тое паставілі, бо...— пагрозліва буркнуў пан Мацей.— Чыя гэта была карова? — запытаў ён немаведама ў каго пра тую жывёліну, што ўцякла з загарадзі.

Усе паціснулі плячыма: маўляў, хто яго ведае чыя? Цяпер і людзей стараешся ведаць не ўсіх, не тое што кароў...

— А-а Сава́ — дубовая галава? Не паляцела яшчэ ў ельнік да бандытаў? — убачыў мяне мой колішні першы «настаўнік».— Вунь як ты выцягнуўся. Хутка, мусіць, міны будзеш пад нямецкія цягнікі падкладваць? Хе-хе! На, во, вінтоўку ды павучыся, як з яе страляць, спатрэбіцца,— працягнуў ён мне вінтоўку. Я схаваў свае рукі за спіну, як некалі ад той кляновай лінейкі ў школе.

— Навучыў я цябе, куды трэба хаваць свае лапы? — смяшліва запытаў пан Мацей.— Не баляць яны яшчэ дагэтуль ад той кляновай лінейкі, хе-хе?

Я маўчаў, апусціўшы вочы.

— Ну, тады на, бяры, во, гранату, рыбы наглушыш у возеры! — тыцкаў мне проста пад нос гранату-«лімонку» колішні пан кіроўнік.— Пры бальшавіках баяліся глушыць рыбу, а цяпер глушы колькі ўлезе! Воля!

Я і ад гранаты схаваў свае рукі за спіну.

— Трасешся ад страху? — незадаволена запытаў пан Мацей. Ён падышоў да мяне, абхапіў левай рукой за шыю, а пальцамі правай пачаў хутка-хутка тыцкаць мне ў рэбры, у жывот:

— Пух-пух-пух!

Тыцкаў ён з такой вялікай асалодай, так балюча, што я аж заплакаў. За мяне заступіўся дзядзька Хведар.

— Пашкадуйце хлопца, пан кіроўнік! — папрасіў ён.

Той нічога не сказаў, але перастаў душыць мяне за горла, адпусціў і моцна даў пад зад нямецкім ботам. Так, што я аж носам зараў зямлю, падхапіўся і з усяе моцы пабег дамоў, залез на вышкі, закапаўся ў леташняе сена.

Пасля крыху аддыхаўся, падпоўз да шчыта, праз акенца ў ім мне добра быў бачны пан кіроўнік, які ўжо ў каторы раз пералічваў у загарадзі жывёлу. Было чуваць, як ён павучаў вяскоўцаў:

— Пры немцах трэба вучыцца жыць па-нямецку: у іх адно — што слова, што справа! Сказаў — зрабіў! Не тое, што было ў бальшавікоў: сем разоў адмерае, а ні разу не адрэжа па-людску!

Цяпер пан Мацей да школы ніякага дачынення не меў, бо яна сама па сабе разваліласе на радасць усім нам, былым школьнікам. А пан кіроўнік усё павучаў:

— Палешуку белы хлеб маслам намаж, а ён будзе руку да свіной бульбы цягнуць, каб яна ражкай яму смярдзела! Цьфу! Немец нясе яму цывілізацыю, а ён у карчы ад яе пабег: бальшавікі навучылі гультаяваць, цяпер гэтую сапсаваную галаву да добрай справы інакш не павернеш, як гумай... Калі зад пачэшаш, дык і галава на патрэбнае месца ўсталюецца...

— Я ж тое казаў і буду казаць ім! — паддаквае стараста Арцём Гачок.

— Ды навошта гэтае быдла і наогул на свеце жыве? — не разумее пан Мацей.

— Навошта, паночкі, жывём? А проста жыць хочацца, раз нарадзіліся, як і ўсім добрым людзям! — кажа дзед Тарас.— А ў рай мы і самі хацелі трапіць, ды грахі за лапці назад цягнуць... А паляжаць вельмі хочацца, калі касой памахаеш ад узыходу да заходу сонца ці за плугам набегаешся... А нас часам не ў пару і патурбуюць, дык чаго спрасоння не буркнеш, вядома? Кроў у нашых жылах цячэ не гэтая... малярыйная!

— Арыльская! — удакладняе староста Гачок, пазіраючы вакол, каб удасканаліцца, ці ўсе яго палічаць за гэткае мудрае слова разумнейшым за сябе...

— Колькі разоў цябе вучыў: немцы — нацыя арыйскай крыві! Божай крыві! — павучае старасту пан Мацей.

— Няхай будзе і так! — згаджаецца Гачок.

Да натоўпу людзей, якіх павучаюць паны паліцэйскія, як зараз трэба любіць і паважаць блакітнакроўных немцаў, падышоў нямецкі афіцэр.

— Што гэтае мужыччо хоча? — спытаў ён на сваёй мове ў пана Мацея праз перакладчыка Мікодыма Канапельку.

— Кажуць, каб немцы хутчэй вылавілі тых лясных бандытаў, дык бы пад немцамі зажылі б вальней! — не міргнуўшы і вокам, схлусіў пан Мацей.

Мікодым пераклаў гэтыя словы на нямецкую мову.

— Ё-ё! — задаволена затрос барадой афіцэр.

— Пан афіцэр кажа: той добры беларус, які ўмее верна служыць свайму пану! — ужо вяскоўцам схлусіў пан Мацей і паглядзеў на Мікодыма. Мікодым Канапелька злосна, але каб не чуў і не бачыў нямецкі афіцэр, сплюнуў і адышоўся ўбок, буркнуўшы сабе пад нос пра пана Мацея: «Мярзотнік!»

Пан Мацей пачуў Мікодымава бурканне, але не

разабраў, што той сказаў пра яго. І добра, што не разабраў!

— Шкада, што школа развалілася! — сказаў ён, пазіраючы на маўклівыя твары вяскоўцаў.— Вось няхай толькі вылавім усіх лясных бандытаў, а пасля зноў возьмемся за навуку...

«Лысы Бугай! — адразу ўспомнілі гэтую мянушку ўсе былыя вучні, чые вушы слухалі зараз пана Мацея.— Не дабілі цябе партызаны ў тую ноч, калі былі злавілі ў тваёй бакоўцы, дык яшчэ натрапіш ты на іх кулю, не можа таго быць!»

— Няхай ужо мы без навукі мардаваліся! — мудра разважае Арцём Гачок.— А маладзейшым немец дасць у вочы...

Але што дасць нам усім немец у вочы, Арцём не дасказаў: там, за вёскай, ля самых могілак, дзе размясціліся салдаты, якіх знялі з ланцуга акружэння на прывал, засакаталі кулямёты і аўтаматы, завухкалі вінтоўкі, час ад часу былі чуваць выбухі гранат.

Бой тады цягнуўся ледзь не да самага вечара. Людзі ўсе разбегліся хто куды: думалі, што немцы дачакаюцца падмогі, але яе чамусьці не было. Тады, калі партызаны адступілі крыху ў лес, немцы не пагналіся за імі наўздагонку, а, пагрузіўшы на падводы сваіх забітых і параненых і пакінуўшы забітых паліцэйскіх, відаць, у вялікай мітусні не паспеўшы расправіцца з нашай вёскай, падаліся ў свой гарнізон.

У тым баі і ўклала трапная партызанская куля пана Мацея. І мы толькі пасля вайны даведаліся, што наш першы «настаўнік» быў агентам польскай дэфензівы да трыццаць дзевятага года, пасля недзе перасядзеў два гады пры Савецкай уладзе, а ўжо пры немцах знайшоў сабе новых гаспадароў — гестапаўцаў!..

...У кожнага з нас быў свой першы настаўнік, імя якога мы шануем нараўне з імёнамі сваіх бацькоў. А наш першы «настаўнік» — Лысы Бугай,— столькі

ўсяліў у нашы душы страху, што мы ўсю вайну трымцелі, баяліся адной думкі, што некалі зноў пакліча школьны званок сесці за парты! Баяліся таго настаўніка, як агню якога! Аж пакуль у сорак чацвёртым не выбіў з нашых душ і галоў гэтае ўяўленне другі чалавек...

Але пра яго мне хацелася б расказаць неяк іншым разам.

## «Памагаты»

Вітаецца ён са мной заўсёды, зняўшы капялюш і зрабіўшы нізкі паклон.

— Са зваротам вас да родных пенатаў, Пётр Пятровіч! — скажа і заўсміхаецца сваімі вадзяністымі вачыма.— Пайшла-пабрыла моладзь па ўсім свеце, цяпер ужо яе ніколі не сабярэш разам на адзін хутарок... У кожнага — свая каляінка ў жыцці, кожны на ўласных колах у рай едзе-спяшаецца...

З яго вачэй цякуць слёзы: ці то ад радасці, ці суму, цяжка разабрацца, бо гэты чалавек і зараз для мяне такая ж загадка, як і тады, у першую пасляваенную вясну.

— То, мусіць, на грашах зараз спіш, грашовай коўдрай і ўхутваешся? — выціраючы далонямі слёзы, зноў хітравата пазірае на мяне стары Мікодым.— Спіш на грашах, а пешкі ходзіш? Хі-хі! Трэба, каб легкавушка каціла штораз дамоў! А так, як хадзіў тут пешкі, так і ходзіш, толькі ногі з лапцяў перасяліліся ў чаравікі... Праўда, крыху пакруглеў, а чараўко — хоць аддавай на начоўкі якой гаспадыні... Хі-хі!

Мне брыдка слухаць гэтага чалавека, але дзеля прыліку я стараюся, хоць і праз сілу, быць з ім лагодным, памяркоўным, быццам ён ніколі ні мне, ні каму іншаму нічога кепскага не зрабіў.

Ён лыпае вадзяністымі вачыма і хітравата выпытвае: як я жыву, чаго ў вёску завітаў, ці доўга ў ёй забаўлюся?

— Раней кожны свой раток разяўляў на багаты хутарок, а цяпер...— Ён махаў рукой і заціхаў. Апускаў

вочы долу, плямкаў мокрымі ад сліны губамі, нешта сам сабе шаптаў, каб ніхто пабочны не чуў яго.

А я пры сустрэчы з Мікодымам заўсёды ўспамінаю маці і балючыя слёзы на яе вачах.

...Вестку пра Перамогу прывёз на наш хутар Мікодым, які ездзіў нечага ў раён, дзе і даведаўся аб гэтай радаснай падзеі. Але гэтая агульная радасць, як мне тады здалося, не надта хвалявала Мікодыма: яму загадалі ў сельсавеце, каб ён на сваім чырвоным вале абараў і абсеяў усіх салдатак хутара, а пасля яшчэ і ў вёсцы памог таму-сяму.

— А хіба я вінаваты, што толькі ў аднаго мяне і застаўся вол на ўвесь хутар?

Ды і на самай справе, на сем гаспадарак, якія былі на Чамялоўскім хутары, з цяглавай сілы толькі і застаўся што вол у Мікодыма ды сівая кабылка ў Арыны Шальпук, муж якой памёр ад ран яшчэ ў партызанскім атрадзе. А Арына што? Да касы не прыстасавалася, плуг яе не слухаўся, таму ў конскіх яслях не было ні сена, ні аўса. А святым духам жывёліна карміцца не ўмела, так што давялося і Арыне пасярод зімы клікаць Мікодыма, каб дапамог падвесіць тую кабылу на вяроўцы пад бэльку, бо зусім асунулася на ногі, а з падсцілам была гэткая ж бяда, як і з кормам. Дык кабыла можа ўмерзнуць у гной ды так і скачанець, не дачакаўшыся вясновай траўкі.

Мікодым паглядзеў на кабылу з усіх бакоў, ударыў наском свайго бота пад калена пярэдняй нагі жывёліны і зазначыў:

— Каб аўсом пачаставаць гэтую сіўку, яшчэ б яе ногі напасілі б не адзін год! А так — скура ды косці, а страўнік яшчэ здаровы, ён просіць до-обрай яды... А яда сіўцы толькі сніцца!

І як ні ўпіраўся Мікодым, але яго ўсё ж прымусілі па чарзе абворваць хутаранцаў.

Сёння ён павінен быў садзіць бульбу нам. Маці рых-

тавалася да гэтай падзеі, як да якога свята: і двор падмяла, і парэзаную бульбу ўхутала нейкай новай радзюжкай, бо Мікодым па ўсім хутары, пасля па ўсёй вёсцы разнясе: датлявае на корані Агрыпіна, яе ўжо і вясна не ачуняе...

Мікодым меў язык доўгі, гэты язык больш плёў брыдкія словы, а вушы яго чулі толькі тое, што было трэба Мікодыму: хто ў каго з плачам пазычыў які пуд жыта, у каго ў якім месцы парваныя нагавіцы ці кашуля. Мы проста дзіву даваліся, як гэта ўсё было вядома яму, Мікодыму? А ён жа ездзіў ад хаты да хаты на вале і вывіжоўваў сваім касавокім позіркам усё, што было яму патрэбна, каб пасля абхаяць таго ці іншага вяскоўца.

Заехаўшы да нас у двор, ён, перш чым павітацца з маці, захіхікаў:

— Сама на ступе спіць ды бараной ухутваецца, а вунь якую панскую коўдру на бульбе гноіць! Хі-хі! Пры такім гаспадаранні і пан без портак у свет за адзін гадок пабяжыць, не тое што якая ўдава-салдатка, хі-хі! Розка да розкі — будзе венік, хі-хі! Ну, дзяньдобры, калі што! — пасля сваёй пропаведзі прывітаўся ён.

— Добрага здароўечка, Мікодымка! — пачырванеўшы, вітаецца маці.— Я ўжо і пазаўчора, і ўчора вочы праглядзела, усё бегала да броду, можа, у другіх раней управіўся, дык пад'едзеш...

— «Пад'едзеш!» — незадаволена бурчыць Мікодым.— Вам абы сёлета хутчэй бульбіну пад плуг укінуць... А мне цяглавая сіла будзе трэба і ў восень, і зімою палена якое пад прыпекам трэба будзе мець, ды зноў жа і ў наступным годзе будзе вясна! Га? Будзе, кажу, ці не?

— Чаму ж не будзе, Мікодымка? Дачакаемся, дасць бог, і той вясны, калі будзем жывы ды здаровы...

— А-а, дачакаемся, значыцца? А тады і араць трэба будзе зноў, і сеяць... Салдаткам, пагаворваюць, хут-

ка коней нямецкіх ці то бельгійскіх будуць раздаваць... А Мікодыму што дадуць? Сыра з чырвоным перцам пад нос ці грушу-«дулю» з бальшавіцкіх пальцаў? Вось што Мікодыму дадуць! А валіка, можа, хутка і пад нож загадаюць весці ў раён... Чуў ад добрых людзей!

— Вайна ж скончылася, дык навошта ж жывёліну рэзаць?

— А з гапонцам яшчэ ваююць, і колькі будуць ваяваць, самому богу невядома! А мяса есці салдату трэба? Трэба! Ну, то работа работай, а каб пот не так з чупрыны ліўся, трэба крыху падсілкавацца,— разважае Мікодым.

— Дзіва ж што трэба! — згаджаецца і маці.— То хіба зойдзем у хату?

— Я ж не сабака, каб на двары костку грызці, хі-хі? — злосна жартуе Мікодым і пазірае на мяне. Потым падыходзіць зусім блізка, бярэ рукамі за мае рукі вышэй локцяў, круціць галавой.

— Паваліць яшчэ плуг лайдака! І ногі не ўтрымаюцца ў баразне! Самому давядзецца хадзіць за плугам, а гэта двайная будзе плата... Што вазьму бульбай, а што і другім чым,— ляпнуў ён рукой маці ніжэй спіны.

У маці задрыжэлі губы, закалаціліся рукі, яна адвярнулася ад мяне і цішком выцерла далоняй горкія ўдавіныя слёзы. Я таксама дрыготка засоп носам, але слязу не пусціў...

— Ой, Лявончык мой! Чаму ж ты мяне з Петрыкам да сябе на неба не паклічаш? — не вытрымала маці і заплакала-загаласіла на ўвесь двор.

— Пакліча, калі прыйдзе час, не забудзе! — як аб нечым зусім звычайным разважыў Мікодым, але ўжо не хіхікаў, як гэта рабіў амаль за кожным словам да гэтага.— А цяпер, тым часам, трэба пакуль што пра зямлю хваляваціца... Будзе ў цябе лад на зямлі, і на неба перастанеш прасіцца... Неба толькі для дурняў рай, а зямля — для разумных, хі-хі!

Маці крыху ўзяла сябе ў рукі, нават заўсміхалася гэтаму Мікодымаваму жарту. Павесялеў і я. А Мікодым сваё:

— Сельсавет мне загадаў абворваць, абсейваць салдатак за будзь здароў, за вецер у цыганскім кашальку, гэта так: супраць улады нікуды не папрэш — пан сваім бізуном каля носа размахваў, немец — штык да горла падстаўляў, а бальшавік што, памілуе? Хі-хі! Ось і езджу, выпрамляю вашы крывавыя барозны, каб у нагавіцах ззаду не пякло. Хі-хі! Гэта пакуль на немца ісці трэба было, то бальшавікі — усё лёстачкамі, усё лёстачкамі... А няхай толькі крыху акрыяюць, як тыя антыхрысты распаўзуцца па хатах: мяса — давай, малако — налівай, грошы — дзялі і на нас! Пабачыш, галубка, што яно так і будзе!

— Няўжо ж зноў будзе так, як было пры панах ды немцах? — знарок лісліва дзівуецца маці.

— Усякая ўлада ад бога, а гэта значыць, што яна і аднолькавая — аднаго бога падчарыца! От і памяркуй сама з сабой: будзе бог сваю ўладу перайначваць, калі праз год-два яе спрабуюць замяніць на зямлі людзі? Не, мамуся, таго ён ніколі не дапусціць! Раз завёў свой гадзіннік на небе, на зямлі да таго гадзінніка ключа не падбярэш... Усё будзе так, як з неба загадваюць: Мікодыму вала належыць мець, а Агрыпіне трэба частаваць і Мікодыма, і яго вала...

— Дык гэта ж не бог, а сельсавет загадаў! — смяецца маці.

— А хто сельсаветчыкам у галаву ўбіў такое рашэнне рашыць? Га? Не бог! Памажы свайму бліжняму, і на небе я табе аддзячу з працэнтамі!

— А нам абы бульбу ў зямлю ўваткнуць, а па чыёй гэта волі: божай ці сельсавецкай — не важна, абы тая бульба добра расла!

— Ва-ажна! — валтузіцца Мікодым і пазірае на вулей-калоду, які падпіраў камель старога дуба, яшчэ

голага, без лісця.— Я і сам разумею: памёршая рука і самому богу капейку не падасць! А жывая... Тая можа! Не цяпер, дык у чацвер!

Мікодым нешта мнецца, як голы перад лазняй, пасля падыходзіць да вулля, стукае па ім сваім заскарузлым кулаком і пытае:

— А пчолка, мусіць, ужо год дзесяць, як сюды дарогу забыла? А на дровы такую рэч пускаць грэх...

— Яшчэ з польскіх часоў тут гніе,— тлумачыць маці.— Лявон нагледзеўся недзе, як латва мядок з гарачай вадзіцай ды сухім хлебцам у рот пасылаць, дык і меркаваў дзе-небудзь які рой у лесе падлавіць...

— От бачыш, на чужое ўсё раток свой разяўляў: не купіць намерваўся, а падлавіць... А ў мяне якраз аднаго вулля на гэтае лета і забракуе...

— Ну дык бяры яго сабе,— узрадавалася маці, што будзе чым адплаціць Мікодыму за работу.— Ён тут так, стоячы, і прападзе, а ты, Мікодым, можа, калі і мядком пачастуеш...

— Святой вадзіцай на пакрову, калі трутні наносяць, не адмоўлюся, пачастую, хі-хі!

— Няхай будзе і так,— нічога не разумее маці і ідзе да хлява па якое каліва сена, што яна падрыхтавала для Мікодымавага вала.

— Ну дык на пакрову бяры вялізны жбан ды прыходзь па трутневую ваду...

— То зойдзем у хату ды перакусім, а то і так ужо свіныя галасы...

Маці падкінула Мікодымаваму валу пад пысу сена, а сама падалася ў хату, каб прыгатаваць Мікодыму пачастунак. А я тым часам падбег да вулля і пачаў праз вялізную адтуліну выграбаць з яго нямецкія патроны, хаваючы за пазуху так, каб не бачыў гэтай маёй работы Мікодым. Гэтыя боепрыпасы трапілі сюды яшчэ пасля аднаго партызанскага бою з немцамі, на месцы якога я з хлопцамі і знайшоў цэлую скрыню з патро-

намі, якія мы пароўну падзялілі паміж сабой. Пасля часам імі пастрэльвалі дзе ў лесе, укінуўшы адразу некалькі патронаў у касцёр. Яны стралялі не ўсе адразу, а па чарзе, і гэта нам было вельмі цікава: ішла вайна, ва ўсіх быў ваенны настрой! Стралялі да таго часу, аж пакуль не шрамнула Колю Куніцкага нагу ніжэй калена. Пасля гэтага мы стаіліся, а там некаторыя і зусім забыліся пра свой занятак ранейшы, пайшлі ў школу.

— Ата-та-та! — лаяўся на вала Мікодым.— Каб цябе ядухі з'елі! А яно і ты за адным сенам роўную баразну не пацягнеш! Трэба і табе да хлеба кавалачак сала з'есці, каб плуг глыбей у зямлю лез!

Я азірнуўся: Мікодым адгарнуў квятастую радзюжку, якой была ўхутана бульба, нагроб у вялізную каробку бульбы і сыпануў яе валу пад пысу, што аблізваўся языком, чакаючы такога багатага пачастунку. Мяне як хто мехам з мохам ударыў па спіне, з маіх рук пасыпаліся патроны. Ухапіўшы нейкую палку, я памчаўся проста на Мікодыма. З-за пазухі на бягу паляцелі патроны на зямлю, але я на гэта не звяртаў цяпер ніякай увагі.

Падбегшы да Мікодыма, я тройчы ўдарыў яго па самай шыі ламачынай. Той павярнуўся да мяне, і чацвёртым ударам я ўгадзіў свайму ворагу ў самы нос, з якога палілася на зямлю чырвоная юшка.

— Ай-яй! — зароў Мікодым.

На яго і мой крык выбегла з хаты маці. Яна сашчаміла рукі над галавой і заверашчала:

— Ой, што ж ты, Пятрок, на-ара-абіў?

А я ўсё валтузіў Мікодыма. У гэты час вол, не зважаючы на нашу чалавечую валтузню, дацягнуўся да бульбы пад радзюжкай, пачаў яе слюнявіць сваім языком.

— Ой, божачка! — яшчэ гучней загаласіла маці.— Ой, зусім асіраціў цяпер нас: вайна пакінула без гас-

падара, а гэты жмінда яшчэ і без апошняй бульбіны!

Мікодым ускочыў на воз, упёк пугай валу пад чэрава і, пераехаўшы коламі цераз усю бульбу, якая толькі трашчала пад абадамі колаў, выскачыў за вароты.

Маці рвала на сабе валасы, праз акно пазірала сівая галава бабулі Насты, якая нейкім чынам дабралася да акна ад палацяў, на якіх ляжала ўжо ад самых каляд, не разумеючы, што такое здарылася на двары. Пасля і яна загаласіла:

— А чым жа цяпер пакормім нашых шко-ольнічкаў?

Гэта бабулька непакоілася не толькі за мяне, але і за Мішку і Кацьку, якія зараз былі ў школе, а я застаўся, каб дапамагчы маці пасадзіць бульбу.

Маці поўзала на каленках і, як тыя залатыя шрацінкі, сабірала і раздаўленую, і цэлую бульбу ў адно месца.

— А я ўчора ледзь не заду-ушы-ыла-ася, пакуль ад сястры за сем вёрст той пудзік бульбы прывалакла, каб увосень было што дзеткам на стол па-асы-ыпаць...

Плакаў побач і я.

...Прайшло шмат часу з таго дня, я іншы раз і забуду пра той выпадак, хіба толькі часам ува сне зноў аддубашу Мікодыма па шыі ды па носе палкай... Але калі гэты колішні багаты хутаранец мне напаткаецца часам у вёсцы, куды я часта прыязджаю летам, скіне свой цяпер ужо зашмальцаваны капялюш і пачне ім вітаць мяне: «З прыездам да родных пенатаў!» — я яго зусім не бачу, а бачу сваю маці, і не саму маці, а тыя яе балючыя слёзы, якія і зараз пераварочваюць ува мне ўсю душу...

І мне не хочацца нават па-чалавечы павітацца з ім...

# Бяздзетуха

Самае вялікае гора для жанчыны — пакідаць жыццё бяздзетухай. Гора гэтае не аднадзённае, якое некалі можа раптам патухнуць, а гняце, душыць з самай той хвіліны, калі жанчына адчуе ўсёй сваёй душой, пераканаецца розумам, што яна ніколі не стане маці.

Мар'я ўжо, мусіць, трэція суткі ляжыць на халодным ложку, у астылай хаце, п'е толькі халодную ваду, ды дзе там п'е — ледзь-ледзь змочвае губы, каб зусім не згубіць прытомнасць, каб дачакацца некага жывога, хто б распаліў у печы, падаў ёй хоць непадсалоджанай гарачай вадзіцы.

Яна ўжо і спрабавала крыкнуць, каб хто за вокнамі пачуў яе, але ж замест колішняга крыку з горла вылятала толькі ледзь чутнае сіпенне, якое і ў сенцах не ўсякі пачуе, не толькі што з вуліцы.

Калі памёр Адам, сяк-так мацавалася: і палена ў хату сама прынясе, і вады ў калодзезі зачарпне з маладой рызыкай, а зараз...

Тры тысячы рублёў аддала пляменніцы Дуні, каб да смерці яе даглядзела, але тая прапіла грошы, на цукерках прасмактала ды і забыла пра яе, Мар'ю, трэці дзень не прыходзіць.

«Аха-ха! — стогне Мар'я.— Некалі хацелася ўвесь свет праглынуць, ды яшчэ і таго здавалася мала. А цяпер — во, хутка вошы па целе пойдуць, не варушышся, бы тое палена дубовае, што да зямлі прымерзла, вочы яшчэ ў бакі варочаеш, а цела...»

Усхліпвае Мар'я, сябе праклінае, што адмовілася пасля смерці Адама ў дом састарэлых пайсці: сваёй

нямогласці пасаромелася, каб чужыя людзі не бачылі, якая яна слабая, а так — капейка ў яе за жыццё нажылася, дык за грошы табе людзі якую хочаш ласку акажуць, не можа таго быць!

Але вось як яно выйшла: грошы Дуня прапіла, а пра яе забыла — канай, Мар'я, калі грошы скончыліся!

А не — пашукай каго за здароў будзь, няхай качае тваё дубовае цела па ложку ды мяняе мокрыя радзюжкі... Бо такі, Мар'я, як ты, чалавек не мае права цяпер на чыстай прасціне цешыцца, не, не мае!

«Эх, за багаццем душа пацягнулася: у Адама зямлі — за цэлы дзень не аббяжыш! Хацелася папанаваць: на наймічак па-гаспадарску пакрычаць, парабкаў пад пятой трымаць... А выйшла вунь як: за тое багацце, а больш — за парабкаў ды наймічак — Адам у Сібіры здароўе загубіў, і я, во — бяздзетухай чэзну, хутка зусім са свету знікну, не пакінуўшы на зямлі ні сынка, ні донькі... Не я свет праглынула, а мяне — зямля праглыне і ніякага следу не пакіне...»

У Мар'і ажно ружовец на шчоках знайшоўся, калі яна пачала думаць пра сваё жыццё з самага пачатку: Максім, здаравяк, чырвоны, як той бурак, амаль па пятках бегаў за ёй, але яна нават коса лянілася зірнуць у яго бок.

— Не пераходзь, Максіме, Адаму дарогу, бо гэта для цябе дабром не скончыцца,— сказала яна неяк на тройцу Максіму.

— Значыць, ганьбу даеш? Канешне, у Адама брат у панскіх лёкаях ходзіць, а зямлю — брату аддаў: раскашуй, браток, жаніся на першай прыгажуні наваколля, а пасля... будзе бачна, чыёй авечцы бакі абстрыгчы!

І во, багацце пры Польшчы было, як у таго ксяндза ці памешчыка, а дзяток усё бог не даваў. Колькі слёз Мар'я праліла, а бог усё не глядзеў у яе бок, не пасылаў ёй мацярынскага шчасця.

А пасля пайшло-паехала! Ажно ўсяго і не ўспом-

ніш! Больш за ўсё ўспамінаецца абман, абман роднай пляменніцы Дуні, дачкі Адамавага брата Арцёма.

— Цётачка мая залаценькая, ніхто так цябе, як я, не дагледзіць: будзеш ты ў мяне, як смятана ў піве, цешыцца, людзі пазайздросцяць — цяплей за родную дачку цябе абагрэю...

Заплакала тады Мар'я, на ўсю хату заплакала: ёй зусім не было вядома тое шчырае пачуццё, якое адчувае маці на старасці год ад роднай крывіначкі, ад свайго працягу на зямлі — дачкі.

— Усе мае грошыкі бяры ды карыстайся імі, як сваімі ўласнымі! — праз плач казала Мар'я.

І тая пачала карыстацца: кожны вечар да Мар'і сабіраліся Дуніны сяброўкі: Вера Кудзелька, Насця Якімчук ды Поля Ганніна... А затым на агеньчык пацягнуліся і мужчыны — хто разведзены, а хто толькі сабіраўся разводзіцца...

— Тваё здароўе, Мар'я Авакумаўна! — скрыпела п'яным ротам Ганніна Поля.

— У карысць, дзеткі, у карысць! — жадала дабра сваім гасцям Мар'я і сама прыкладвалася, чыхаючы і кашляючы, да чаркі. Крыху захмялеўшы, прасіла, каб яе пасадзілі, падклаўшы пад спіну рознае хатняе рыззё, і зацягвала песню:

Там каля млына —
Цві-іце каліна...

Дзяўчаты і хлопцы — хто ў боб, хто ў гарох! — памагалі Мар'і, тая хутка замест спявання пачынае румзаць, смаркацца, пасля заціхае зусім, унурыўшыся ў смярдзючую хустку.

— Эхма! — застогне праз які момант і зноў ажыве, спалохана азірнуўшыся на ўсіх, хто ўжо добра-такі падвесяліў сябе віном.

— Піць будзем сёння да ўпаду! — тупае нагой Дуня і лезе да Мар'і цалавацца.— Ці горш я цябе, цётка

Мар'я, даглядаю, чым родная донька, га? Ну, скажы? Цму! Цму! Не адварочвайся, не адварочвайся, Мар'я Авакумаўна,— заслужыла ты такое шкадаванне ад мяне... Цму! — цмокае губамі ў маршчыністую шчаку Мар'і Дуня.— Яшчэ, Мар'я Авакумаўна, на краму людзі замок не павесілі! — крычыць яна і тупае нагамі:

Ой, піць будзем
І гуляць будзем...

Мар'я ведае, што ёй зараз трэба працягнуць руку пад падушку, дастаць адтуль шарсцяную шкарпэтку і даць Дуні чырвонец.

Дуня спрытна выхоплівае з Мар'іных рук паперку, круціць яе над галавой, цалуе і крычыць:

— Полька! Паша мілая! Адной табе давяраю: на ўсе — «кавы», каб перад людзьмі не было сорамна!

Ой, піць будзем
І гуляць будзем...

— Ай, дзетачкі вы мае! — зноў румзае ў рукаў Мар'я.— Каб можна з сябе душу дастаць, дастала б ды вам аддала, не пашкадавала... Мне цяпер нічога не трэба, адной спагады людской сэрца прагне, шчырасці ды ласкі перад смерцю хочацца...

А калі пад падушкай нічога не засталося, Мар'іна хата апусцела і ад п'янай Дунінай шчырасці, і ад нахабнай ласкі Пятра Карпука, які ўвесь час, калі падымаў угору чарку, кляўся:

— Дуню пад вянец павяду! Сорак год сабіраюся знайсці сабе пару, а нідзе не надарылася спаткаць такую прыгажуню, як ты, Дуняша!

Ён у адной руцэ трымаў поўную чарку, а другой абхопліваў магутны Дунін стан.

— Чарку вып'ю, а пацалункам закушу! — крычаў ён і, выпіўшы, на ўсю хату цмокаў сваімі п'янымі губамі ў немаладую ўжо шчаку Дуні.

— Не ўпускай свайго шчасця, Дуняша! — выціра-

ла з твару слёзы Мар'я.— Не пакінь белы свет бяздзетухай гэтак, як я!

— Хадзі сюды, Петручок, хадзі! — вешалася на шыю Карпуку Дуня.— Дзяток з табой у нас будзе, як у тым дзетсадзе, і кожнае на старасці чарку нальe ды ў рукі падасць...

Ой, піць будзем
І гуляць будзем...

Пятро зноў налівaў сабе «кавы», даваў са сваіх рук выпіць Дуні:

— Горка! Горка, Дуняша!

А Дуня ўжо не магла супакоіцца, усё спявала адно і тое ж:

Ой, піць будзем
І гуляць будзем...

Далей яна не спявала: «А смерць прыйдзе — паміраць будзем...», каб не напамінаць лішні раз Мар'і аб яе незайздросным цяперашнім стане, бо можа закрыцца доступ туды, пад падушку, дзе хавалася іх радасць у выглядзе банкаўскіх паперак.

«Каб не аддала была адразу ўсіх грошай, а плаціла падзённа, можа б, яшчэ і прыходзіла Дуня, каб «падлячыцца» пасля ўчарашняга, а так... Хто яе цяпер прымусіць за якія грошы варушыць маё цела? — балюча думала Мар'я.— Хоць бы паперу якую на апякунства напісала ў сельсавеце, дык бы яшчэ сюды-туды... А памру, хата пад калгас адыдзе, цяпер шмат у вёсцы наезджых, жыллё ўсякі раз спатрэбіцца. Мусіць, пачула Дуня, што ёй хату маю не прапіць, адскочыла ўбок...»

— Ду-уня! Го, Ду-уня! — Мар'і здавалася, што яна крычыць на цэлы свет, але яе нельга пачуць і на вуліцы.

Раптам нехта бразнуў клямкай дзвярэй у сенцах, затым зашкрабацеў рукамі па дзвярах у хату.

— Ду-уня! Нарэшце знайшлася, прыйшла? Не па-

кінула мяне ў холадзе ды голадзе? А я ўжо думала — і хату маю забыла?

Яна павярнула вочы на дзверы, чакаючы, калі ў іх пакажацца тая Дуня. Пад лыжачкай гусцей засмактала голадам, але цяпер ужо яе пляменніца напоіць, накорміць гарачанькім і чайком, і супчыкам.

— Уга! Ледзь клямку ў цемнаце намацаў! — азваўся мужчынскі голас, калі адчыніліся дзверы.— От што значыць даўно не заходзіць да суседа ў госці!

Мар'я залыпала вачыма, не верачы, што да яе завярнуў... Максім.

— Ну дык што, спеўкі каля твайго банка скончыліся, зязюлька, так? Трэці дзень не чуваць у тваёй хаце гаманы... Дай, думаю, адведаю, можа, ужо гасподзь і рукі-ногі прутам паставіў, дык... А яна вунь што робіць — цвіце, як вясною тая каліна! Хоць ты зараз з ёю пад вянец трушком бяжы!

Мар'я каторы час маўчыць, яшчэ добра не ўцяміўшы, ці гэта жартуе, ці праўду кажа Максім. А той не сунімаўся:

— П'юць людзі разам, а пахмяляюцца — паасобку, каб не саромецца адзін перад другім за ўсё ўчарашняе...

— Ой, Максімка, Максімка! — усплакнула Мар'я.— І грошы мае паплылі, і пакінулі мяне адну, во, ужо трэці дзень ніхто нават вады халоднай не падасць...

— Ага, прыйшла каза да воза! Некалі ў мой бок і пакасіцца саромелася, а вунь як тое Адамава багацце зараз табе бокам выходзіць... А са мной бы... было б, пэўна, не тое! Хоць і я зараз старым бабылём па падплоццем па вечарах ваўком выю, але ж мне лягчэй — ласку дзіцячую з маладых год зведаў... Каб не вайна маіх хлопцаў паела, цяпер бы і гора не меў... Але бедаваць разам з людзьмі лягчэй, чым самому ва ўласнай нары ад гора заходзіцца... Цяпер бы маім унукам бы па колькі гадоў было... А так!

— Дык гэта ж ты баяўся да мяне дакрануцца рукамі,— заўсміхалася Мар'я.— Ты думаў, што я цябе пабягу за рукаў лавіць ды цягнуць пад вянец...

— А хто ж каму гразіўся кол на галаве пераламіць? Я ці ты? Га?

— То гэта ж было жартам усё сказана...

— Нічога сабе жартачкі: на памацай, во, мой чэрап — яшчэ і дагэтуль два шрамы на галаве не зараўняліся ад дрына твайго Адамка.

— Ён умеў пастаяць за сваё шчасце...

— І пасядзець...

— Калі трэба было, дык і пасядзеў, а што...

— Нічога! — буркнуў Максім і завалюхаўся да стала, усеўся на рыпучы ўслон.— Я, дзеўка, вось з якой прапановай да цябе... Сваю Параскоўю, сама ж ведаеш, вось ужо тры тыдні, як адвёз з усімі пашанамі на пагорак пад сосны, а самому — хоць шыю ў сіло саджай...

— Аб гэтай бядзе ты мне не расказвай,— пасмялела Мар'я.— Удзень яшчэ туды-сюды, а прыйдзе ноч, усе закуткі свайго жыцця абтыцаеш, а ратунку няма — душа на шыбеніцу просіцца...

— Во-во! — згаджаецца Максім.— Я ўжо і ўсе вяроўкі пахаваў, нажы ў шуфлядцы толькі з тупымі насамі трымаю...

— І каб жа мяне хто некалі чужы наняў за сабой глядзець, з усёй душой глядзела б, а Дунька... Папіла, паела ды некуды і зляцела!

— Яблыка ад яблыні недалёка падае! — павучае Максім.— Можа, некалі яе бацька пашкадаваў каго з мужыкоў, калі ў пана служыў? І дзень, і ноч па панскім лесе бегаў, каб каго ў грыбах ці ягадах злавіць ды да пана зацягнуць, каб той за гэта па плячы паляпаў і цыгарэціну даў прыкурыць ад сваёй запальнічкі...

— Ой не кажы, Максіме! І ў майго Адама, акрамя як пра грошы ды багацце, ніякай ніколі і гаворкі не

было... Скажы, бывала, яму: «У суседа нешта хлопчык захварэў», дык і не пачуе... А скажы, што ў самога ў ката жывот баліць, ноч не будзе спаць: як гэта ў яго ды такі непарадак — кот хварэе?

— Вось бачыш, як ты ўсё позна на свеце раскумекваеш: як самой прыціснула кіпцюрыкі, дык пра чалавечую дабрату ўспомніла, а так усё грашыма да людзей ласкалася...

— Ой цяжка-цяжка на сабе чалавечую сувязь перапыняць: табе ж нехта даў жыццё, а ты — нікому!

— Э-э! У мяне таксама ўсё на мне канчаецца — і горка гэта, і балюча, але ж мне такое ў спадчыну дала вайна...

— Няхай бы і ў мяне сыночка хоць вайна адабрала, дык хоць бы ведала, як гэта родную дзяціну малаком са сваіх грудзей карміць, пачуць ад яго цёпленькае слова «мама»! А то ж я гэтага не ведала! — усплакнула Мар'я.

— Хто і ведаў, хто і не ведаў, але адзінокай смерці нікому не жадаю. Во, я прыйшоў да цябе, каб сказаць, што хачу цябе забраць да сябе. Будзем разам чакаць той смерці, так будзе намнога зручней...

— Да сябе? — збянтэжылася Мар'я.— Што ж я буду ў цябе рабіць такая? Табе нервы псаваць?

— Не кажы, Мар'я, так! Сваю пахаваў, а ты ўсё снішся, шэсць дзесяткаў год снішся... І ўсё ў вэлюме, усё я бачу ў снах, як аддаюць цябе за некага замуж... Трывожыш ты мяне па начах, пры табе я сябе маладым у сне кожны раз бачу: у хромавых ботах, у галіфэ, у паркалёвай вышыванцы, побач з музыкантамі ўсё сяджу на тваім вяселлі... А прачнешся — куткі хаты пустыя, ніхто ні з аднаго не адгукнецца, каб духам чалавечым хата ажыла...

— І ў мяне так,— разважліва сумуе Мар'я.

— Ці ж я таго не ведаю? А так будзеш у мяне ляжаць, усё весялей будзе ў хаце: голас падасі, пра ма-

ладосць успомнім! Я табе якую бульбіну спару, чайком нутро прапалошчаш... Кахання таго, колішняга, канешне, у мяне да цябе, можа, і не засталося, а чалавечае шкадаванне ёсць... Вя-лікае шкадаванне!

— Нічога пэўнага табе, Максіме, я не магу зараз сказаць... Каб гэта было крыху раней, калі я на сваіх нагах яшчэ моцна трымалася...

— Невядома, як яно яшчэ і са мною ўсё павернецца, але пакуль, дзякаваць богу, яшчэ варушуся сам, дык і за другім прыгледжу... Любіў я цябе вельмі, Мар'я! Як нікога на свеце!

Недзе з вуліцы пачуўся сігнал аўтамабіля.

— Гэта клічуць нас! — радасна сказаў Максім і падняўся з-за стала, каб сустрэць шафёра.

# Дамок пад клёнам

## I

Гэтая незвычайная чутка пайшла, папаўзла не па адной Малінаўцы. Ёю дзіваваліся і ў Сасноўцы, ды і з іншых вёсак людзі з усмешкай пыталіся:

— Дык гэта ты з Малінаўкі? Гы-гы-гы!

Пра тое «гы-гы-гы» можна было больш нічога і не казаць — усе добра ведалі, што да чаго. Нават калі малінаўскі аўтобус прыходзіць на аўтавакзал у райцэнтр, дык і яго абступяць часам цікаўныя бяздзельнікі, што не на полі ў гарачую пару шчыруюць у якой рабоце, а парацца за базарным прылаўкам, папытаюць у кожнага, хто сыходзіць з аўтобуса:

— Пакажы, браце, таго самага Хвядоса? Гы-гы-гы!

— Адстань! — злуецца каторы малінавец.— Няма табе, чалавеча, чым карысным заняцца!

— Гы-гы-гы! — румзаў той, незадаволены, што і на гэты раз не пабачыў стогадовага Хвядоса, які праславіўся тым, што ў такія свае вялікія гады падаў у суд на развод са сваёй ці трэцяй, ці, можа, і пятай жонкай Альжбетай.

Казалі, што і суддзя, Ганна Іванаўна, якая сама ўжо вось-вось пойдзе на пенсію, і яго ўнукі і праўнукі, якіх набярэцца калі не цэлы калгас, дык брыгада ўжо — напэўна! — і прасілі і малілі Хвядоса не рабіць гэтай дурноты, не падаваць у суд на развод. А Хвядос сваё:

— Хоць пад вянец і не хадзіў, але ў сельсавеце распісваўся, дык і развод трэба зрабіць па закону...

Сядзелі яны тады на судзе, Хвядос з Альжбетай, бокам адно да аднаго, нібы вялікія ворагі, а ўсяго ж год

ці два назад, як завінуўся быў Хвядос жаніцца, дык не тое было.

— Навошта, тата, табе тое жаненне? — упікала Хвядоса яго самая старэйшая дачка Хвядора, якая сама ўжо з кіёчкам у руках сцежку шукала ад сваёй да бацькавай хаты і ўжо, мусіць, сем ці восем год векавала без мужа, які апошнім часам ледзь-ледзь поўзаў па хаце, а пра дактароў — і слухаць не хацеў, каб крыху якім лякарствам падлячыцца, падмацавацца. Дык проста так, на корані, і сатлеў! Толькі з-за яго нагаравалася, напакутавалася яна, Хвядора, бо ўсякі лепшы харч пераглуміў Клім, а паправунку ніякага не было. Дык Хвядора тое казала і пра Альжбету, што вымучыць яна бацьку сваім здароўем, але той і сам здагадваўся, што да чаго, яго не правядзеш, як старога вераб'я на мякіне!

— Хачу жыць сваёй сям'ёй! — упарціўся Хвядос.

— То, во ж, і мы не забываем тваёй хаты: і дзеці, і ўнукі-праўнукі, ды і прапраўнукі ўжо да цябе дарогу самі знойдуць! — супакойвала Хвядора бацьку.

Але той трымаўся свайго. І аднойчы пазабіваў вокны спярша ў сваёй хаце, тайком, не то ўвечары ці досвіткам, а пасля — у хаце Альжбеты, і падаліся яны абое на хутарок, у пустуючы дамок Харытонішынай Мальвіны, што ляпіўся пад ралаватым клёнам якраз на раздарожжы, дзе адна дарога бяжыць у раён, другая — на Якімаўку, і трэцяя — у лес, да колішняга Чортавага балота, якое цяпер вельмі ўдала родзіць і ячмень, і пшаніцу альбо кукурузу ці буракі. Тут, у гэтым дамку, і аселі Хвядос з Альжбетай. Будыніна была не каб і вялікая: на прызбе — крыху з мурашкамі, з божымі кароўкамі, а ўсярэдзіне — з пахам склепа ды нафталіну... Але ўсё ж свая дамоўка! Грошай вялікіх за яе «маладажоны» не ўвалілі, бо Мальвіна даўно хацела пусціць той дамок на дровы, але ўсё неяк рукі не

даходзілі ні ў яе, ні ў мужа Сцяпана. Ды яно вельмі і не хацелася таго рабіць: тут яшчэ і грушку, і яблычка часам улетку атрасеш, і вішаньку ці малінку ў слоік засалодзіш на зіму. То няхай колішняе котлішча і не зводзіцца са свету, а хоць як ды туліцца пад тым клёнам! Раскоша раскошай, а душа часам і да старога, да колішняга завінецца прыгарнуцца, каб супакоіцца ад якога болю ці назойлівай трывогі.

А Хвядос тут зажыве больш самастойна: будзе свая жонка — наварыць, напарыць, бялізну памые! А яму што больш і трэба? Пчолы сюды перавязе на лета: разнатраўе вакол, калгас грэчку часам непадалёку сее, сам увосень ці зімой са стрэльбай прабяжыцца да Чортавага балота, не ўсе ж яшчэ кусты там плугам пад зямлю зааралі — можна будзе і па зайцу бабахнуць, ды і качку падняць з лазы ці якой карыціны, калі каторая яшчэ не перасохла пад націскам цывілізацыі...

Стрэльбай вялікіх харчоў не нажывеш, ат, паходзіш, падыхаеш свежым лясным паветрам, дык і з большым апетытам да стала прысядзеш, лыжку смачней ад міскі да рота паднясеш... Альжбета няхай якога падсвінка ўгадуе, дык і таго ў іх цяперашнія гады хопіць. Крамнага малака Хвядос і ў рот не бярэ: мала якімі рукамі яго ў тых калгасах дояць! Бо і машыну каторая гультайка калі раз у тыдзень, а то і ў месяц памые, дык і за тое скажы ёй дзякуй!

Пра карову хоць і вялі размову Хвядос з Альжбетай, але не нажылі яе: папыталі ў таго-другога, ды ніхто дойную не прадаваў, а купі цялушку, дык добра, калі яна пагуляла ўжо, а калі цяля, дык зноў чакай таго малака год ці два. А сена касі, вобмешак даставай, а за малаком — у магазіне чаргу выстойвай! Дык аднаго разу Хвядос прыцягнуў на абарваным пастромку недзе з Якімаўкі старую казу Акуліну.

— Ах, божачкі, зусім звар'яцеў чалавек! — завой-

кала Альжбета.— Няма каровы, дык і без таго малака пражывём! А то ж гэтага чорта прывалок!

— Аблізвацца, як тая паненка, будзеш ад таго Акулінчынага малачка! — смяецца Хвядос.— Яно тлустае, ім любую хваробу людзі са сваёй сярэдзіны вытурваюць...

— Ты сабе як хочаш, а я — не піла і не буду піць малака ад гэтай сухадрэвіны! — махала рукамі Альжбета.

— Ты сабе не пі, адно мне яго даі,— хітравата пазірае на свой нажытак Хвядос.— Яе клікалі гаспадары Акулінай, дык і мы так будзем цяпер называць нашу козачку!

— І даіць гэтага чорта не буду, рукі смуродзіць!

— А я і сам такую работу зраблю не горш за цябе! — не здаецца Хвядос.— Хто ж мне карову даіў!

Хвядос пачасаў казу пад падбародддзем, тая пацерлася аб яго бок галавою, пяшчотна завуркатала ад дзедавай ласкі.

— Прынясі мне вядро.

— Ах, божачкі, і вядра не дам, каб не засмуродзіў яго, што не дамыешся і з парашком пасля,— не слухаецца Хвядоса Альжбета.

— Ну, я каму сказаў? — сурова «нукнуў» дзед.

Альжбета махнула незадаволена рукой і пайшла ў сенцы. Хутка яна вярнулася з пустым посудам у руках, ды не з тым вядром, у якім трымаюць ваду для пітва, а з нейкім капронавым, у якое яна часам збірала маліны ці рвала вішні.

— Вазьмі пакуль, во, гэта, а там сабе новае купіш, калі што...

Хвядос кінуў незадаволены позірк на Альжбету, але ўзяў у рукі тое дзіцячае капронавае вядзерца, пакруціў яго і так і гэтак, нібы прыкідваючы, колькі ў яго ўвойдзе малака.

І ён прысеў пад казу, пачаў яе даіць.

— Дай сюды посуд! Ідзі лепш якое палена раскалі...

Хвядос хоць і нехацял але аддаў вядро Альжбеце. Яна спрытней, чым ён, захадзіла рукамі.

— Чвырк-чах! Чвырк-чах!

Калі скончыла даіць, падала вядро Хвядосу:

— На, пі!

— А чаму ж не вып'ю? — узлаваўся Хвядос.— Гэта ж табе не крамнае, у якім нават і смятанка не застойваецца...

Ён пацягнуў тое вядзерца да рота, але Альжбета спыніла яго:

— То дай хоць працыдзю...

— Можна зрабіць і гэта,— згадзіўся Хвядос.

Праз момант ён ужо расхвальваў тое казінае малако:

— На пакаштуй, жоначка! Каралеўскі напітак! Бог не пагрэбаваў бы такім малачком, дабаўкі папрасіў бы, а пасля б яшчэ і аблізаўся...

— Цьфу! — плявалася Альжбета, але кружку ўсё ж падставіла, каб уліў таго «каралеўскага напітку» Хвядос крыху і ёй.

Яна спярша панюхала, падзьмухала на тую кружку з малаком, зрабіла нават глыток, доўга, затаіўшыся, прыслухоўвалася да смаку малака. Пасля як плюне:

— Цьфу! Казой смярдзіць! Кішкі ўсе выварочвае!

— Будзеш піць! — упэўнена сказаў Хвядос і панёс у хату вядзерца з малаком.

— А, яй-богу, не буду! — наўздагон заракаецца Альжбета.— І губ больш не памачу! З голаду ў труну лягу, а гэтага казінага пойла і не прыгублю!

— Як сабе хочаш! Але даіць Акуліну будзеш ты!

— І даіць не буду!

— Будзеш, сказаў!

— Не буду!

Ды ўсё ж прызвычаілася да таго казінага малака і

Альжбета. Праўда, спярша параным яго піла, а пасля і сырадой стаў смачным...

— Во, казаў жа табе, што будзеш піць малако ад Акуліны ды яшчэ і Хрыста славіць,— жартаваў часам Хвядос.

Вось так яны і жылі: малако было казінае, ды і мяса было таксама са свайго хлява — гадавалі і свінку, і курэй некалькі бегала па панадворку... А хлеб ды чай — куплялі ў краме.

Хвядос пенсію «па чыгуначным ведамстве» сабе зарабіў, а Альжбета — у калгаснай касе яе атрымлівала. Так што і капейка жывая вялася ў хаце, і хлеб свежы са стала ніколі не знікаў... І часам адвячоркам яны выходзілі на двор, садзіліся на лавачцы пад клёнам і зацягвалі песню:

Зя-ялё-ёная вішня,
З-пад кораня выйшла...

Спявалі не гучна, але разважліва, гэтак жа руплівa, як і рабілі якую работу, хоць ніхто іх не слухаў. Спявалі для сябе, для душы, нібы яны былі яшчэ зусім маладыя ды юныя, якія толькі ўчора з-пад вянца вярнуліся, і зараз у іх мядовы месяц.

Але ў кожнага за спіной была вялікая дарога: Хвядос яшчэ ў грамадзянскую добраахвотнікам паступіў недзе за Саратавам у Чырвоную гвардыю, асвоіў там, як крыху пісьменны чалавек, тэлеграфную справу, больш быў далей ад куль ды снарадаў, таму і ацалеў.

Вярнуўся ў Заходнюю Беларусь ужо ў трыццаць дзевятым, прапрацаваўшы тэлеграфістам больш дзесяці гадоў на чыгуначнай станцыі Калінаўка пад Варонежам. Прывёз адтуль і сваю першую жонку Ганну, і аж сямёра дзяцей. На бацькавай гаспадарцы не асеў, бо зямля разышлася паміж трыма яго братамі і сястрой. Дык зноў наняўся на чыгунку. А тут яго ўжо

павысілі: зрабілі спярша дзяжурным, а потым і начальнікам станцыі.

Вядома, станцыя была зачуханай, людзьмі і богам забытай: раз ці два на дзень свісне тут паравоз, ды і зноў цішыня. Па чыгуначным насыпе і каровы гуляюць, і авечкі, і свінні аб рэйкі свае вушы чухаюць, але на гэта Хвядос не звяртаў ніякай увагі.

Але калі яму пеканулі штраф за «непарадак на станцыі», дык пачаў і ён таго-сяго прыструньваць:

— Чыгунка — гэта табе не сцежка праз крапіву! Гэта — стальная артэрыя дзяржавы! Яна парадак любіць!

І за кароткі час усё ж навёў парадак: пераганялі статак цераз чыгунку толькі ў адведзеных для гэтага месцах, так што хутка зусім перайначылася тая станцыя.

Але пасля начальнікі з дыпломамі пачалі мяняць адзін аднаго амаль праз месяц, і Хвядос пакаціўся больш уніз і закончыў сваю службу на чыгунцы раз'езным дзяжурным. Але сабою ён ганарыўся: усё ж жыццё яго працякло пад дзяржаўнай кукардай якніяк!

Дзеці павырасталі, пажаніліся, некаторыя раз'ехаліся па свеце, а некаторыя аселі побач, у вёсцы.

Вялікі род на свеце пакіне Хвядос! Аднаго разу налічылі больш за паўсотні сыноў, унукаў ды праўнукаў.

Альжбета ж хоць і без чыноў пражыла свой век, але яе рукі ніколі спакою не ведалі: яны і кок-сагыз вырошчвалі, і каноплі з лёнам церлі ды трапалі, пасля ў кукурузе таміліся, аж пакуль яна не стала на пастаянную работу на ферме — даіць кароў. Так што пенсію тут зарабіла неблагую, магла таксама без дочак ды сыноў спакойна свае гады дажыць...

А яе дзеці ўсе да аднаго ў горад падаліся: Сеня інжынер у Мінску на трактарным, Маша — аперацыі ро-

біць, а Віктар — той ваенны. Дык калі была крыху больш дужая, як выйшла толькі на пенсію, унукаў гадавала, а цяпер і ўнукі раз у тры гады калі адведаюць, дык і тое добра!

Сум поедам еў у роднай хаце, бо мужа Алеся пахавала яшчэ да калгасаў, у сорак восьмым. Ран ваенных не вытрываў.

А калі на пенсіі пажыла, дык і падхвальвацца пачала:

— Дзяцей у людзі павыводзіла, унукаў на ногі паставіла, а цяпер і пра сябе падумаю! Пажыву, параскашую ды яшчэ і замуж выскачу за якога «царскага халасцяка»! Далібог, памру на руках у любімага мужанька!

І прачуў пра гэтую пахвальбу Хвядос. Ён апрануў чысцейшую адзежыну і падаўся аднойчы адвячоркам да Альжбеты. Каб хто староннi быў побач, бокі парваў бы са смеху, як ён сватаўся.

— Ну, то добры вечар у хату! — сказаў Хвядос, пераступіўшы Альжбецін парог.

Патупаў, патупаў новымі ботамі па падлозе, панюхаў носам паветра, усміхнуўся:

— Царкоўны дух у хаце!

— Які? — не разумее Альжбета.

— Холадна ў цябе, кажу,— удакладняе Хвядос.

— А хто ж мне цяпер тых дроў прывязе ды напіліць? Усе ж па свеце разбегліся, і дзеці, і ўнукі... Гэта твае ад цябе нікуды не ад'едуць, усе за твой рукаў трымаюцца... Усю вёску запаланілі, прайсці з-за іх другому чалавеку няма як...

— Няма і мне з-за іх дарожанькі вольнай: там на ўнука наткнешся, там праўнук на вочы трапіць...

— От бяду знайшоў! То і добра! Уся радня побач... Усе жалудкі пад родным дубам даспяваюць!

— Свае пацягнýць дык паця́гнуць, а каб сагрэць...

Пасля ён завёў гаворку, з якім намерам сюды заві-

таў: здагадвалася аб гэтым і Альжбета, тайна цікуючы за Хвядосам, пільна ловячы кожнае яго слова, шукаючы ў ім скрыты сэнс. Яна неяк неўпрыкмет і пераапранулася ў бакоўцы ў лепшае адзенне, нават скінула з ног шлёпанцы і абула новенькія лакіроўкі, што падарыў ёй сын Віктар, калі прыязджаў апошні раз у родную вёску на пабыўку.

— У такім веку, як у нас,— пачаў гаварыць сваё Хвядос,— ні сватоў, ні папа нам не трэба...

Сказаў ён гэта і паглядзеў на Альжбету: як яна? А тая адразу на вачах папрыгажэла і зрабілася ружовай, баязліва апусціла свае павекі, як семнаццацігадовая дзяўчына.

— Чуў, што ты, Альжбета, даўно пажыць па-людску хочаш?

Хвядос колькі хвілін сцішана глядзіць на Альжбету збоку, але тая не паварочвае да яго вачэй, каб ён не змог зазірнуць праз іх ёй у душу — мусіць, саромеецца.

Затрэсліся Альжбеціны рукі, прайшоў халадок па ўсім яе целе.

— А каму калі ж харошае жыццё вельмі шкодзіла? — ледзь чутна азвалася яна.

— Вось і я кажу: ты яго чакаеш, таго хвайнага жыцця, і я ногі падбіў, бегаючы за ім... А чаму б нам удвох не пачаць шукаць яго разам?

Хвядос сказаў гэта па-юнацку стрымана, неяк нават нягегла, быццам ніколі і не сватаўся ні да кога.

Альжбета павярнулася ў куточак, змахнула з вачэй няпрошаную слязу і ціха-ціха прызналася:

— А я і сама ледзь не хацела спыніць цябе дзе ў прыцемку ды пасватацца... Быў такі грэшны намер, далібог, быў, не хлушу...

Хвядос адразу не раскумекаў, ці то праўду жанчына кажа, ці смяецца з яго. Але адступаць назад ужо не было як.

— Ты ўсё за жарт прыняла, ці што? — не верыць ён Альжбеце.

— А якія ўжо ў нашы гады могуць быць жарты? Пакуль нажартуешся, як каторы малады, дык і жыць не застанецца калі...

І яны горача абняліся, па-маладому расцалаваліся.

— Ну, каб цяплей удвох жылося! — сказаў Хвядос.

— Як будзеш дровы добра секчы, то і ў хаце будзе цеплыня! — жартуе Альжбета і зноў цалуе Хвядоса.

А праз які тыдзень ці два яны і аселі пад гэтым клёнам у Мальвінчынай хаце.

Асесці дык аселі, але, як гаворыцца, з вялікага кахання і абое павар'яцелі: папрадавалі пасля абедзве свае хаты. Альжбета дык тая адразу адаслала свае грошы дачцэ, а Хвядос свае нікому не аддаў.

— Мала што чакае цябе наперадзе? — казаў ён.— Калі будзеш так транжырыць свой нажытак, то і на пахаванне ўласнае гнутай капейкі не застанецца...

Жылі душа ў душу — навошта ім і тыя грошы!

Хвядосавы дзеці, а часам унукі ды і праўнукі забягалі да яго пад клён, а Альжбеціны, як яна прадала свой дом, сюды і дарогу забылі. Толькі аднаго разу яна сама ездзіла ў Мінск да дачкі. Прывезла тады Хвядосу кашулю нейлонавую, але той толькі адзін раз яе і апранаў: цела, шэльма, парыць, здароўе крадзе, не шкадуючы! Дык больш гэты дарунак і не апранаў, паклаў кашулю на самае дно куфра.

Каза ў іх пражыла гады тры, пасля нечага аб'елася і акалела, а Хвядос усю бяду звярнуў на Альжбету:

— Сама дагэтуль не прывыкла толкам да казінага малака, усё чмыхаеш, то гэта і твая работа — ты абкарміла казу, каб яна акалела.

— Я атруціла? Пакуль мае рукі служылі, дык і карміла яе, і паіла, і малако даіла... а цяпер. Сам на казіным малацэ вунь як распасвіўся, як той жанішок са стрэльбачкай па лесе бегаеш, а я ўсю гаспадарку

цягну адна... Нічога сабе запанавала за табой! Бегаю, дзякаваць богу, як той ганчак за зайцам, адно толькі пакуль што не ёхкаю!

— Цыц! — крычаў Хвядос і браў стрэльбу, калі гэта было ў паляўнічы сезон, альбо кошык на грыбы ўлетку і падаваўся ў лес. Дамоў вяртаўся ў гуморы, падбадзёраны хадзьбой ды шумам баравым.

— Хто гэта цябе вельмі прымушае тое птаства ды свінства разводзіць? — лагодна гаварыў тады да жонкі Хвядос.— Во сёння спаткаў каля лесу трактарыста Віталя Саветчынага, заўтра досвіткам падскочыць на сваім «беларусу», ды завязу ўсё — і свіней тваіх, і курэй на базу... А грошы дачцэ пашлеш!

— Без работы задушыць хочаш? — злавалася Альжбета.— Ніводнай курачкі, ні гусачкі не прадасі! Няхай бегаюць па панадворку! Няхай лепш ужо лісіца паласуецца, дык хоць пер'е пакіне!

...На судзе людзей было многа: прыйшлі паглядзець, як на якое дзіва.

— Грамадзянін Сакольчык! — звяртаецца суддзя да Хвядоса.— Устаньце! Колькі вам гадоў?

Хвядос камячыць у руках шапку, пераступае з нагі на нагу, чырванее, маўчыць.

— Грамадзянін Сакольчык,— паўтарае суддзя.— Адкажыце на пытанне суду: колькі вам гадоў?

— Сто другі на спаса пайшоў,— ціха адказаў Хвядос.

У зале зашушукаліся, прайшоўся лёгкі шумок. Суддзя пастукала па графіне з вадой:

— Ціха, ціха, таварышы! Вы мяшаеце судоваму пасяджэнню!

Усе заціхлі.

— Дык чаму вы ў такім паважаным узросце рашылі разводзіцца? — зноў назойліва, як тая аса, пытаецца суддзя, Ганна Іванаўна, ледзь стрымліваючы сама сябе ад смеху.

— Чаму, чаму? — нібы і не на судзе, а недзе ў кагого на прызбе сярод вяскоўцаў узлавана загаварыў Хвядос.

— Так, чаму? — дабіваецца свайго суддзя.

Хвядос трымаецца сур'ёзна, стрымана. Ён усё жыццё з казённымі справамі абыходзіўся сур'ёзна. А суд — таксама справа казённая, няхай сабе зараз хоць і развод разбірае!

— Апошнім часам ласкі ад яе не маю... Ось і...

Па зале прайшоўся шумок са смяшком. Але яго спыніў стук алоўка па графіне.

— Дык разышліся б і так, не падавалі б прыклад маладым,— павучае Хвядоса суддзя. У яе задача заўсёды адна: памірыць развадных.

— А калі ж мне з-за курэй ды свіней цябе ласкаць было? — не сцярпела побач з Хвядосам Альжбета.

— Ціха, грамадзянка, вам слова пакуль не давалі!

Альжбета заціхла, злосна паглядзеўшы на Хвядоса.

— Значыць, вы настойваеце на сваіх патрабаваннях? — перапытала ў Хвядоса суддзя.

— Так, настойваю...

— Цяпер вы адкажыце, грамадзянка Сакольчык: згодны вы даць развод грамадзяніну Сакольчыку, э-ээ...— яна зірнула ў паперку: — Хвядосу Раманавічу?

Альжбета ўстала са свайго месца, пацiснула плячыма, памаўчала крыху, пасля паглядзела на суддзю і засядацеляў і ціха праказала:

— Няхай як хоча! Толькі я з хаты сваёй нікуды не пайду...

— Пра хату пагаворым пасля,— зазначыла суддзя.— А зараз адказвайце на пытанне: згаджаецеся вы на развод?

Альжбета зноў пацiснула плячыма.

— Значыць, не згаджаецеся? — перапытала суддзя.

Альжбета неяк невыразна і на гэты раз пацiснула

плячыма. Калі суддзі пайшлі ў бакоўку для вынясення свайго рашэння, увесь зал нібы ажыў:

— Дажывалі б ужо свой век і без разводу, колькі ім засталося і жыць на свеце?

— Нічога сабе заварылі кашу: глядзіце на нас, праўнукі, як трэба жыць на свеце!

— Гэта што вянца мінавалі! Чарты ажанілі, чарты і развядуць! — упікала нейкая бабулька, якая таўклася ў натоўпе людзей у самым кутку залы.

Хвядос сядзеў як апараны. Хацелася выскачыць з гэтага людскога муравейніку, ухапіць стрэльбу і тры дні бегаць па лесе, каб супакоіцца, ураўнаважыцца ад гэтага сораму.

— Устаць! Суд ідзе! — Ганна Іванаўна абвяла вачыма зал і, кашлянуўшы, не пазіраючы нават у паперку, абвясціла:

— Суд рашыў: даць грамадзянам — істцу Сакольчыку Хвядосу Раманавічу і адказчыцы Сакольчык Альжбеце Казіміраўне шэсць месяцаў для абдумвання сваіх рашэнняў... Калі не будзе якіх іншых патрабаванняў з абодвух бакоў, развод пасля гэтага тэрміну будзе лічыцца законным...

Што суддзя гаварыла далей, ні Хвядос, ні Альжбета не ўспрымалі сваімі галовамі. Ведалі толькі адно: ім адмералі яшчэ паўгода пакут пад адным дахам.

## II

Дзяліліся Хвядос з Альжбетай ужо без суда, самі. Запрасілі толькі на тое дэпутата сельсавета Кастуся Якімчыка. Дзяліліся, нават нічога не запісваючы, усё бралася на чэснае слова. Дайшла справа да падсвінкаў.

— Будзем пераважваць? — пытаўся як прадстаўнік мясцовай улады Кастусь.— Бо каб пасля непаразуменняў ніякіх з абодвух бакоў не ўзнікла?

— А якія ж тут непаразуменні могуць быць? — першай парушыла маўчанку Альжбета, хоць ёй і трапіў падсвінак больш укормлены.— Можа, ён калі ражку ў хлеў занёс ці бабоўніку схадзіў у лес нарваць? Усе гэтыя гадкі ён са стрэльбачкай па лесе прабегаў... Многа я таго мяса паела ці грыбоў? Лісу забіў, дык дачцэ на каўнер шкуру падарыў... То, во, дачка вярнула тую тваю падачку! — кінула пад ногі Хвядосу ўжо выробленую лісіную шкуру Альжбета.

— А і вазьму назад! — злуецца Хвядос.— Думала, не вазьму, пасаромеюся ды падарую? Не!

— Бяры, бяры! Няма авечкі, не трэба і сечкі!

— Таварышы, грамадзяне! — умешваецца ў лаянку гаспадароў Кастусь Якімчык.— Я так не магу! Калі паклікалі ўжо, дык трэба, каб быў парадак...

Дайшла дзяльба да лыжак, каструль, рознага адзення. Тут ужо не сцярпеў Хвядос: ён скамячыў нейлонавую кашулю, якую падарыла Альжбеціна дачка, кінуў на стол перад Альжбетай, буркнуўшы:

— Хацела ў гэтай скуры мяне спарыць?

— А ты так не шпурляй падарункамі маіх дзяток! Няхай ужо ты ад свайго гурту адбіўся: ніхто ніколі да цябе не забег і ні ў будзень, ні ў свята...

— З-за цябе ж і не забягалі! А з-за каго ж?

— З-за мяне? Я яму, бачыце, людочкі добрыя, дарогу перагарадзіла, каб радня да яго не хадзіла!

— Грамадзяне, таварышы! — злуецца Кастусь.— Калі так будзе працягвацца дзяльба, дык пашукайце каго іншага ў сведкі...

— Даруй, Кастусь, але ж у мяне ўжо нерваў не хапае слухаць яго няпраўду...

— А даўно ты такой нервовай стала? Думаеш, не бачыў, як ты праз плот падавала палядвіцу лесніку Кубаю?

— Ну і падавала, ну і падавала, дык і што? Можа,

трохсценнік сам да вуглоў прырос? А падваліны дубовыя самі пад сцяну леглі?

— Падваліны, мандаліны! — перакрывіў Альжбету Хвядос і заціх.

Хату таксама падзялілі пароўну: сенцы і кухня папалі Альжбеце, а вялікі пакой — Хвядосу. Дык ён меўся замест аднаго акна прарэзаць дзверы, прыбудуе якія сенцы і будзе жыць. Абы не хадзіць праз адны дзверы з Альжбетаю!

— Трэба было, Хвядос Раманавіч, неяк і без дзяльбы гэтай, разводу ў судзе падзяліцца! — гаворыць пасля дзяльбы Кастусь Якімчык.

Хвядос прыкладвае палец да вуснаў, азіраецца, шэпча:

— У судзе прамаўчаў, нічога не казаў нікому, а табе скажу...

Кастусь прыблізіўся бліжэй да Хвядоса, каб разабраць, што той будзе шаптаць яму на вуха:

— Не разабраў толькі, хто: Кубай быў ці Грышка-конюх? Але мілаваліся, далібог, мілаваліся ў адрыне на сене! От каб застаў на месцы! А так — спазніўся! Толькі зямля застагнала пад нагамі, як махануў да Чортавага балота...

— Ай-яй-яй! Дзядзька Хвядос, дзядзька Хвядос! Ці ж гэта ад вас я такую дурноту чую?

— Мне не верыш? Сам чуў той тупат на свае вушы...

— А на свае вочы і не бачыў?

— О, каб яшчэ і на свае вочы пабачыў! — сказаў Хвядос і палез праз акно на вуліцу. Хутка ён вярнуўся з пілой і сякерай пад пахай. У адной руцэ ён трымаў некалькі цвікоў і малаток.

— Адгараджуся ад сённяшняга ж дня, і — амба! — Хвядос пачаў здымаць з завесаў абедзве палавіны акна.

Потым зашоргала па бярвенні піла, і праз якую гадзіну з'явіўся ў Хвядосавым пакоі праём для дзвярэй, які ён занавесіў самаробнай радзюжкай.

— Дзверы зраблю пасля,— сказаў ён.

Потым гаспадар успомніў пра цвікі і дзверы, што вялі на кухню, якая засталася зараз за Альжбетай. Ён выбег на двор, знайшоў недзе кавалак дошкі, забіў ёю дзверы на кухню.

— Вось так! — чмыхнуў Хвядос носам і заспяваў:

Ні я к та-абе, ні ты — ка мне-е
Не бу-удзем хадзі-іці...

— Каб ты па белым свеце не хадзіў! — азвалася недзе з-за сцяны Альжбета. А пасля як зацягне сама:

Ні я цябе, ні ты мяне
Не будзем лю-юбі-іці...

— Цыц! — стукнуў па сцяне кулаком Хвядос.— Паўгода пажывём з табой на адной хваміліі, а пасля і хвамілію сваю ад цябе адбяру! Каб не ганьбіла яе перад людзьмі добрымі! Кубай пішыся ці Хведаровіч!

— Ціха вы, дзядзька Хвядос! — супакойваў Хвядоса Кастусь.

Але той і вухам не шмануў, а толькі больш распальваўся:

— Думала, перажыве мяне, дык маім усім завалодае — і хатай, і грашыма! Не-е! Я яшчэ пабегаю са стрэльбачкай па лесе, ды і на сваю палавіну хаты яшчэ не такую маладзіцу прывяду! У-ух! Ад каторага ахвіцэра адаб'ю, адно няхай у горад з'езджу! Усіх знахарак падкуплю, каб зеллем прызялілі да мяне тую кралю! Каб сохла па мне дзень і ноч!

— Каб чарты тваю скуру засушылі! — не сунімалася за сцяной Альжбета. А пасля, напалавіну з плачам, заспявала:

Сам уе-еха-ал, ми-иня бро-оси-ил...

Спявала яна адзін-адзіны радок з нейкай, толькі ёй адной вядомай, песні. І гэтым вельмі злавала Хвядоса.

— Цыц! — стукаў ён кулаком па стале.— А то ўласць упатраблю!

— Нягожа, дзядзька Хвядос, лаяцца! — прасіў Якімчык.— Спіце тут спакойна, а мне пара і дамоў дабірацца...

— Куды ты папаўзеш супраць ночы? — перабіў яго Хвядос.— Ты толькі за дзверы, а яна мяне сякерай, абы я заснуць паспеў! Да-а, сякерай так і секане! Дзвярэй жа я не зашчаплю на зашчапку! Дык у мяне, Косця, пераспіш, сведкам будзеш, калі што якое здарыцца...

— Аб цябе і рукі не стану грашыць! — чуе з-за сцяны споведзь Альжбеты Хвядос.— Сам павесішся, ляснеш ты! І вяроўку сам сабе намыліш!

— Во-во, і павесіць грызіцца! Чуў, Косця? Сведкам будзеш! Вось усадзіў Хвядос у капкан свой нос! За самыя ноздры прыхапіла і не адпускае!

Хутка ўсе ўтраіх заснулі: Альжбета на кухні на цвёрдым зэдліку, Хвядос на пасцелі, а Кастусь — на раскладушцы.

## III

Маладую бульбу капалі разам, моўчкі, а калі настаў час убіраць увесь ураджай, першай загаварыла Альжбета. Вядома — жанчына!

— Можа б, каня ў брыгадзіра папрасіў?

Хвядос нібыта і не пачуў гэтых слоў. Прамаўчаў. Але назаўтра раніцай Альжбета пачула, як па панадворку нешта моцна затупала. Выглянула ў акно: з воза здымаў плуг Хвядос! Рабіў ён гэта моўчкі, нібы толькі для сябе, а яна няхай пойдзе ды папросіць у брыгадзіра каня, знойдзе аральніка і робіць як хоча. Але Хвядос хоць і хмуры тэпаў ля каня, ды думкі ў

яго галаве былі не надта і хмурыя: «От, усяліўся ў душу нейкі недавер да чалавека і абганьбіў яго на цэлы раён,— думаў ён пра Альжбету.— А тая, можа, да бога душою чэсная ды справядлівая!»

Ён неаднойчы заўважаў, як Альжбета, калі Хвядос хадзіў са стрэльбай у лес, перамывала ў гэты час яго бялізну, якую ён часам коўзаў у начоўках. Бялізна станавілася чыстая, хоць ты яе на выстаўку выстаўляй. Значыць, у Альжбеты неглыбока ўкаранілася зло, яна адышла ад тых згрызот, якія паміж імі былі.

За лета Хвядос на сваёй палавіне хаты зляпіў сабе сякую-такую печ, праўда, увесь час баяўся, каб яна не асела адным бокам на пограб у кухні. Яго пакой намнога паменшаў, і ў ім заўсёды поўна было — не сказаць каб якога смецця, а так — рознага прычандалля: там палена валяецца, там тронак для лапаты, там якаяануча не на сваім месцы ляжыць...

А ў Альжбеты заўсёды быў, відаць, парадак, ён пакалішняму ведаў: недаспіць, недаесць, а каб у хаце была чысціня! Ды і на двары!

...Заўтра канчаецца тое паўгоддзе, якое вызначыў ім суд. Калі ўжо запрог каня ў плуг, Хвядос азірнуўся на Альжбету, ды не на яе, а на яе палавіну хаты, нешта падумаў, а пасля хутка падышоў да акна і пастукаў пугаўём па шалёўцы.

— Ну дык я паехаў выворваць бульбу! — сказаў ён і крыху затрымаўся ля акна, каб пераканацца, ці не выгляне ў яго Альжбета. Але тая ўжо стаяла на парозе сяней з вядром, у якім несла есці свінням.

— Едзь! — коратка кінула яна.— А я вось толькі са свіннямі ўпраўлюся і буду бегчы...

— І маіх не забудзь пакарміць! — падказаў Хвядос.— Ключ ад клеці ў застрэшшы, дзе заўсёды ляжаў...

Альжбета ледзь не расплакалася: лёд трэснуў!

— Ну дык я паехаў! — зноў паўтарыў Хвядос, каб, відаць, дагадзіць гэтымі словамі Альжбеце.

— Зараз упраўлюся і я! — адчыняючы свінушак, азвалася Альжбета.

Свінні рохкалі, лезлі нагамі на дзверы, іх увесь час супакойвала гаспадыня:

— Нясу, нясу вам естанькі, мае вы хрушачкі!

Хвядос яшчэ раз азірнуўся, пасля шлёгнуў пугай і так, з адным плугам, паехаў выворваць бульбу. Але там, дзе рос альховы куст, да яго выйшаў унук Павел: ён узяўся за ручкі плуга, сказаўшы нешта Хвядосу, які махнуў пугаўём і пайшоў побач са здаравяком унукам.

Альжбета забылася і пра свіней, а ўсё пазірала і пазірала ўслед Хвядосу і Паўлу, сама сабе ўсміхалася і ціха гаварыла:

— І што яму ўлезла ў галаву? Раней хоць ты яго было бяры ды да балячкі прыкладвай, а тут... Як яго чорт за пазуху паклаў! Кажуць жа старыя людзі: і бога чорт знатурыць, калі да грудзей прытуліць!

Альжбета заўважыла, што Хвядос сёння, як звычайна, не начапіў на свае дзверы замка. Яна зайшла ў Хвядосаў пакой і хуценька прыбрала яго.

А назаўтра, калі ім трэба было паехаць у суд па разводныя паперы, яны зноў, як тады, пры сватаўстве, сядзелі пад клёнам і ўспаміналі ўсё лепшае, што з імі здарылася за час іх шчаслівага сумеснага жыцця ў дамку пад клёнам. Абыходзілі маўчаннем толькі тыя падзеі, якія так былі пасварылі іх, раз'дналі, хоць яны адно без аднаго і не знаходзілі сабе месца на зямлі...

Пасля Хвядос узяў сякеру і адарваў ёю дошку, якой былі забіты дзверы, што вялі з яго пакоя на кухню...

## Рукзак для сына

Ляксандраўну гнуў да зямлі самы сапраўдны турысцкі рукзак, вочапкі якога абхапілі яе худзенькія плечы, так што ззаду і спіны не ўбачыш кабеты, такі ён пухнаты, туга набіты і грушкамі, і яблычкамі. Няхай сынок-начальнічак Паўлік, Павел Навумавіч, у горадзе і сам пацешыцца, і дзяток з жонкай пацешыць фруктай з родненькай сядзібы, якая і ад райцэнтра не так блізка, дзе яна зараз жыве, а ў абласным горадзе гэты ласунак і сілушкі дадасць, і пра дзяцінства басаногае нагадае. А па гэтым, кажуць, сумуюць зараз усе: і тыя, хто шрубкі-цвічкі ў горадзе вырабляе, і тыя, хто толькі партфель ды лыжку ў руках і трымае...

У Ляксандраўны ножкі знасіліся за жыццё, якое на паўшляху ўжо да восьмага дзесятка, патанчэлі, усялякай далёкай дарогі пабойваюцца, каб па-за родным парогам не падкасіцца, не аслабець зусім. Бо потым адна гаворка па гарадку пойдзе: сын вунь які тоўсты часам партфель па завулку нясе, а маці да сябе не пакліча, няхай бы і яна ў вялікім горадзе на балкончыку без работы на сонейку пагрэлася! Бо, дзякаваць богу, калі цяпер партфель у каторага тоўсты, дык і кішэня не цыганскім ветрам надзьмута, шалясцяць у ёй чырвоненькія ды зялёненькія грашовыя паперкі, нават звону металічнага ў іх не пачуеш — сорам медзякам у такой кішэні месца займаць! Не па чыну будзе! На тое іншая кішэня маецца, рукі гаспадара якой не заняты партфелем! А таму і могуць пералічыць без лішняга клопату тыя медзякі, нічога не зробіцца з імі...

Ногі падкошваюцца ў Ляксандраўны, хочацца дзе і

на платок які абаперціся на хвіліначку, каб аддыхацца, але час падганяе — трэба паспець у самую пару, калі прыгарадны цягнічок падыдзе да станцыі.

Ногі хоча бабулька гусцей ставіць у бок станцыі, а рукзак-мяшок яе стрымлівае, нібы ў яго хто ззаду ўчапіўся рукамі ды без усялякага сораму хоча адабраць.

А сёння той гарадскі мяшэчак цяжэйшы, бо і курачку Ляксандраўна абскубла ды прыхавала ў кішэнь пры тым зялёным мяшэчку, каб сынок яе і не заўважыў нават. Дома ён не саромеецца і самаробкі з трохлітровіка хлебануць, каб цалейшая капейка для горада вялікага засталася, а там толькі ў рэстарантах са значным начальствам у якой бакоўцы ад людзей хаваецца, бо цяпер начальства пайшло не тое, што некалі было: тое, бывала, і самагоначкі конаўку каўтане, і курыную ножку з любым хаўруснікам абгрызе... А цяпер усё па рэстарантах хаваецца ці ў глухія лясы на казённых машынах падалося, каб больш просты люд не надта вельмі і здагадваўся, што да чаго!

Некалі і да яе забягалі разам з Паўлікам начальнічкі яго, калі ў сыночка была ў руках адна толькі рыжанькая папачка з зашмальцаванымі шнурочкамі: прапусцяць чарачку-другую для сугрэву ці рызыкі, калі ехалі на сяло «кулачыць», цыбулінай рот засмуродзяць, самасадам задымяць і нават «дзякуй» на развітанне не скажуць! Палегчала іх жыццё зараз, ох як палегчала! Бывала, па чарзе на фурманцы да вёскі пад'язджаюць, аднаго абутку не набяруцца — калі варочаліся з вёсак, адразу да шаўца: то падэшва адстане, не вытрымаўшы вясковай дарогі, то брызент не вытрымае, пенькне на самым бачным месцы. Бо тады скуранога абутку амаль не было.

А калі хоць у маленькага начальства цела дзе з адзежыны ці абутку з кожным павітацца хоча, такі галадранец многа не накіруе! Такога могуць паслаць і да чортавай кошкі, бо ад мужыка нічым не адрозніваец-

ца — ні блішчастым ботам, ні шырокім капялюшам!

А цяпер модна, каб у начальніка жывот, як дыня, вывальваўся з-пад кашулі, не інакш! А для гэтага трэба старацца не толькі яму аднаму, але і бацькам: хай сабе іх сынок і невялічкая дзесьці там шышка, але калі жывот ледзь уваПрэ ва ўласны легкавік, для бацькоў ён ды і для астатніх сваіх знаёмых намнога таўсцейшым з партфелем здаецца!

Так заўсёды думала Ляксандраўна, дык і старалася, каб яе крывінка пры жывоціку хадзіла паміж людзей: і свінку прычавіць не адну за год, і гуску з курачкай — недаспіць, а дакорміць, каб больш тлушчу нагулялі! Бо калі тлусты кавалачак у жывот пашлеш не толькі сяды-тады ў свята, а кожны дзень, ды і не раз, не можа таго быць, пакруглееш, зробішся, як колішні панок ці святы айцец!

Ляксандраўне царкву наведваць строга-настрога яе сыночак забараніў яшчэ тады, калі хадзіў толькі з папачкай. Але ў вялікдзень праз чужыя рукі і яму на стол трапляла святое яечка, якое пасвяціў айцец Васілій. Дык еў, не адварочваўся, ды і не бляваў ад яго. Толькі навучыўся хітра прытварацца: нічога мне невядома, а яечка пры нядзельнай чарцы — не горшая закусь!

Хутарок іх быў сярод хмызу, бедны, лепшую зямліцу, як тыя мухі, абляпілі паны ды падпанкі, так што даводзілася яе сыночку і пастушком служыць у больш спраўнейшых гаспадароў, і адзежыну насіць часам з чужога пляча. Але што зробіш, выбіўся ў людзі, не тое што некаторыя бусайлы: калі дапаў крыху да лепшага кавалка, дык пра ўсё і забыў — і пра школу, і пра пасады! А Паўлік — не, не забыў, хацелася крыху вытыркнуцца ўгору. Дык пасля ўсё быў сам і сам, нават і да дзяўчат на вячоркі не хадзіў, бо не ведаў, аб чым з імі і гаворку весці. От, прыйдзе калі, сядзе на цэлы вечар у куточку ды і сумуе, бо ні песні падцягнуць,

ні што смешнае расказаць,— таго ён зрабіць не мог. Таму разы са тры з яго Мікіта Худзянок і пажартаваў:

— А ты што, Паўлік, языка чалавечага ў роце не маеш, што не можаш словам-другім з людзьмі перакінуцца?

— Як не мае? — жартавалі дзяўчаты.— Можа, цяляты ці авечкі дзеда Кузьмы яму ў рот залезлі ды аджавалі той язык?

Паўлік тады рашуча выходзіў да камінка, на якім палаў яркі смаляк, раскрываў рот і вывальваў на бараду свой чырвоны язык.

— На-а! Па-гля-ядзі! — апраўдваўся ён, а сам вока касіў усё на Зоську Кулічык, якая больш за ўсіх вабіла яго сюды, на зборню.

— Хі-і! — рагаталі дзяўчаты.— Ды ў яго язык падвешаны так удала, як у пана Варацілы! І такі ж гладкі, без адзінага прышчыка!

— От табе і Паўлік! Хто б гэта мог падумаць? — падбадзёрваў яго ўсё той жа Худзянок.— Толькі сапе носам, а мог бы і салаўём каторую красуную пацешыць, сто гадоў не адчапілася б!

З таго часу ён на вячоркі не хадзіў свой язык паказваць.

Сказана тады ўсё было жартам, але вось узяў хлопец гэтую дурноту сабе ў галаву: панам якім ці хоць падпанкам ой як хацелася быць: тады б пачалі ўсе бачыць, што нарабіў бы той яго язык — калі сказаў бы якое слова, адно паспрабуй зрабіць не так, як хоча пан Павел!

Бацькі ў яго не было, пра гэта ён не вельмі і распытваў у маці, бо калі яны засталіся жыць пасля смерці дзеда і бабкі толькі ўдваіх, дык думка зрабіцца панком добра засела ў яго душу. Ён нават падзяліўся аднойчы гэтай марай са сваёй маці, але тая чамусьці не вельмі ўхваліла яго намер:

— Частуйся, сынку, тым кавалкам пірага, якога табе адкроіў бог, бо і той вырвуць з рук, як некалі ў твайго нябожчыка бацькі! Лез-пнуўся, як жаба на алешыну, а замест панства — атрымаў вечнае царства!

І больш Паўлік пра гэта з маці не гаварыў ніколі, але карцела даведацца пра бацьку, як гэта ён пнуўся на алешыну, а патрапіў у яміну?

Толькі пазней добрыя людзі сказалі, што быў ён крыху не такі, каб сякое-такое багацце сваімі рукамі скалаціць, а больш ноччу ў паны прабіраўся, дык недзе яго і спынілі на той начной дарозе, а дзе, толкам ніхто і не ведае. Паплакала маці, паплакала ды таксама, лічы, што забылася!

А пасля пайшлі іншыя часіны: паноў — па баку, крыху ім з маці і зямлі дарэзалі, але Паўліку гэта не вельмі шэнціла: а дзе ж той капялюш ды сярэбраны гадзіннік на цэшцы? Цяпер і тыя, хто іх меў, пахавалі гэтае панскае хараство так, што, не дай бог даведаюцца з часовага камітэта! Бедны мужык пайшоў у ход: яму і павязка на рукаў, і стрэльба ў рукі — лаві тых паноў ды падпанкаў гіцляватых, хто яшчэ за Буг не даў лататы...

Тады ўжо Паўліку, мусіць, ішоў дзевяты гадок, ён скумекаў, што грамата цяпер галоўны сэнс займела, каб выбіцца ў людзі.

Дык, падвязаўшы свае клееныя-пераклееныя галёшы нейкімі вузлаватымі матузкамі, пачаў наведваць школу ў райцэнтры. Але навука — цяжэйшай работай яму падалася, гэта не тое што пасвіць кароў: там мазгі павінны варушыцца, як вусы ў сома, а язык блентацца ў роце, каб аж рот не закрываўся. Ды хітры Павел зразумеў, што і тут можна бачком ля другіх выскачыць наперад!

Калі хто з хлопцаў зацягнецца самакруткай з высушанага моху ці вішнёвага лісця, ён не забываў без

падказкі настаўніцы Вольгі Сідараўны далажыць ёй аб гэтым:

— А Лёня Карпук ледзь сёння дрывотню не падпаліў, калі крэсівам высякаў агонь для курыва!

І хутка Паўліка прызначылі старастам класа. А гэта ўжо сякая-такая ўлада! Цяпер ён і настаўніку можа на парушальніка школьнага парадку данесці, і ад сябе катораму кухталя ў спіну даць! Смачная гэта рэч — улада! Кожны на цябе пазірае са страхам, мяркуе, што ты з ім зараз зробіш. І пайшло-паехала!

Паўлік да войска пасля вайны ўжо схадзіў, бо ў вайну надта баяўся і немцаў, і партызанаў, адсядзеўся на хутары, хоць некаторыя яго аднагодкі і партызанам памагалі. А Павел пасля войска зачапіўся ў нейкія там агенты.

Мно-ога вады ўцякло з той пары, і зараз ён вось мае асабісты кабінет аж у вобласці! Жартаваць тут няма як! Да такога высокага месца таго-сяго варона і касцей не данясе! А ён сам туды дабраўся, крыху локцямі папрацаваў, але свайго дабіўся: пан не пан, а начальнік, некалі і над панамі былі яшчэ паны, ад якіх трымцелі ўсёй душой больш меншыя падпанкі: тут, браце, цэшка цябе не выратуе, круціся-паварочвайся па-іншаму!

Падагнуліся ў Ляксандраўны ногі, да таго цела захісталася ў бакі, што яна павалілася проста на тратуар.

Павел Навумавіч у гэты час бег з партфелем у руках другой, бочнай вулкай, раз-пораз пазіраючы на свой электронны гадзіннік. Да адыходу цягніка заставалася зусім мала часу, а трэба яшчэ ўзяць білет, знайсці некага, каб уцягнуў яму ў вагон той рукзак, што прывалакла раней яго на вакзал Ляксандраўна і паставіла ва ўмоўленым месцы, каб людзі нічога не здагадаліся...

Пераходзячы тую вуліцу, па якой пайшла Ляксандраўна, ён заўважыў, што недалёка сабраўся натоўп

людзей: жанкі размахвалі рукамі, аб нечым раіліся, мужчыны — хто спакойна пакурваў, а хто, падбадзёраны куфлем-другім піва, даказваў нешта сваё якому-небудзь выпадковаму слухачу, якіх тут зараз не бракавала, бо быў якраз нядзельны дзень.

Павел Навумавіч зірнуў, і яго ахапіў страх: нехта з натоўпу адцягваў убок той яго здаровы рукзак, які ён толькі што падсабляў узяць на плечы маці, гаворачы пры гэтым:

— Даруй, Ляксандраўна, але я не магу... Да суседа Пеці хадзіў, ды той па грыбы паехаў, а старой яго маці не ўзваліш на спіну за траяк цяжкі рукзак...

— Разумею цябе, сынок, разумею! — кажа Ляксандраўна, якую гэтак жа кліча і Павел Навумавіч ужо з таго часу, як у рукі ўзяў рыжую папачку з пазвязванымі матузкамі.

— Так будзе больш афіцыйна! — казаў ён тады Ляксандраўне.— Бо некаторыя падумаюць, што выкарыстоўваю сваё службовае становішча ва ўласных мэтах...

— Разумею Вас, Павел Навумавіч! — адказала тады «афіцыяльнаму» сыну Ляксандраўна.

Калі ўжо Павел Навумавіч служыў у войску, да Ляксандраўны прыстаў быў нейкі пячнік, што ляпіў людзям печы ды грубкі. Ён быў з Валыні, недзе з-пад Ковеля ці Шацка. Хутка і сын Іван знайшоўся, але пячнік, наглытаўшыся за жыццё лёгкімі многа цаглянага пылу, неяк злёг, лета пахірэў ды і памёр.

Але са сваім новым братам Павел кантакту не наладзіў і дагэтуль: нізкі палёт у таго аказаўся — то шафераваў, то слясарыў, а на партфелі пазіраў, як медны цвік на стальную пліту — не прабіць яму той пліты, гарту не хапае! Увесь пайшоў у бацьку.

Таму, калі Іван абзавёўся сваёй сям'ёй, адпачкаваўся ад роднай хаты ў сваю дамоўку. Да маці заходзіць, дапамагае чым можа, але з Паўлам Навумаві-

чам сустракацца для высокай бяседы пакуль што вялікага жадання не выявіў.

Павел Навумавіч не ведаў, што яму зараз рабіць: падысці да маці ці перачакаць дзе ў завулку? Наш горад у час бяды разбору не мае, хто ты такі: начальнік ці непрыкметны чалавек, а калі што кепскае ўчвэрыў, любому дасць такога паляру, якога ні на якой нарадзе табе не дадуць!

Ён азірнуўся: якраз на скрыжаванні вуліц стаяла будка тэлефона-аўтамата. Ён мігам выклікаў «хуткую дапамогу», адскочыў убок і прысеў на адно калена, нібыта сабіраючыся завязаць у чаравіку разбэрсаны шнурок. У гэты час з выццём сірэны пад'ехала «хуткая дапамога». Людзі трымалі Ляксандраўну ўжо на руках, пасля перадалі яе санітарам, якія паклалі старую на насілкі, і машына рушыла ў бальніцу.

Калі ўсе цікаўныя разышліся хто куды, на месцы, дзе ўсяго некалькі хвілін назад было многа людзей, праўда, крыху збоку, застаўся ляжаць мяшок, які называюць па-гарадскому — рукзак.

Павел Навумавіч крыху павагаўся, але пасля рэзка накіраваўся да рукзака. Абвёў вакол сябе вачыма, ці няма каго побач. У кроках дваццаці ад яго гаманілі два п'янаватыя, а можа, так здалося Паўлу Навумавічу, дзецюкі.

«Здаецца, прыезджыя? — узрадаваўся Павел Навумавіч.— Ды і падышлі яны толькі што! Данясуць за пляшку піва рукзак да вакзала...»

Азіраючыся, ён пабег проста да хлопцаў, турзануў аднаго з іх за рукаў.

— Якія касмічныя праблемы цябе хвалююць, татуня? — азваўся не той, да каго дакрануўся Павел Навумавіч, а другі.— Кантуйся адсюль, пакуль не павезлі так, як тую бабуленцыю, што і рукзака перад вечным царствам выраклася... А кажуць, маці нейкага вельмі вялікага начальніка! Хацеў бы я яго зараз

убачыць, я б яму той рукзак на шыю... ды ў вір рачны, яшчэ б і плюнуў наўздагон!

— Канчай, Вася! — супыняў хлопца яго калега.

— Што канчаць? Кажуць жа, што яму і цягнула той трохтонны цяпер для яе рукзак!

— Ды я нічога,— паціху сказаў Павел Навумавіч.— Хацеў папрасіць закурыць...

— Дай яму, Вася, цыгарэціну дымануць, хай прыпаліць ды адшвартоўваецца на ўсіх парусах у любы бок! Сем футаў табе пад кіль, татуня!

Павел Навумавіч уцягнуў у каўнер галаву, крадком азірнуўся на рукзак і амаль подбегам кінуўся да вакзала.

Першая думка, якая прыйшла яму ў галаву: «Пазваніць у бальніцу ды папытацца, як і што?» Пасля ён гэтую думку рашуча адхіліў: даведаюцца людзі, што ён быў дома, сам наладаваў гэты чортаў мяшок-рукзак і нават паддаваў яго старой матулі на плечы. А то хто яшчэ знойдзецца «граматны» ды і пісане ўверх: так, маўляў, і так... Можа не паздаровіцца! Цяпер за ўнутраную чысціню людзі пачалі брацца як ніколі! А ці мала ў мяне і зайздроснікаў, і проста адкрытых ворагаў? Ім зараз толькі факцікі кампраметуючыя на Паўла Навумавіча падавай, а ўсё астатняе яны ўжо зробяць самі: дзе цішком, дзе смяшком, а падножку падставяць нечакана! Хоць і маці шкада, але і сябе трэба пашанаваць у першую чаргу, бо яна сваё ўжо пражыла!

Павел Навумавіч заплюшчыў вочы, каб аднадушна прыняць саламонава рашэнне.

«Не! — глыбакадумна разважыў ён.— Пазваню заўтра з вобласці! Так будзе аўтарытэтней намнога!»

## «Міннае» поле

Яны не ведалі, як каму каго называць: хлопчык не меў права клікаць яго бацькам, або, як кажуць часам жартаўнікі,— дваюрадным бацькам, бо ён ужо да гэтага з'явіўся на свет невядома ад каго, дык дзядзька Адам даводзіўся яму быццам бы ўжо аж... траюрадным бацькам.

Калі хлопчык хацеў звярнуцца з якім пытаннем да айчыма, ён чырванеў, доўга ўнутрана напінаўся, саромеючыся самога сябе, і толькі потым неяк нягегла, знябожана, ціхім-ціхім голасам вінавата абзываўся:

— Маці казала, трэба ў хляўцы жэрдкі мацней прымацаваць, бо свіння лычам зусім іх паадрывала,— і хлопчык зноў змаўкаў.

— Зараз пойдзем падправім! — коратка кідаў Адам і браўся за нажоўку, бо сякера ў яго заўсёды была ў хляўцы.

Рыгорка браў з шынбалачка малаток, жменю цвікоў, нацягваў на ногі гумовыя боты маці, і яны апускаліся з трэцяга паверха іх кватэры, каб ісці да хляўца, які знаходзіцца за вуглом невялікай Адамавай сядзібы, дзе ён раней жыў са сваёй жонкай Лідай.

Ішлі моўчкі. І кожны думаў пра сваё. Рыгорка размашыста ставіў гумовікі маці ў пажухлы, набрынялы вадой снег, стараючыся не адстаць ад свайго айчыма, і, пазіраючы ў немалады ўжо таго затылак, меркаваў: «У людзей ёсць сапраўдныя, свае, родныя бацькі, якія і папесцяць на ўсю шырыню душы, а калі часам і папружкай пачастуюць, таксама невялікае гора! Назаўтра бацькоўскае сэрца адыдзе, абмякне, і будзе зноў і

ласка, і шчырасць... І ты адчуваеш сябе не лішнім, за цябе ёсць каму заступіцца, абараніць, калі што... А тут! Маці мяне да бабулі прынесла, як гаворыцца, у прыполе, пад людскі сорам і перашэпт, што вось ва ўсіх дочкі як дочкі, а ў Якімавай Мані донька — на ўсё сяло такога сораму не чутно! Мяне і ў дзіцячым садзе дражнілі: «Эй, Рыгорка, злезь з пагорка, пайдзі бацьку пашукай! Ён жа не ў Амерыку збег, а недзе да другой мамкі пабег!»

Пры гэтых цяжкіх, балючых успамінах Рыгорка з надзеяй глядзеў у патылак айчыму, але радасці чамусьці ў душы не было: слязою заўсёды канчаліся ягоныя думкі аб вялікай чалавечай шчырасці, якую павінен даць сыну бацька.

Яны і пасябравалі з будучым айчымам, калі майстравалі гэты хлявец, куды спярша былі пасяліліся адны куры, а пасля да іх падсуседзіўся і парсючок. Рыгоркава маці, Ксеня Уладзіміраўна, папрасіла дзядзьку Адама збудаваць ёй гэтую будыніну для курачак, калі што, і для будучага парсючка: у райцэнтры на зарплату не вельмі разгонішся, а калі сваю свінку зімой прычавіш, ніколі не пашкодзіць.

Адам са сваёй Лідай даўно калаціўся, жыў не палюдску, адно смяхоцце: нават калі выдавалі старэйшую дачку Ніну замуж, ён сышоў да сваіх бацькоў, усунуўшы ў рукі свайму будучаму свату некалькі соценных крэдытак.

— Вазьмі! — ціха сказаў ён і хацеў ужо выходзіць з хаты, але сват Андрэй перапыніў яго ў дзвярах:

— Не галаву, Адаме, а дыню на плячах сваіх носіш... Хай бы ўжо гэтае варыва заварвалі пасля вяселля, а то ж... Пры жывым бацьку выходзіць замуж без бацькі — гэта, прабач, сватко, што казла даіць замест казы...

Пачырванеў тады Адам, увесь напяўся, балюча зірнуў у вочы Андрэю, але змаўчаў.

— Забяры свае грошы, чалавеча, ды не смяшы людзей: пасядзі з гасцямі на вяселлі дачкі, а пасля я ўжо табе і шапку падам, і паліто дапамагу апрануць — усе чатыры бакі свету твае, айда, галубчык, ды пра парог свой забудзь, ён цяпер чужы для тваіх ног...

— Усё адно палова дома — мая! — як са сну азваўся Адам.

— Не мая ж — твая, вядома! Але калі ў адным доме два ваўкі будуць жыць, так, як гэта робіце вы з Лідай, далібог, я б падараваў не толькі палавіну дома, а і ўвесь дом, адно б не бачыць кожны дзень ворагам некалі такога блізкага чалавека... Вы ж, помніцца, здорава кахаліся, а цяпер: яна — у каноплі, а ты — у картоплі!

— Што было, тое сплыло! — разважліва мяркуе Адам.— І я вінаваты, што часам чужой спадніцы не мінаваў, але ж і яна — толькі запах грошай шанавала, а на мяне... А гэта, сваток, ведаеш, як баліць? Ты ляжы ў кутку, ад болю канай, стагні, што хочаш рабі, а яна ў гэты час паплёўвае на пальцы ды дзесяткі, як тыя карты, тасуе...

— Ужо ж так і было? — смяецца Андрэй.— Калі надта многа дзесятак у жончыных руках, гэта, брацё, не загана: прыстасуйся як след, дык і будзе з чым каля вецярка праветрывацца, ха-ха-ха! А ты бяду ў чым убачыў? Бяда тады, калі ў адну кішэню руку ўсадзіш, усе закуткі абмацаеш, а выцягнеш дулю з макам, у другой паўгадзіны леташніх грошай пашукаеш — і таксама дзірку ад баранка выцягнеш... А нутро смаліць, пячэ з учарашняга! Вось і бяжыш суседцы кампліменты гаварыць, каб на які куфель піва пазычыла, раздабрыўшыся...

— У каго менш тых грошай, той пазычыць лягчэй, а ў каго... Пры вялікіх грашах — заўсёды маленькае сумленне ў чалавека! Па сваёй былой жонцы ведаю...

— Чаму — па былой? — вылупіў вочы сват Андрэй.

— Дык ты хіба не чуў? На тым тыдні нас суд развёў...

— Упершыню чую! — хітравата прыкідваецца нязнайкам Андрэй.— От, завазіўся з гэтым вяселлем, што зусім не ведаеш нават, хто каго любіць перастаў... А можа, вам суд вытрымку параіў зрабіць?

— А што з таго, сват? Як наважыўся што зрабіць я цяпер, будзе тое і ў чацвер...

— А сёння, сваток, ужо пятніца! А заўтра і вясельнічкі твой парожак перступяць...

— Не, не ўгаворвай мяне, Андрушка! Я табе выгадаваў нявестку, а ты ўжо глядзі сам, каб яна з твайго падворка не збегла назад...

— Будзь спакойны, чалавек божы! Не збегла ад мяне мая жонка, не збяжыць ад сына і яго нявеста...

— Пабачым! — неяк ужо зусім знябожана сказаў Адам і памкнуўся да дзвярэй.

— А грошы ты свае забяры, на ўласнае вяселле яны табе спатрэбяцца,— сунуў у кішэню Адаму Андрэй ягоныя сотні.

Вяселле прайшло без Адама, ён недзе ў схованцы перасядзеў тыя цяжкія для яго дні, але грошы дачцэ выслаў па пошце, без адзінага слова ў тым месцы пераводу, дзе напісана «Для пісьма».

...Жылі, можна сказаць, як немец з туркам: ён варыць, яна ў сталоўку бяжыць снедаць, яна стане да газпліты — ён шапку на вушы ды на хаду пачынае выварочваць кішэні, ці хопіць сёння хоць капеек на гарбату з піражком?

Жыццё ў Адама заскрыпела, як нямазаныя калёсы. Але воз хоць і пішчыць, а ехаць трэба!

Вось тады ён і напаткаў Ксеню Уладзіміраўну: праходзілася яна паўз яго двор некалькі разоў на дзень на рэчку пад руку з невялічкім хлопчыкам Рыгоркам,

кожны раз пабліскваючы вачыма ў бок Адама, які іншы раз корпаўся каля хлява. Бо ўсё ж вайна вайной, а есці трэба!

Аднойчы Ксеня Уладзіміраўна пасмялела, азірнулася па баках, ці няма каго старонняга побач, падышла да Адама і ціха сказала:

— Адам...

— Васільевіч!

— Адам Васільевіч! — Ксеня Уладзіміраўна зноў азірнулася, але больш за ўсё яе працяглы позірк паглядзеў на дарогу, па якой пайшла ў горад Ліда, былая Адамава жонка.— Адам Васільевіч, я чула, вы добры майстар, а мне трэба сякі-такі хлявец зляпіць... Ці не паспачувалі б вы саламянай удаве?

Яна заўсміхалася, але ўсмешка выйшла нейкая зусім нерахманая, нехлямяжая, нават, як здалося Адаму, крышку нібыта і вінаватая, крадзеная... Счырванеўшы, Ксеня Уладзіміраўна апусціла долу вочы, зацерабіла ў руках нейкую дробненькую галінку, як дзяўчо-падлетак, затым рэзка ўзняла галаву, больш бессаромна, чым проста адкрыта, зірнула ў Адамавы вочы:

— Смуткуеш без жончынай ласкі? Бачу — дурань, калі не згаджаешся...

Гэтыя словы нібы прыціснулі Адама да самага долу, паклаўшы яго магутнае цела адразу на дзве лапаткі. Яму затхнула дыханне, ён зніякавеў, не знаходзіў у галаве патрэбных слоў, якія б ажывілі яго зараз ад такой раптоўнай ачмурэласці.

— А я яшчэ нічога не сказаў,— ледзь чутна прамовіў ён і пачаў адрываць свае лапаткі ад долу — яго-нае цела пачынала наліваецца нейкай прыемнай стомай, якая аваладвае ім тады, калі сэрца пачуе блізкую чалавечую ласку.

— Я заўсёды добрых людзей пазнаю па вачах,— яшчэ больш чырванеючы, кажа Ксеня Уладзіміраўна.— Зірнеш праз гэтыя вокны ўсярэдзіну хаты ды

ўжо і бачыш: там у печы полымя шугае, там патэльня курodыміць, а ля стала ўжо свякроў аладкамі рот це шыць... Дык па руках?

«Охо-хо-хо! — тайна думае ён.— Нездарма ж твой сынок роднага бацькі не ведае! Не аднаго ты ўжо скруціла, не ў аднаго сэрца з грудзей вырвала ды выкінула дзе пад ногі, каб людзі растапталі! Цяпер, відаць, чарга за мной!»

Спярша ён хадзіў да яе на абеды, калі яны з Рыгоркам чаўпліся каля таго хлява. А на абед яна не скупілася: закуску такую адны багі ядуць, ды і то толькі па гадавых святах! А гарачыць нутро была магчымасць чым хочаш: каньячок, гарэлка, марачныя віны! Не тое што пры Лідзе: на «чарніла» дасць два рублі, ды яшчэ і рэшту павінен прынесці ёй дамоў!

— Дзяцей буду сухім хлебам душыць? — папракала ў такіх выпадках Ліда.

А Ксеня Уладзіміраўна, якая працавала выкладчыцай прафесійнага вучылішча, толк у стравах і напітках ведала дасканала:

— Каньячок, Адам Васільевіч, кроў па жылах ямчэй гоніць!

Усміхнецца тайна, блісне ў бок Адама спадкрадня вачыма, па-вучонаму ўдакладніць:

— Ды і на прыгожых дзяўчат вочы паверне, калі каторы з мужчын забыў варочаць іх сам...

Чырванеў Адам за сталом да самых вушэй, але ён не з дурных, ведаў, у які бок колы пачынаюць круціцца...

А калі дабудаваў хлявец і за работай яго прыхапіў прыцемак, дык, добра павячэраўшы, застаўся і нанач у Ксені Уладзіміраўны.

І зараз, во, так кожны раз ідзе да таго хляўца з Рыгоркам, пераадольваючы ўчастак дарогі каля свайго панадворка, як «міннае» поле, стараецца не глядзець і ў той бок, дзе некалі ў яго было столькі шчасця: з

меншанькай пралюляўся, бо жонка працавала ў гандлі, у рабочы час не адарвешся ад работы дамоў і на хвілiначку, дык Адам, які дзяжурыў пазменна на электрападстанцыі, быў і за няньку ў вольныя гадзіны, і за кашавара.

І цяпер, калі яны праходзяць з Рыгоркам, дык яго меншанькая — Рытка — увесь час пазірае яму ўслед смутнымі вачаняткамі, ледзь не крычыць:

— Рыгорка, навошта ты адабраў ад мяне майго татку?

Але ёй маці сурова наказала яшчэ тады, калі Адам жыў дома:

— Няма ў цябе больш, Рытачка, таты! Гэта — чужы дзядзька!

Рыта гэтай восенню пайшла ў «нулёўку». Яна ўжо адчувае сябе амаль дарослай і ведае, што раз ва ўсіх ёсць таты, дык ёсць ён і ў яе!

Ідзе Адам паўз сваю мураванку, стараецца нават і вокам не кінуць на яе, а сэрца заліваецца крывёй: ён усім нутром бачыць абадраныя дошкі канька даху,— відаць, калі ўслініцца зацяжны дождж, уся столь мокрая! Праўда, зараз зіма, але ж яна не вечная, во, і сёння снег зжух, асеў, зрабілася адно месіва, ісці цяжка...

Ды цяжка ісці Адаму не таму, што ідзе па набрынялым вадой снезе, а таму, што пераадольвае зараз тое «міннае» поле, якое заўсёды яго гняце, прымушае на гэты час адчуць у сабе зацятую нікчэмнасць, якая пазбаўляе яго права адчуваць сябе паўнацэнным чалавекам...

Учора ў Адама з Лідай быў суд на раздзел дома. Але далі тэрмін падумаць, не спяшацца, хоць яны і былі ўжо афіцыйна разведзеныя.

— Гара з гарой не сходзяцца! — жартавала суддзя Іна Сідараўна.— А людзям часам захочацца не толькі сысціся, але і збегчыся...

— Таго не будзе! — буркнуў на судзе Адам і апусціў вочы.

Ён саромеўся спаткацца з вачанятамі Рыты, якая прыйшла на суд разам з маці, але суддзя параіла адправіць дзіця дамоў:

— Не трэба псаваць нашымі грахамі душу дзіцяці!

Але ж Рыта прастаяла ў калідоры, аж пакуль не скончыўся суд: чатыры месяцы загадалі Адаму думаць! І тут, во, якіх паўсотні крокаў з цяжкімі думкамі прайсціся — невыноснае выпрабаванне, не тое што яшчэ з такімі думкамі хадзіць ажно чатыры месяцы!

Калі Адам мінуў ужо свае веснічкі і даходзіў амаль да блокаў, з якіх меркаваў узвесці новы хлеў, дык галава сама павярнулася направа: у гародчыку, зняўшы рукавічкі, якія віселі на тоненькіх матузках, Рыта ляпіла з адталага снегу бабулю. Яна ўбачыла тату, апусціла ручкі, якія былі сінія-сінія ад холаду, і, як укапаная ножкамі ў дол, застыла, незміготна пазіраючы на Адама. Яе чорныя, як агат, вачаняты не міргалі, раптам яна падняла ручку і церанула колькі разоў па твары...

Пахаладзела Адамава сэрца, ногі зрабіліся нібы з ваты, з рук упала на ўтаптаны снег нажоўка.

Ён спыніўся, не могучы скрануцца з месца, і так доўга глядзеў проста ў вочы дачкі. Рыгорка таксама спыніўся, пасля паволі абмінуў Адама і, адышоўшыся колькі крокаў, пачаў яго чакаць.

«Чужых дзяцей ласкаю, расказваю казкі ім, а сваё ласкі шукае ў снежнай бабы! Грошы, сваркі, падазронасці...»

Хвалі гарачай крыві ўскалыхнулі ўсё Адамава нутро, даўкі камяк падступіў да горла. Ён увесь змякчэў, змізарнеў, не маючы сілы нават, каб сказаць слова...

— Та-атачка! — закрычала Рыта і кінулася да Адама. Ён падхапіў дачку на рукі, прыціснуў яе да грудзей і не здолеў сказаць ані жаднага слова. Толькі

ціха-ціха, нібы баючыся, каб не выпала з рук яго самае вялікае шчасце, панёс Рыту да веранды свайго дома. Рыта нахілілася з яго рук да ручкі дзвярэй і пацягнула на сябе дзверы.

— Нікому-нікому я цябе больш не аддам, татачка! Не аддам! — шаптала яна.

Адам усё маўчаў, не ведаючы, у якія дзверы з веранды ісці: у хату ці вярнуцца назад?

Каля газпліты стаяла Ліда. Плечы яе дробна калаціліся, з рук паляцеў на падлогу апалонік.

# Чужая дачка

## I

Калі б не Федзева вяселле, Віктар, напэўна б, ніколі-ніколі не сустрэў Сцешу. А Федзю яшчэ да вяселля Віктар папракаў:

— На нашу «камунію» бабылёў замахнуўся, Хведар? — трос за плечы ён жаніха.— Адкаласаваўся, жывым кавалкам аддзіраешся ад здаровага цела?

— Ах, Федзька-кораш, чартаўшчыну пораш! — памагаў ставіць на «пуць ісціны» Хведара Коля Кулецкі.— Столькі ўсе тыцкалі ў наш бок ды крычалі: «Во, каго і пугай не загоніш пад вянец! Во, хто, як воўк агню, баіцца дзявочай ласкі!»

Федзя вінавата пазіраў на хлопцаў, больш маўчаў і толькі зрэдку абараняўся:

— Хлопцы, хутка старасць на карак уссядзе, а што ж мы робім, га? Усё ў жанішкоў саплівых гуляем? Пара б ужо некаторым і ўнукаў за руку на рэчку вадзіць...

Каму пара ўжо тых унукаў вадзіць на рэчку, Хведар не казаў, але кожны «бабыль» адчуваў, што — яму!

Самаму старэйшаму, Хведару, было пад сорак, самаму маладзейшаму — Косцю Кузьмічу — дваццаць шэсць. А астатнім — каму колькі: Віктару, скажам, пайшоў трыццаць трэці, Колю Кулецкаму — дваццаць дзевяты...

Працавалі хлопцы хто кім: хто шафераваў, хто на станку наразаў балты, але ўсе яны жылі ў адным інтэрнаце. Тут і сышліся. Нельга сказаць, каб звяла іх разам якая бяда, але ж, ведама, калі маеш за плячыма за трыццаць, то вялікага сяброўства з дваццаціга-

довым падшыванцам не будзеш вадзіць! Трэба па сабе шукаць «кораша»! Так вось яны і сышліся «па духу»...

Вахцёрша, цётка Вера, у якой самая меншая дачка Алена ніяк не можа сабе знайсці пару, цяпер не магла нікога з той іх «камуніі» бабылёў цярпець...

— Зноў падаліся гітараваць у арэшнік за раку? І калі гэта я на чыім з вас вяселлі чарку перакулю? Далібог, ырак сваіх хворых не пашкадавала б, а ўпілася б... Хоць раз за ўсё жыццё зрабіла б так!

— Падымеш, Вера Іванаўна! Перакуліш! Абы рукі здолелі! А не, паможам!

Тая нязлосна смяялася, ляпала каторага па плячы:

— Дай жа бог чутае бачыць! Дай жа бог!

— І пачуеш, і пабачыш...

— Але калі і сёння прыцягнецеся запаўнач, і на парог не пушчу! На дварэ будзеце спаць! Бо і ўчора ўжо мне каменданціха выгаворвала цэлы ранак: «Ты хто тут, Вера Іванаўна? Слуп дубовы ля дзвярэй, што на тваім дзяжурстве да раніцы дзверы ў інтэрнат не зачыняюцца? Людзі скардзяцца, што «бабылі» ўсю ноч спаць не даюць...»

— Ціха, ціха, таварыш вахцёр! Улічым, справімся, больш рабіць падобнае не будзем! — жартам завяраў Веру Іванаўну Хведар, за свае немаладыя гады без выбару атрымаўшы пасаду старшыні «камуніі» бабылёў.

— Пад сваю асабістую адказнасць, старшыня, бярэш сённяшнюю ноч! Калі зноў мяне пакліча каменданціха, усё на цябе звалю, так і ведай...

Вера Іванаўна спярша вязала шкарпэткі ці якую шапачку, трымаючы на каленях уласных дзяцей, а цяпер робіць гэта, трымаючы ўнукаў, а «камунія» бабылёў усё не развальваецца, а мацуецца як можа, каб не разваліцца...

І вось на́ табе: Хведар Зінкевіч жэніцца! Ды ляг-

чэй было б паверыць, што гара Арарат скрозь зямлю правалілася, чым пачуць такое!

Жаночы персанал інтэрната раіўся-шаптаўся, дзе б раздабыць ранніх веснавых кветак, каб вяселле цвіло, красавала, як у маладзёна, а хлопцы паапускалі галовы, не маглі зірнуць адкрыта адзін аднаму ў вочы.

Усё было так адрэпеціравана на кожны дзень іх жыццё: работа, піва пасля работы ў чым-небудзь пакоі, затым прагулка за рэчку ў арэшнік — у дождж, снег, летам, зімою... І больш такога можа не быць! Жэніцца Хведар, магчыма, за ім «здурэюць» і другія. Але ж нічога не папішаш. Трэба рабіць так, як ужо яно склалася...

І калі ў чырвоным кутку таго інтэрната сабраліся на вяселле, дык людзей было — уга, тры інтэрнаты наўрад ці ўвабралі б усіх: хто сяброўку па рабоце прывёў, а тая папрасіла дазволу прывесці з сабою яшчэ і сваю сяброўку, так што — вочы разбягаліся ў халасцякоў, столькі дзяўчат сядзела за сталамі — на любы выбар!

Аказалася, што ў Хведара нікога з блізкай радні не было: ён быў з дзетдома, таму ўсе клопаты кіраваць вяселлем узваліла на све немаладыя плечы Вера Іванаўна.

— Мой прынцып, ягамосці, вы добра ведаеце: ніякіх выкрунтасаў! Дык цяпер слухайце і рабіце так, як буду загадваць я: каб ніхто не застаўся без пары! Многія думалі, што вас і сам чорт не ажэніць, а я ажаню! Хутчэй за маці родную ажаню! Усіх адвучу ад бабыльскага жыцця!

Хведар тады сядзеў збялелы, яго вясельны касцюм, здавалася, быў толькі накінуты на плечы. Ён не ведаў, куды падзець зараз свае рукі, якія столькі жалеза ператрымалі, столькі машын ажывілі і на якія зараз столькі пар вачэй глядзіць, як на нейкае заморскае дзіва! А ў жонкі ён сабе браў Лену Пашкевіч, прадаў-

шчыцу з бакалейнага аддзела гастранома: толькі там ён і мог штодня сустракацца з Аленай — халасцяцкае жыццё прымушала!

Вера Іванаўна даўно здагадвалася пра гэты Хведараў раман, але маўчала — нікому ні слова, ні паўслова! Федзя саромеўся прызнацца ў гэтым да апошняга дня. Нават калі прыйшоў да яе, каб запрасіць на вяселле, дык, пачырванеўшы, так доўга таптаўся ля стала, што Вера Іванаўна не вытрымала, узлавалася:

— Можа, зноў навалачку ці прастыню некуды ўпараіў? Дык выкруціцца хочаш? Не, галубок, цяпер дзерану, у трайным памеры дзерану, не падарую!

— Ды не, я таго...

— Таго-гэтага! Кажы хутчэй, бо мне няма калі тут цябе выслухоўваць...

— Будзьце пасаджонай маці на маім вяселлі...

— Ух! Мусіць жа, дайшлі мае словы да божых вушэй! Дачакалася! Дажылася! Узяўся-такі за розум хоць адзін «бабыль»! — пляскала ў далоні Вера Іванаўна.

— Узяўся, узяўся! — лепятаў счырванелы Хведар.— Дык будзеце?

— А чаму ж і не? Я разганю ўсю вашу парахвію! Усіх па чарзе пераражаню! А каторы адмовіцца, за самы маленькі грэх з інтэрната вылеціць! Няхай сабе тады хоць міністру скардзіцца, не паможа, калі я сваю рэзалюцыю пакладу!

Дык вось на тым вяселлі разам з Віктарам Вера Іванаўна пасадзіла чарнавокую маладзіцу, чыстакроўную цыганку, дый годзе, Сцешу, таксама прадаўшчыцу з таго прадмага, з якога была і Алена.

Вера Іванаўна даўно ведала, што дзяўчаты маюць вока: Алена — на Хведара, а Сцеша — на Віцю! Яны двойчы ці тройчы заходзілі ў яе дзяжурства, каб сёетое разнюхаць пра хлопцаў, але з якой мэтай, можна было толькі здагадвацца! Тут і дурню будзе зразумела,

што не пойдзе ж дзяўчына да каго чужога пытацца пра хлопца, калі ў яе сэрца не баліць.

Калі папыталіся неяк абыякава пра абодвух, Вера Іванаўна аж ажыла:

— Ды дай мне маладыя гады, я б за любога з іх бегам пабегла б! Кожнаму б ногі ў параным малацэ тройчы на дзень мыла б ды шаўковым ручнікам выцірала б... А то ж ходзяць, ходзяць хлопцы, а хоць бы каторая ў іх бок вокам кінула...

Перазірнуліся дзяўчаты, заўсміхаліся і гэтак ціха-ціха зашапталі:

— Але каб яны пра наш прыход: ні гу-гу!

— Ну, калі дзяўчына тайна пад акно жаніховай хаты ў ноч пракралася, дык заўтра ўдзень бягом у хату прыбяжыць з падушкамі ды прасцінамі за плячыма,— падкалупнула іх Вера Іванаўна.

— Так ужо мы і бегаем ноччу па падваконнем! — не зразумелі цётчыных жартаў дзяўчаты.

Але аднаго разу Вера Іванаўна ўсё ж убачыла, як пасля закрыцця прадмага з-за магазіна выйшаў Федзя і ўзяў пад руку Алену.

— Цьфу, цьфу! — з усмешкай сплюнула вахцёрша.— Будзе нешта новае ў «бабылёў»...

— Горка! Горка! — крычалі на ўсю залу госці.

Хведар збялеў яшчэ больш, затое Алена пачырванела, як гаворыцца, да апошняга пазногця. Яна апусціла вочы, не ведаючы, што рабіць: павінен першы жаніх устаць і пацалаваць нявесту, а Хведар як прыкіпеў да свайго крэсла! Толькі ўсё лыпаў вачыма ды перабіраў пад сталом пальцамі, не абдымаючы нявесту.

— Цалуй Алену! — праз стол падказаў яму Віктар.

— А-а! — мармытнуў Хведар. І, абхапіўшы аберуч Алену, моцна сціснуўшы яе ў абдымках, пачаў цалаваць.

— Горка! Горка! Горка! — запляскалі ў далоні госці.

І ад халодных Аленіных вуснаў, і ад ляскату далоняў, ад крыкаў Хведар у адзін міг з белай намізткі зрабіўся як вараны рак. Сэрца яго ледзь не вырывалася з грудзей і ад радасці, і ад асалоды, і, галоўнае, ад страху. Гэта ж столькі гадоў на яго тыцкалі пальцамі: непапраўны «бабыль»! І тут на́ табе — жаніх! Ён, Хведар Зінкевіч, жэніцца!

Віктара так уразіла гэтая сцэна з Хведаравым цалаваннем, што ён і сам абхапіў сваю суседку Сцешу і горача, пакуль тая не апамяталася, пацалаваў яе ў вусны.

— Нахабнік! — буркнула Сцеша і выцерла рот насавой хусцінкай.— Усю памаду на губах размазаў...

— Даруй, Сцепаніда Аляксееўна, я не хацеў! Неяк само па сабе гэтак непрыстойна выйшла,— сарамліва пачаў апраўдвацца Віця.

Ён так, як і Хведар, пачырванеў, струпянеў ад няёмкасці, апусціў вочы ў талерку са студзенем.

Але Сцеша, стрыгануўшы на Віцю цыганскімі вачыма, прашаптала яму амаль у самае вуха:

— Святы жаніх! Ці ж тое робяць на людзях? — і доўгім цікуючым позіркам пачала вывучаць Віктара, аж пакуль той не адсунуўся ад яе. І калі зайграў завадскі аркестр вальс, усе выйшлі з-за сталоў ды пачалі танцаваць, Сцеша ўзяла Віцю пад руку і сказала, памахваючы ля твару хусцінкай:

— Нешта парна тут, як у пекле... Можа, пройдземся па вуліцы?

Віктара гэтыя словы абледзянілі: што ён будзе з ёй гаварыць, ён жа, па сутнасці, яе так блізка першы раз і бачыць! Ну, сярод шафёраў ён — свая маліна ў садзе, свой дубок у лесе! І з Лідкай Абрамчук, што працуе з ім у адной аўтакалоне, з той ён умее гаварыць:

— Эй, Лідка-каларытка! Пазыч лыжку масла, бо матор пасаджу!

Тая ніколі не адказвала ў дапамозе, але заўсёды выгаворвала:

— Сухароў машынай не возяць!

Гэта яна так пра вялікія Віцевы гады, што ён халасцяк-сухар!

А сама ўжо тройчы «схадзіла» замуж, ведала ўсе тайны адносін паміж мужчынай і жанчынай з такой дакладнасцю, што гэта аж сароміла Віктара. Але ён не губляўся.

— Сухар у далёкай дарозе — верны друг! — жартаваў ён і даставаў якую пасудзіну на масла, бег да Лідчынай машыны.

А тут, во: адзін на адзін з невядомай дзяўчынай, ды яшчэ з такой прыгожай, што ўсё цела кідае ў жар, адно яна зірне на цябе сваімі чорнымі вачыма, якія тояць у сабе больш сакрэтаў, чым увесь Сусвет!

Выйшлі на вуліцу, зайшлі за бэзавы куст, які так прыемна пахнуў вясной і будучыняй, што Віктар ледзь-ледзь утрымліваўся на нагах, і каб, здавалася, не трымала яго пад руку Сцеша, абмяк бы зусім і зваліўся на дол.

— Вось тут і належыць, святы манах, цалавацца! — горача зашаптала Сцеша і абхапіла рукамі Віктара за шыю, паднялася на пальчыках, каб дацягнуцца пацалаваць яго ў вусны, бо была намнога ніжэйшая за Віктара. Але затое ўпоперак ледзь не ў два разыапярэдзіла яго.

Віктар адчуваў, што ён і чырванее, і бялее, калоціцца ўсім целам, але ніхто гэтага не бачыць, дык і яму неяк не рабілася сорамна: ён абхапіў Сцешу за шыю і таксама прынік да яе губ сваімі губамі. Сэрца трапятала, як падбіты верабейчык, па спіне прабягалі то халодныя, то гарачыя хвалі, але хлопец не расціскаў сваіх рук: яго чаравала тое пачуццё, якое здавён людзі нараклі першым каханнем!

Яны стаялі так, абняўшыся, доўга, не перашка-

джаючы сваім бурным пачуццям такімі непатрэбнымі зараз словамі! Забыліся і на Хведарава вяселле, і на танцы. Для іх у гэты міг не існавала нічога!

Але з цягам часу Віктар зразумеў, што ўсё ж нешта трэба было гаварыць. А што? Ён аж зледзянеў ад гэтых думак!

— Даўно вы з Федзем дружыце? — сеўшы на лавачку пад бэзам, спытала ў Віктара Сцеша.

Той нібы і не чуў яе слоў: яго хвалявала іншае — што яму зараз гаварыць са Сцешай, як паводзіць сябе далей? Не будзеш жа цэлы вечар вісець у яе на шыі ды смактаць яе губы...

— А-а! — азваўся ён.— Як пасяліліся ў інтэрнаце, дык і...

— Дык і бабылюем разам! — памагла Віктару ўспомніць Сцеша.

— Ну, ты гэтым нас не дакарай! — узлавана праказаў Віктар.

— А то я не ведаю, як «халасцякуюць» у інтэрнатах? Сама толькі з-за гэтага і ўцякла з інтэрната на прыватную кватэру, хоць і плачу́ цяпер за яе — не дай бог нікому...

— Давай пераверанем пласцінку на другі бок,— папрасіў Сцешу Віця.— Кожны жыве, як ведае сам. Адзін мёдам губы памажа і перакрывіцца, а другі — ад гарчыцы песню спявае! Гледзячы, хто якога каня ў свой вазок запрог!

— А чаму ж ты зараз не сядзіш замест Хведара на цэнтральным месцы на гэтым вяселлі?

— Хіба з табой? — засмяяўся Віктар і зноў прыціснуўся сваімі губамі да Сцешыных вуснаў. Уга, што гэта за прыемнасць: галаву пад сякеру пакладзеш за адзін толькі міг! Дзіва што людзі рэжуцца, вешаюцца, страляюцца, калі ў іх любоў дае трэшчыну, непапраўна разлятаецца на ашкалёпкі, якія ўжо няма ніякай надзеі сабраць у нешта адно, цэлае!

— Ура! Хлопцы, сюды! Тут яшчэ адно вяселле наклёўваецца! Горка! Горка! — закрычаў Коля Кулецкі Косцю Кузьмічу, якія таксама, распарыўшыся ў польцы, выйшлі крыху астудзіцца халаднаватым майскім вечарам.

Віктар са Сцешай нібыта і не чулі, нібыта і не да іх гаворыць Коля.

А той абхапіў рукамі Сцешу і Віктара за плечы і яшчэ з'едлівей зашаптаў:

— Цяпер па «бабылях»! Крышка! Алес капут!

Віктар адпусціў з абдымкаў Сцешу, азірнуўся на хлопцаў і неяк ці то жартаўліва, ці ўсур'ёз сказаў:

— Мая нявеста Сцеша! У наступную суботу распісваемся, праўда, Сцеша?

— А што ж вы думалі: паклікалі дзяўчат у інтэрнат і думаеце, так вам гэта абыдзецца? — кажа Сцеша. Памаўчаўшы хвілю, дадала: — Усіх паклічам на вяселле!

Каго «ўсіх», яна не ўдакладняла, але і Колю і Косцю зрабілася неяк прыкра на душы: маланкава радзеюць калісьці такія маналітныя рады «камуніі» бабылёў.

**II** Віктар касіў траву за хлявом на невялічкім паплаўку, які ўпіраўся ў алешнік, перасыпаны чаромхай, крушыннікам. Часам дзе-нідзе сустракалася там бадзёрая елачка ці стройны малады дубок.

Сцеша ўпраўлялася па гаспадарцы, бо маці была ўжо не надта па старасці хапатлівая да якой нават і лёгкай работы. Ат, там што зварыць, як гаворыцца, ці спарыць — яшчэ туды-сюды, а ўжо палена якое пад прыпечак прынесці ці вядро вады — на тое яе стараліся не дапускаць. Зробяць гэтую работу Сцеша ці яе сястра Вольга, у якой ёсць маленькая дачушка Інка,

што Вольгу называе чамусьці цёткай, а Сцешу — мамай.

Сонца ўжо, як гаворыцца, паднялося на два дубы, раса на траве засталася толькі там, дзе яшчэ быў цянёк ад дрэў, таму Віктар пазіраў больш на тое, колькі было скошана, а не на тое, колькі яшчэ засталося скасіць.

Ён і Сцеша зараз у адпачынку, дык сáма што трэба дапамагчы з сенам Сцешынай маці. У Вольгі таксама няма мужа, і ці ён калі ў яе быў, ці не, пра гэта і праз год не даведаўся Віктар.

— А конча табе ўсё ведаць? — часам злавалася на яго за такое пытанне Сцеша.— Бачыш, як усё выходзіць: Інка маму цёткай кліча, а мяне, цётку,— мамай! Гэта Вольга вербавалася ў Карэлію, дык адтуль і Інку прывезла нам з маці гадаваць. А як там яна ў яе знайшлася — па закону ці міма закона,— адной Вользе і вядома. Дык Інка на нашых з маці руках выкачалася. Вунь якая дзяўчынка стала!

— Бывае! — згаджаўся Віктар. І яны надоўга са Сцешай упіваліся адно другому ў вусны.

Віктар падышоў да алешніку, на ўскрайку якога цякла нешырокая канаўка, зачэрпнуў у прыгаршчы вады, лінуў сабе на плечы, задаволена крактануўшы:

— Усё-такі рай на зямлі, а не на небе!

— Ну не чапай таго неба, а садзіся, во, ды перакусі ў халадку, бо ў хаце мухі не дадуць па-чалавечы паесці... Што ўжо ні рабіла: і хларафосам крапіла, і мухаморы варыла ды смятанкаю палівала, а яны як той пчаліны рой у вуллі, хоць ты вушы затыкай, няма ніякага паратунку...

Гэта прыйшла са сняданкам Сцеша. Віктар зірнуў на сонца, паказаў рукой на недакошаную траву:

— Пасядзі хвілінак пару, даб'ю, во, гэтую «казу» травы, няхай разам ужо ўсё сохне, то і саграбецца

пасля за адзін заход. А то, можа, дождж услініцца, нешта вельмі ў поўдзень пачынае прыпарваць...

— Ы-ы! На небе ні воблачка, адкуль той дождж будзе? — зірнула ў неба Сцеша.— А зноў, хто яго ведае...

— Мочыць не тады, калі просяць, а тады, калі косяць,— сказаў Віктар і ўзяўся за касу.

— Ну, тады я падыду пазней,— задаволена пазірае жонка на шакаладную спіну мужа, на яго магутныя рукі, якія зараз ад касы яшчэ больш набрынялі сілаю, чым ад шафёрскай баранкі. Яна радавалася свайму мужу немаведама як!

Віктар працягнуў па лязе касы бруском, пабрэнькаў мянташкай — чох-дзынь, дзынь-чох! — і зноў засвістаў па мяккай маладой дзяцеліне. Ён адчуў, што плечы яго з непрывычкі крыху нылі ад пераўтомы, але налітыя бадзёрасцю рукі прасілі работы.

— Цьфю-ю! Цьфю-ю! — свістала каса, роўна выбрываючы дзяцеліну, ссоўваючы яе ў кашлаты радок.

— Мама! Мама! — закрычала Інка і, пераскокваючы праз пакосы, бегла да Сцешы. Віктар бачыў, як Сцеша крадком азірнулася на яго, ухапіла дзяўчынку на рукі і амаль подбегам панесла яе дахаты.

— Не хацу ў хату! Хацу да дзядзькі Віці! — перабірала на руках у жонкі нажанятамі Інка, але яе Сцеша не слухала, несла на панадворак. За вішнямі, дзе ўжо і Сцешу з Інкай Віктар не мог бачыць, Сцеша паставіла дзяўчынку на зямлю і супакойвала так моцна, што гэта чуў і Віктар:

— Ідзі да цёткі Вольгі, дык цукерачкаў табе куплю, новыя сандалікі...

— Не хацу цукелькаў, не хацу сандалікаў! Хацу да дзядзькі Віці! — не пераставала ўпарціцца дзяўчынка.

Вольга апошнім часам жыла з Антонам Гурэцкім,

перайшла да яго без усялякага роспісу. Там цэлымі днямі прападала і Інка.

— Ма-ама! Да дзядзькі хацу! — крычала на ўвесь двор Інка.

— Цыц! Цыц! — ляскала па Інчыным задзе Сцеша.— Няма на цябе ніякага ўгаўку! Дзе гэта тая крапіва, дзе? А, вось яна, вось вырасла на тваю ўпартасць!

Віктар перастаў касіць, убіў коссе ў зямлю, выцер ашмоткам травы касу, але не вастрыў яе, не мянташыў: прыслухоўваўся да жончынай мітусні недзе там, за вішняком.

«Нешта мяне вось ужо цэлы год водзяць вакол пальца? — думаў ён.— Няўжо дзяўчынка дагэтуль не разумее, хто яе маці, а хто — цётачка? Ну, няхай на першым часе яна блытала: жыве з бабуляй і цёткай, але ж потым павінна разабрацца — хто ёсць хто? Мусіць жа, ёй казалі, хто яе маці? Няўжо яна такая някемлівая? Ёй жа ўжо чацвёрты годзік пайшоў. Нешта тут, як гаворыцца, дым не ў той комін паперла!»

Віктар пачаў перабіраць у памяці ўсе дробязі, на якія ён раней не звяртаў вялікай увагі: калі хто з суседзяў падыдзе да яго, каб перакінуцца словам-другім, дык ці Сцеша, ці яе маці, Пелагея Сідараўна, як пер'ем падтыканыя, тут як тут:

— Пойдзем у хату, зяцёк! Не забаўляй чалавека, бо ці мала якой работы ў кожнага цяпер! А ты: тарыбары, ботаў пара, толькі босая нага! — І Віктар нехаця цягнуўся ў хату, на хуткую руку развітваючыся з выпадковым вяскоўцам.

— Ну, мы яшчэ нагамонімся, я тут прабуду да канца адпачынку, а цешчу з жонкай трэба паслухацца! — казаў ён.

— Канешне, цешчы трэба слухацца, калі хочаш, каб частавала яешняй ды паляндвіцай,— падміргваў вясковец і ішоў у свой бок.

— Будзе ўсё, усё будзе, зяцёк дарагі! — абяцала

Пелагея Сідараўна і зачыняла за Віктарам веснічкі.

А ў хаце і на самай справе яго чакала і яешня, і паляндвіца, і яшчэ сёе-тое...

— От бы і пачаставаць каго,— часам, захмялеўшы, параіць жонцы і цешчы Віктар.

— Увесь свет не перачастуеш! — злавалася Сцеша.

— Гэта што пры табе, зяцёк, усе такія лагодныя ды шчырыя, а толькі ты ад'едзь, двор шыбакамі закідаюць... І курэй у твой гарод праз плот напрэ, і свінню ў тваю бульбу накіруе, адно замок на дзверы павесь ды сыдзі куды на хвіліначку...

— Гмы! — гмыкаў Віктар і моўчкі частаваўся цешчынымі прысмакамі.

— Тут і да міліцыі справа даходзіла не раз,— умешваецца ў гаворку Сцеша, перазірнуўшыся перш з маці.— Ты думаеш, што вунь Тамаш Лісіцкі, што на лысай галаве капялюш, як той парасон, носіць, вельмі ўжо такі лагодны, што цераз вуліцу табе кланяецца ды капелюшом паўдня махае? Культурным хоча перад табой, гарадскім, здавацца. Бо я пусціла чутку, што ты інжынер у трэсце...

Віктар як жаваў кавалачак паляндвіцы, так і знерухомеў.

— А навошта ж вераб'я арлом велічаць? — незадаволена ён паглядзеў на Сцешу.

— Усе так робяць цяпер! — заступаецца за дачку маці.— Раней які задрыпаны парабак панскі ў другім сяле сябе панам называў, хоць ногі ў лапцях так растопча, што і ў юхтавы бот ніяк не ўплішчыць, не тое што яшчэ ў які хромавы... А цяпер кожнаму начальнікам хочацца здавацца! Чым жа ён не начальнік, калі пад'едзе да бацькі з маці на ўласнай легкавушцы, з чараўком, нібы дыню пудовую пад кашулю запхнуў, па-гарадскому словы нашы выварочвае, дык і чын сабе прыдумае, якога і ў дзяржаве нашай няма...

— Дык ты яшчэ не дакасіў? — перабіла Віктаравы

думкі Сцеша.— Тады ліха яго бяры, калі і прападзе якая латка той травы, не збяднеем! Давай перакусім...

— Можна і перакусіць,— схамянуўшыся ад думак, млява адказаў Віктар і паклаў на скошаную траву касу, ухутаўшы яе будучым сенам, каб яна не награвалася на сонцы ды не адпускала свайго гарту.

— А што гэта ты апошнім часам, як той авадзень ля каровы, дудзіш? Можа, чым табе не дагадзіла? Альбо цешча вельмі разгуляцца не дае? А то зараз бы сабе паўвёскі сябрукоў знайшоў: пі-налівай! Кончылася ваша «камунія», цяпер жончынага хутарка трымацца трэба, жонка цяпер табе і галава, і ногі: і падумае за цябе, і раскажа ды пакажа, куды табе пайсці ці паехаць...

— Мама! Мама! — зноў выскачыла з вішняку Інка і кінулася да Сцешы.— Не пляганяй мяне больш да цёткі Вольгі, хацу з табой у голяд...

Сцеша так і струпянела ад гэтых Інчыных слоў: збялела, рукі яе апусціліся ўніз, губы пасінелі, вочы закаціліся пад лоб, і яна захісталася ў бакі і, каб да яе не падскочыў Віктар ды не падхапіў, упала б проста на нос касы, які востра вытыркаўся з-пад скошанай травы.

— Ма-ама! Ба-аба! — закрычала пераляканая Інка.

Віктар пасадзіў жонку на скошаную дзяцеліну, даў напіцца з біклажкі хлебнага квасу.

«Цяжарная!» — мільганула ў Віктаравай галаве і радасная, і адначасова трывожная здагадка.— І яна пра гэта ні слова?»

На Інчын крык бегла Пелагея Сідараўна.

— Што, што тут такое здарылася? — не разумела яна.

Сцеша крыху прыйшла ў прытомнасць, на твары знайшлася ружовасць, вочы ажылі і засвяціліся звычайным сваім цыганскім цяплом і спагадай.

— Нічога, мама,— прашаптала яна і папрасіла: —

Вазьмі Інку ды схадзіце да Вольгі, яна яшчэ ўчора прасіла, а я і забыла сказаць...

Пелагея Сідараўна доўга глядзіць то на Сцешу, то на Віктара, і ў яе ў вачах закруціліся слёзы.

— Нічога я вас, дзеткі, не разумею! — войкнула яна і ўзяла на рукі Інку.

— Ты што, цяжарная? — пасля доўгай, стамляючай і загадкавай, маўчанкі папытаў Віктар і зазірнуў у вочы Сцешы. Яна не адвяла свайго позірку ўбок, а неяк больш адкрыта, чым калі, не міргаючы, роўна паглядзела ў вочы мужу.

— Мацуйся, Віцёк! — прашаптала яна.

— Значыць, сына, Сцешанька, хутка Віктар Фёдаравіч на руках загушкае? Так? Назавём яго на старажытны лад — Кірылам ці Тарасам! Цяпер гэта модна — азірнуцца на продкаў... Усе так называюць... А калі дачка? Зоськай нарачом! Таксама старое імя... Хіба кепска?

— Рана радавацца, яшчэ нічога невядома,— ціха сказала Сцеша і прыціснулася галавой да Віктаравага пляча.— Год, цэлы год, Віця, я гуляю з табой у крошкі-кошкі-мышкі! Дашчэнту ўжо абрыдла мне гэтая гульня! Агнём душу паліць... Не магу, не магу больш! — наўзрыд заплакала яна.

Віктар азірнуўся навокал, не ведаючы, якую ўзяць раду: ці то клікаць цешчу, ці, можа, нават і збегаць у суседнюю вёску па фельчарку — у Сцешы, па ўсім, пачыналася істэрыка.

— Ну, не трэба мяне такім чынам лякаць,— ласкаў Віктар яе за плечы.— Вазьмі яшчэ папі квасу...

Сцеша зрабіла некалькі глыткоў з біклажкі і крышку супакоілася:

— Хацела цябе настрашыць, а сама да смерці пералякалася...

— Нічога не разумею,— заўсміхаўся праз сілу Віктар.

— Тады слухай: што і як было, цяпер ужо не вернеш, ды гэта і не важна, пра розную пошасць язык не паварочваецца і гаварыць, але... нікуды не дзенешся, трэба расказаць!

— Ну, калі нешта важнае і яно не церпіць адкладу, то кажы, не маўчы,— хоць ні аб чым і не здагадваючыся, пасмялеў Віктар.

— Буду без уступаў,— асмялела і Сцеша.— Інка — мая дачка, а не Вольчына...

Астатняе Віктар не даслухаў: ён на момант праваліўся ў нейкую глухату і немату, у вачах спярша заскакалі блакітна-ружовыя агеньчыкі, затым усё сцямнела. Але гэта цягнулася толькі кароткі момант, Віктар гэтак жа хутка ачомаўся, як і згубіў прытомнасць. Адразу ўзяў сябе ў рукі, думаючы, што Сцеша не заўважыла такога яго душэўнага псратрусу. Яны доўга глядзелі адно аднаму ў вочы, зусім не бачачы адно аднаго.

— Ён мяне ад турмы ўратаваў,— спавядалася перад Віктарам Сцеша.— Я была пратаргавалася ў магазіне, а ён быў следчым. Яго за маю справу звольнілі з работы, але і мне перасуду не было... Адзін раз, усяго адзін раз з ім пабыла... Паскуднік аказаўся, нягоднік! Залатыя горы абяцаў! А пасля і не заявіўся, каб дачушку сваю пабачыць, хоць я яму і пісала на адрас яго бацькоў...

Віктар маўчаў. Сцеша перастала плакаць, глядзела на знямелага Віктара.

— Пакінеш? — ціха прашаптала яна і турзанула Віктара за руку.

Той нічога не адказаў. Але ў яго ўсярэдзіне зараз усё кіпела, думкі мітусліва роіліся, як пчаліны рой у гарачыню.

«Чаму ж яна мне не адкрылася яшчэ да вяселля? — цяжка думаў ён.— Тады б гэтую навіну можна

было лягчэй перанесці... А зараз насмяшу ўсіх сваіх хлопцаў... Ды і так цэлая вёска, відаць, смяецца з мяне, дурня, што чужых дзяцей гадую і не ведаю аб гэтым... Як тая курыца-квактуха, пад якую падклалі гусіныя ці качыныя яйкі...»

Ён стрымана паглядзеў на Сцешу, тая не вытрымала яго позірку, апусціла вочы ўніз, горача прашаптала:

— Значыць, пакінеш?

Ён не ведаў, што і гаварыць.

— А чаму мне ты раней не сказала аб гэтым? — ледзь-ледзь выдавіў з сябе Віктар.

— Баялася,— чыстасардэчна, як на судзе, прызналася Сцеша.

— Ах, Сцеша, Сцеша! — зусім спакойна ўжо загаварыў Віктар.— Я сам вырас, як людзі гавораць, пры дваюрадным бацьку — айчыму, дык усё разумею. А столькі часу мяне абманвала! І калі мне мой айчым стаў радней за роднага бацьку, я наогул паверыў, што для добрых людзей чужых дзяцей не бывае... А ты? Ты ўва мне сумнявалася?

Ён прыціснуў Сцешу да грудзей і шэптам яшчэ раз перапытаў:

— Сумнявалася, так?

— Не ведаю,— азвалася Сцеша.— Але ўтойвала ад цябе да пары да часу, каб усё ўляглося-зжылося, бо і мне ж хацелася мужчынскай ласкі,— заплакала яна.— А да мяне ж ужо адзін сватаўся, але калі даведаўся пра Інку... Як ветрам здзьмула! Як кажуць, і адраса не пакінуў...

— І адзін пашляк, і другі нягоднік,— асіплым голасам прагаварыў Віктар.— Я сам здагадваўся, але не хацеў цябе турбаваць гэтай гаворкай, бо ведаў — табе і так балюча...

— Даруй мне, Віця! — заплакала Сцеша.— І рабі,

як сам ведаеш: застанешся — буду любіць, а пакінеш — таксама брудным словам імя тваё не запэцкаю... Сама ва ўсім вінавата!

— Ну, канчай ты сябе валтузіць! Калі ў гэтыя мінуты твайго прызнання не нарадзілася ўва мне брыдота, не будзе яе і ў будучым...

— Віцёк! — абхапіла за шыю мужа Сцеша.— Я заўсёды спадзявалася на лепшае... На жаночае шчасце...

— Давай, во, перакусім ды падумаем, як лепш зрабіць, каб яшчэ і Інка не перанесла такую траўму душэўную, як ты... Яна не будзе ў нас якім абсеўкам прыдарожным!

Высока ў небе перасвістваліся нейкія вясёлыя птушкі, недзе ў канцы вёскі забрынчаў званок на шыі каровы ці каня, залапацеў на плоце крыллямі певень, зацягнуўшы немаведама з якой нагоды сярод белага дня сваё кукарэку.

Віктар са Сцешай снедалі над самай канавай, а Пелагея Сідараўна стаяла ў вішняку, трымаючы на руках Інку, і плакала.

— Ідзі, дзіцятка, да мамы з татам,— сказала яна і паставіла дзяўчынку на зямлю.

— А што, цяпель і ў мяне тата будзе, як у Малінкі? — прыціскалася шчочкай да бабульчынага пляча Інка.

— А як жа? Будзе, унучка, будзе! — пацалавала ў самую макаўку галоўкі ўнучку Пелагея Сідараўна.

— Уля! Цяпель мяне не будуць длязніць — «безбацькаўна»... І ў мяне цяпель ёсць татка Вікталь!

— Ёсць! Ёсць! — радавалася разам з унучкай бабуля.

— Мама! Мама! Хацу з табой у голяд! — закрычала Інка і панеслася ўпоперак пракосаў да Сцешы і Віктара.

Віктар на ляту падхапіў Інку, падкінуў сваімі дужымі рукамі над сваёй галавой, злавіў яе і пацалаваў у шчочку:

— Паедзем, дачанька, паедзем у горад! Усе разам паедзем.

Сцеша, як і маці, выцірала слёзы, плакала. Плакала ад радасці... Ад вялікай чалавечай радасці!

# Змест

«Пагарэльцы» . . . . . . . . . . . . . . 3
Латарэйны білет . . . . . . . . . . . . . 17
Аднойчы летам . . . . . . . . . . . . . 37
Знак памяці . . . . . . . . . . . . . . 55
Стрэл на світанні . . . . . . . . . . . 73
Парабак . . . . . . . . . . . . . . . . 84
Сенька-інвалід . . . . . . . . . . . . . 92
Першы «настаўнік» . . . . . . . . . . . 97
«Памагаты» . . . . . . . . . . . . . . 116
Бяздзетуха . . . . . . . . . . . . . . 124
Дамок пад клёнам . . . . . . . . . . . 133
Рукзак для сына . . . . . . . . . . . . 152
«Міннае» поле . . . . . . . . . . . . 161
Чужая дачка . . . . . . . . . . . . . 170

**Крываль С.**

К 85 Аднойчы летам: Апавяданні.— Мн.: Маст. літ., 1990.— 189 с.— (Першая кніга празаіка).

ISBN 5-340-00450-3.

Крываль С. Однажды летом: Рассказы.

Аўтар недарэмна даў першай сваёй кніжцы такую назву: у ёй амаль у кожным апавяданні ёсць інтрыгуючае слова — «аднойчы»... Добрае веданне пісьменнікам народнага побыту, уменне займальна расказаць пра ўбачанае ці пачутае — усё гэта належным чынам ацэніць чытач, які неабыякавы і да праблем высокай духоўнасці герояў, і да пытанняў нашага штодзённага жыцця.

К $\frac{4702120201-109}{М 302(03)-90}$ 36—90 **ББК 84Бел7**

*Литературно-художественное издание*

Крываль Степан Антонович

ОДНАЖДЫ ЛЕТОМ

Рассказы

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»
На белорусском языке

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Крываль Сцяпан Антонавіч

АДНОЙЧЫ ЛЕТАМ

Апавяданні

Рэдактар *А. П. Рыбак*. Мастак *Н. У. Кавалёва*. Мастацкі рэдактар *М. Я. Шкурпіт*. Тэхнічныя рэдактары *І. І. Дуброўская, Г. П. Тарасевіч*. Карэктар *Я. Ф. Харко*.

ІБ № 3244

Здадзена ў набор 25.08.89. Падп. да друку 06.04.90. АТ 00055. Фармат $70 \times 100^{1}/_{32}$. Папера друк. № 1. Гарнітура школьная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 7,80. Ум. фарб.-адб. 8,21. Ул.-выд. арк. 8,40. Тыраж 11 800 экз. Зак. 2896. Цана 55 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

55 к.



Сцяпан Крываль нарадзіўся ў 1935 годзе ў вёсцы Гутка Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Скончыў Крайскую сярэднюю школу, завочна вучыўся на факультэце журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна.

Працаваў у школе, пасля — у раённым друку, быў рэдактарам Брэсцкай студыі тэлебачання, карэспандэнтам абласнога радыё.

Зараз жыве ў горадзе Маларыце.

Друкаваўся ў часопісах «Полымя», «Маладосць», «Беларусь», іншых рэспубліканскіх выданнях, у калектыўным зборніку «Перасветы» (1979 г.) выступіў з падборкай літаратурных пародый «Пехатою — на Парнас».